2	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 11,2 кв.м, 6,7 кв.м, 13,6 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	275 630	27 563
3	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 10 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	87 500	8 750
4	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 24 кв.м, 6,1 кв.м, 5 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	307 130	30 713
5	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 6,5 кв.м, 5,1 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	101 500	10 150
6	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 25,2 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	220 500	22 050

Дата, время и место проведения аукциона: 06.05.2011 в 15.00, г. Витебск, пр-т Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 05.05.2011 г. до 17.30.

1	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 26,9 кв.м, 8,7 кв.м, 11,1 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	408 630	40 863
2	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 13,7 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	119 880	11 988
3	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 6,6 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	57 750	5 775
4	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 6,6 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	57 750	5 775
5	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 6,3 кв.м., расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	55 130	5 513
6	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 8,4 кв.м, расположенного на 3 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений, офиса	73 500	7 350
7	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 7,6 кв.м, 11,6 кв.м, расположенных на 3 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	Для осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений, офиса	168 000	16 800

Дата, время и место проведения аукциона: 10.05.2011 в 15.00, г. Витебск, пр-т Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 06.05.2011 г. до 17.30.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проспект Черняховского, 9 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

2. Для участия в аукционе в адрес организатора аукциона необходимо представить:

2.1. заявление на участие в аукционе, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведении аукциона;

2.2. копию платежного документа о внесении задатка, заверенную банком;

2.3. юридическому лицу – резиденту Республики Беларусь: копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2.4. юридическому лицу – нерезиденту Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2.5. индивидуальному предпринимателю: копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2.6. при заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; индивидуальным предпринимателем – документ, удостоверяющий личность.

3. Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наиболее высокую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается.

4. Продавец

усх. даўж. 26° 72".
паўн.шыр. 52° 20".

Кропка на планеце

ДЗЯТЛАВІЧЫ ПРАЧЫНАЮЦЦА РАНА

Позна кладуцца. Каб сустрэць і правесці яшчэ адзін напружаны, турботны і паранейшаму трывожны дзень. Каб засланіцца ад бяды, але дбаць пра хлеб надзённы і гадаваць дзяцей. Зноў рыхтавацца да сезону клубніц, узводзіць пад дахі новыя дамы і, як заўсёды, радавацца вясне. Нястомная вёска Палесся і адзін з самых вялікіх яго населеных пунктаў. Адночы тут пачаўся новы адлік часу. Часу «Ч». Мінула ўжо чвэрць стагоддзя пасля жудасных падзей вясны 1986-га, а жыццё Дзятлавічаў па-ранейшаму дзеліцца на «да» і «пасля» Чарнобыля. Да — гэта бесклапотнае і ўпэўненае жыццё, чыстыя лугі і лясы, адсутнасць страху за сябе і будучыню дзяцей. Пасля — забруджаныя прадукты харчавання, высокае накапленне радыяцыі ў арганізмах дарослых і маленькіх жыхароў, трывогі, палон страху. Ніхто дагэтуль не ведае, калі нарэшце знікне нябачная мяжа, калі адыдзе яна ў нябыт.

Праз 25 гадоў пасля нашага Чарнобыля падобная трагедыя паўтараецца на японскай «Фукусіме-1». Неўтаймаваны атамны рэактар атручвае жывую зямлю Краіны ўзыходзячага сонца. І там, як і ў нас, узнікае тая ж мяжа, якая дзеліць любое жыццё на «да» і «пасля». Працавітым і шматпакутным японцам, як і беларускім палешукам, ужо не дадзена выбару — акрамя таго, як вучыцца і жыць у новых абставінах, у рэжыме абмежавання, вывяраючы і грамадскія паводзіны, і кожны свой крок. Выводзячы новую формулу жыцця. Бяда, якая прыйшла ад «Фукусімы», і бяда Чарнобыльская нібы з'яднала, зрабіла падобнымі два розныя народы, гарады і вёскі розных краін. Беларусы ўжо прайшлі невялікую частку пакутнага шляху і ў нечым маглі б стаць прыкладам. У жыхароў супрацьлеглага боку планеты яна толькі пачынаецца.

У Дзятлавічах адкрыты два пункты праверкі малака, ягад і грыбоў, сена, гародніны, мёду, і гэта, несумненна, дазваляе пазбегнуць апраменьвання малымі дозамі радыяцыі. Штогод дзесяці выязджаюць на аздараўленне ў іншыя рэгіёны і нават у далёкае замежжа. Некаторыя з іх, ведаю, аздараўляліся летась у прыгожым цэнтры ў Ніжняй Саксоніі, што ў Германіі. Пазнейшы радыяцыйны кантроль паказаў, што за час адпачынку ўзровень накаплення радыяцыі ў дзятлавіцкіх школьнікаў знізіўся больш чым удвая. Па-ранейшаму ўздзеянне апрамененай зямлі перадаецца яе жыхарам, бо ў вясковым ладзе жыцця яго цяжка пазбегнуць. І таму неабходнасць аздараўлення вясковага насельніцтва і надалей будзе заставацца першачарговай, актуальнай. Ці магчыма жыць, кантралюючы кожны глыток малака, вады, паветра, выяўраючы кожны свой крок? Ці варта ўвесь час на некага спадзявацца і чакаць аднекуль дапамогі? У Дзятлавічах штодня шукаюць сваю формулу існавання, вучацца, спрабуюць і ўсё ж ідуць наперад.

На пачатку вясны мне давялося некалькі гадзін правесці ў гэтай ці не самай шматдзетнай вёсцы Лунінецкага раёна. Жыццё ў ёй ішло, як і паўсюль. Дзень пачынаўся з кубачка малака. А гаспадарскія, бацькоўскія, ды і процьма іншых клопатаў, не заканчваліся ажно да змяркання. Рытм жыцця настройваў вяскоўцаў на пазітыўны лад, і толькі навіны пра катастрофу на «Фукусіме-1» міжволі нагадвалі пра нябачную дагэтуль небяспеку. Але дваццаць пятая паслячарнобыльская вясна не чакала асабістага запрашэння. Яна ўжо крочыць па старых і новы вясковых вуліцах. І ёй аднолькава рады ўсе. І ў сям'і Швед, дзе гадуюцца два сыны Дзяніс і Вадзім, і ў гаспадарцы Мікалая Яскевіча (дарэчы, нашага падпісчыка), і на галоўнай вуліцы, дзе шматлюдна і заўсёды спыняецца хлебная аўтакрама (на фотаздымках).

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Лунінецкі раён.

Блізкая ўлада

Выхаваць дзяцей так, каб яны разумелі: дабрабыт ствараецца працай

На рэспубліканскі дзень інфармавання, прысвечаны Году прадпрымальнасці і дзелавой ініцыятывы, першы намеснік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення адукацыі Аляксандр ЖУК завітаў у Жабінкаўскі ліцэй. І хоць спачатку Аляксандр Фёдаравіч выступіў перад настаўнікамі з невялікай лекцыяй па азначанай тэме, найбольш часу ўдзельнікі сустрэчы гаварылі аб надзённых сваіх педагагічных праблемах.

Для самага маленькага райцэнтра краіны, у якім працуюць тры школы, ліцэй — адметная навучальная ўстанова. Створаны ў 2006 годзе, ліцэй сёння можа пахваліцца найвышэйшым балам паспяховасці ў раёне. Як паведаміў **дырэктар Аляксандр ПАПЯШЧУК,** больш за 80% яго выпускнікоў адразу паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Відавочна, што сюды прыходзяць лепшыя вучні Жабінкі. Тут жа сабраны і высокакваліфікаваныя педагогі. За невялікую гісторыю ліцэя цягам у адну пяцігодку ў яго сценах падрыхтаваны цэлы шэраг пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд — такіх, як Вольга Сідорка, Андрэй Іванюк, Арцём Серада, Кацярына Клачко і іншыя.

Але і ў гэтым калектыве штодня паўстаюць такія ж праблемы, як і ў іншай школе. Напрыклад, як правільна папрасіць грошы ў бацькоў на патрэбы навучальнай установы? Вядома, што ніводная гарадская школа сёння не абыходзіцца без пасільных унёскаў бацькоў вучняў. Грошы ідуць, як правіла, на рамонт, добраўпарадкаванне памяшкання. Але вельмі важна пры гэтым захаваць максімальныя такт і карэктнасць. «І, — як заўважыў Аляксандр Жук, — не забыцца падзякаваць бацькам за дапамогу. А калі кожная сям'я, што здавала грошы, атрымае ліст за подпісам дырэктара школы з падзякай і сціслай справаздачай аб патрачаных сродках, будзе вельмі добра».

Не абышлі суразмоўцы і пытанні рэпетытарства. Як высветлілася, асноўная частка вучняў установы да рэпетытараў не ходзіць. Але некаторыя бацькі ўсё ж лічаць неабходным перастрахавацца і «падцягнуць» дзіця да тэстаў і экзаменаў. Гэта іх права. А вось абавязак тых, хто падобныя паслугі аказвае, афарміць сваю працу належным чынам, заплаціць вызначаны падатак і пачуваць сябе законапаслухмяным грамадзянінам краіны. Варта адзначыць, што ў ліцэі праводзіцца дастаткова дадатковых платных заняткаў. А гэта ўжо спосаб не толькі пашырыць і паглыбіць веды выхаванцаў, але і зарабіць капейку для ўстановы.

Такога роду прадпрымальнасць і ініцыятыва, як вядома, у дзяржаве заахвочваюцца. Яшчэ ліцэісты, як і іх таварышы з суседніх школ, зарабляюць грошы зборам макулатуры і металалому. Летась, дарэчы, жабінкаўскія школьнікі нават перавыканалі план па здачы металічнага лому на 17 тон. Сёлета райвыканкам ім заданне значна паменшыў. Яно і зразумела: збіраць лом металу трэба пад пільным доглядам дарослых — гэта звязана з небяспекай. Таму лепш збіраць бяскрыўдную макулатуру, якая знойдзецца ў кожнай сям'і.

Прыводзіліся цікавыя прыклады школьнай ініцыятывы. Так, у адной са школ Пінскага раёна, якую цудам не закрылі і дзе засталося 18 вучняў, усе дзеці іграюць у лялечным тэатры. Лялькі яны пашылі свайго рукамі. Выступаюць у навакольных садках, школах, клубах. І калі ў дзіцячых калектывах малыя лялечнікі даюць прадстаўленне бясплатна, то ў дарослых распаўсюджваюць квіткі за сімвалічны кошт. І, вядома, асабліва смачныя бываюць цукеркі, зароблены сумленнай мастацкай творчасцю. Акрамя таго, тэатральны гурток — добрая школа выхавання. Ёсць цікавы досвед работы школьнай майстэрні школы № 2 Маларыты. Там дзеці падчас канікул шыюць рабочае адзенне і зарабляюць грошы для сябе і школы.

Гаварылі настаўнікі з удзельнікамі інфармацыйнай групы не толькі пра ініцыятыву і прадпрымальнасць школы на шляху падтрымання яе матэрыяльнага ўзроўню, але найперш пра выхаванне маладых ініцыятыўных грамадзян. **Намеснік старшыні Жабінкаўскага райвыканкама Галіна СЦЕПАНЧУК** расказала, што ў раёне актыўна развіваецца малое прадпрымальніцтва і прыватны бізнэс. Так, паступленні ў бюджэт раёна ад малога прадпрымальніцтва склалі ў 2009 годзе 10,5%, а ў 2010 годзе ўжо 11,1% і выраслі на 3,3 мільярда рублёў. Летась у гэтай сферы было створана 249 новых рабочых месцаў, што складае 63,4% ад усіх створаных за год у раёне. І вельмі важна выхаваць маладое пакаленне так, каб у юнакоў і дзяўчат было жаданне працягваць гэту работу, праяўляць ініцыятыву, ствараць свае адметныя прадпрыемствы і вытворчасці. І яшчэ ўсе суразмоўцы былі аднадушны ў тым, што школа павінна закладваць у юныя душы разуменне: дабрабыт з неба не падае, а здабываецца карпатлівай штодзённай працай, заснаванай на ўласнай адукаванасці, настойлівасці, ініцыятыве.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Жабінкаўскі раён.

КАБ НЕ ТРАПІЦЬ ПАД КАНЯ

Супрацоўнікі Магілёўскай ДАІ вобласці наведалі ўладальнікаў хуткасных матацыклаў і нагадалі байкерам аб правілах бяспекі на дарогах.

Выявілася, што толькі ў Магілёве жыве 60 прыхільнікаў хуткасных матацыклаў, і інспектары наведалі іх. З парога — лекцыя аб бяспечных паводзінах на дарозе і ўручэнне памятак. Байкеры нават не адмовіліся пісьмова пацвердзіць сваю гатоўнасць прытрымлівацца хуткаснага рэжыму і правілаў дарожнага руху ўвогуле. Супрацоўнікі ДАІ параілі матацыклістам быць уважлівымі і пажадалі ўдачы на дарогах.

Дарэчы, нядаўна на дарозе Слаўгарад—Краснаполле непадалёк ад вёскі Сідараўка адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, якое, як у Ільфа і Пятрова ў «Дванаццаці крэслах», падпадае пад загаловак «Трапіў пад каня». Толькі там чалавек Астап Бендэр сутыкнуўся з фурманкай, а ў наш час у фурманку ўехаў матацыкл «Самурай». Матацыкліст пайшоў на абгон, але з кіраваннем не справіўся. Кіроўца атрымаў траўму, возчык не пацярпеў, а жывёла, як водзіцца, абышлася лёгкім перапудам.

Ілона ІВАНОВА.

ГРОШЫ ВЯРНУЛА

Калі жыхарка в. Аздамічы (Столінскі раён) працавала загадчыцай крамы ў Альшанах (сёння беспрацоўная), то склала фіктыўныя таварна-транспартныя накладныя на перадачу матэрыяльных каштоўнасцяў. Зроблена гэта было, каб схаваць растраты ў суме 11 млн 253 тысячы рублёў.

З дапамогай міліцыі былая загадчыца грошы вярнула.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Радавод

ПОШТА Ў СПАДЧЫНУ

Першымі цацкамі Васіля ГРАБСКАГА сталі пустыя паштовыя скрынкі, бо маці працавала ў вясковым паштовым аддзяленні. Яго дачка Таццяна, здаралася, засынала на мяхах пад прылаўкам пошты. А цяпер яго ўнучка Кіра, якой няма яшчэ і трох гадоў, упэўненым ударам прадстаўніцы вядомай паштовай дынастыі штампуе ў маці на працы канверты.

Усяго тры запісы ў працоўнай кніжцы

Нездарма Грабскія гавораць, што пошта для іх — гэта ўсё: і хлеб, і заробак, і мэта ўсіх памкненняў. **Агульны працоўны стаж паштовай дынастыі гэтай сям'і налічвае 130 гадоў.**

Яна вядзе сваю гісторыю ад 1876 года, калі на Крычаўшчыне нарадзіўся Васіль Грабскі, які працаваў на пошце яшчэ да рэвалюцыі і пасля яе.

Увогуле Грабскія — вядомы мясцовы сялянскі род, але Васіль сельскую гаспадарку змяніў на паштовую службу. Ён служыў кур'ерам і дастаўляў тэлеграмы. З'язджаў на заробкі ў Данецкую вобласць, але любімай справе не здрадзіваў.

— Сям'я была 8 душ, якіх трэба было карміць, — тлумачыць сёння дзедаву біяграфію яго поўны цёзка, 51-гадовы Васіль Аляксеевіч Грабскі.

Паштовую дынастыю працягнуў малодшы сын Грабскага — Аляксей. Яго школьную адукацыю перарвала вайна, і пасля вызвалення Крычава малады чалавек пайшоў на фронт, атрымаў раненне, быў узнагароджаны.

— У 1945 годзе бацька пайшоў працаваць фельд'егерам пункту спецыяльнай сувязі Крычаўскай паштовай станцыі, і адпрацаваў там 45 гадоў, — расказвае яго сын Васіль. — У мяне захоўваецца яго працоўная кніжка як сямейная рэліквія, і там усяго тры запісы, па сутнасці: прыняты на працу, прызначаны начальнікам пункту спецсувязі, звольнены ў сувязі з пенсіяй.

Прытрымлівацца паштовай сямейнай традыцыі Аляксею настойліва падказаў бацька, бо пасля вайны аплатнай працы на вёсцы не было. Хутка адбылося ў Сакольнічах і паштовае вяселле: жонкай Аляксея стала загадчыца мясцовага паштовага аддзялення.

Працаваць сумленна і дабраякасна

У архівах пошты захавалася асабістая справа № 317 Ніны Сяргееўны Грабскай, цікавы для нашчадкаў дакумент савецкага часу. Строгі твар на маленькім чорна-белым фотаздымку, напружанасць у поглядзе, сукенка ў дробныя кветачкі. І самыя падрабязныя звесткі: бацькі працавалі да рэвалюцыі ў сельскай гаспадарцы, пры саветах сталі саматужнікамі і заняліся ганчарствам.

Сама Ніна была сціплым чалавекам: беспартыйная, не бывала ў замежжы, не брала ўдзел у рэвалюцыйным і партызанскім рухах, не служыла ў войсках і ўстановах белых урадаў, ды цвёрдым «не» адказвала на пытанне «аб хістанні у правядзенні лініі партыі і ўдзеле ў апазіцыях».

Калі ў 1952 годзе Ніна прасілася на працу ў кантору сувязі, яна ў сваёй заяве, напісанай вострым дробным почыркам, абавязалася «працаваць сумленна і якасна». Да гэтага дакумента дадаецца падпіска «ў адпаведнасці з артыкулам 131-м Сталінскай Канстытуцыі зберагаць дзяржаўную ўласнасць і даверэныя органам сувязі каштоўнасці», а таксама «ўсімі сіламі выяўляць рэвалюцыйную пільнасць і строга захоўваць даверэную па службе дзяржаўную тайну».

Да высокіх слоў, дарэчы, ёсць таксама і больш прыземлены дакумент: два паручыцельствы, ад мужа і ад жанчыны-калегі, якія бяруць абавязацельствы за два тыдні кампенсаваць урон, што можа быць нанесены Нінай Грабскай.

У вытворчай характарыстыцы начальніцы паштовага аддзялення ў Сакольнічах знаходзяцца і параллелі з сучаснасцю: план росту даходаў і ў 1950-х гадах, і цяпер таксама з'яўляецца вельмі актуальным. Так, у 1955 годзе даходы сельскай пошты павялічыліся на 5%, а ў першым месяцы наступнага 1956 года — ужо больш чым на 10%.

1 красавіка Магілёўскі філіял РУП «Белпошта» адзначыць 15-годдзе з дня рэарганізацыі, калі на базе Магілёўскага абласнога вытворча-тэхнічнага ўпраўлення сувязі і інфарматыкі былі створаны два асобныя прадпрыемствы — электрычнай і паштовай сувязі.

У паштовай сувязі Магілёўскай вобласці захоўваюцца працоўныя дынастыі, агульны стаж якіх складае ад 180 гадоў. Адна з іх — вядомая крычаўская дынастыя Грабскіх.

«Пальцам пханую» каўбасу па пошце

Пакуль жанчына змагалася за даходы даверанага ёй аддзялення, тут гадаваліся дзеці, а потым і ўнукі. Матчына праца падавалася Васілю самай цікавай, і ён не стамляўся ездзіць на пошту на веласіпедзе. Таму невыпадкова, калі пасля службы ў арміі малады чалавек, паводле слушнай парады сям'і, заняў вакантную пасаду фельд'егера, а потым і змяніў бацьку на пасадзе кіраўніка пункту спецсувязі.

— Ну, гэта ж усё сакрэтна, — не жадае і цяпер дзяліцца працоўнымі гісторыямі Грабскі. — Насіў сакрэтную пошту ў КДБ, райвыканкам, ваенкамат. Вазілі каштоўнасці па ювелірных крамах. Мы заўсёды былі ўзброеныя, але на мяне ніводнага разу злачынцы не спакушаліся. А так праца адказная — трэба памятаць, што і куды за дзень даставіў. І ставіцца да такой працы трэба з душой.

Жонка Васіля Аляксеевіча — таксама патомная сувязістка. Алена Васільеўна працавала тэлефаністкай, таму дачка Грабскіх, Таццяна, перыядычна засынала то на тэлефоннай станцыі, то ў бабулі на пошце, то ў бацькі на спецсувязі. Таму ўгаворам дзеда пайсці працаваць на пошту зусім не супраціўлялася і адразу вырашыла паступаць у каледж сувязі.

— Я за дачку спакойны, — гаворыць Васіль Аляксеевіч. — Гэта добрая праца, і будучае ў пошты нармальнае. **Пошта была і пры цары-гасудары, будзе і пры кам'ютарах.** Я і сам лісты часам пішу, і пасылкі дачцэ ў Расію адпраўляю. Крычаўскую каўбасу «пальцам пханую» па электроннай пошце не адправіш, толькі звычайнай! Так што ў нашай справы ёсць будучае!

З пошты не пайду, бо яна падабаецца

Будучае — гэта, несумненна, дачка Васіля Аляксеевіча Таццяна і ўнучка Кіра, якія атрымалі ў спадчыну паштовыя гены Грабскіх.

— Я марыла аб працы на пошце з дзяцінства!

Таццяна, маладая жанчына з прыемнай усмешкай і вялікімі яснымі вачыма, магла б, напэўна, і ў Нью-Ёрку супермадэллю стаць, аднак абрала для сябе самую празмелую сямейную справу.

Яна прыйшла на пошту ў 19 гадоў: рабіла сартаванне пошты, была паштальёнам, потым стала аператарам сувязі і начальнікам участка.

Цяпер, пасля нараджэння дачкі, Таццяна працуе на ўчастку абмену ў Крычаўскім аддзяленні паштовай сувязі. У модных чорных шортах і ў світары з «іскрынкай» яна спрытна спраўляецца з мяхамі пошты на канвеерах, а потым рыхтуе да адпраўкі экспрэс-карэспандэнцыю.

— У мяне ненармаваны працоўны дзень, — тлумачыць жанчына і не выпускае з рук аловак і паперы. — Сёння раблю ад паловы на пятую раніцы. Працы шмат: у нас транзітны ўчастак, абслугоўваем пяць сельскіх раёнаў, трэба ўсё паспець. Можа, у мяне і не самы зручны графік для маладой маці, але гэта мая праца, і я яе люблю. Мне пошта вельмі падабаецца: і пошта ўвогуле, і мая праца на ёй.

Грабская не хавае, што працоўная дынастыя, якую пачынаў не прапрадзед, шмат значыць для яе асабіста. «Гэта гучыць і выклікае ў мяне пачуццё гордасці!» Тым больш што ўсе паштавікі Грабскія пачыналі звычайна ад самага нізу, падымаліся і атрымлівалі адказныя пасады, і ніхто не кідаў сваёй любімай працы да пенсіі.

— З пошты нікуды не пайду! — абяцае цяпер і Таццяна.

Цярплівасць, ветлівасць, дысцыплінаванасць

Цяпер ужо да Таццяны на працу прыходзіць, вельмі верагодна, яшчэ адна будучая працаўніца пошты. Кіра атрымала імя ў адпаведнасці з сучаснай серыяльнай модай, але, відаць, не будзе грэбаваць даўнімі сямейнымі традыцыямі. Ва ўсякім разе, усмешлівая малая, у кампаніі з любімым цацачным шэрым катом, вельмі спрытна ставіць паштовыя штэмпелі на розныя пакуль яшчэ не вельмі патрэбныя паперы.

— Ёй падабаецца штампаваць! — шчыра радуецца маці. — Дапамагае мне ўжо нешта падаць, прынесці. Часопісы спрабавала раскладваць. Так што расце прадаўжальніца нашай дынастыі!

Пакуль навокал спрачаюцца пра існаванне ў тэхнагенным будучым такіх відаў сувязі, як традыцыйная пошта, сама Таццяна піша сябрам лісты ад рукі, адпраўляе прыгожыя паштоўкі ў стыльных канвертах. «Таму што старое, яно нібыта цёплае, роднае і прыемнае, і заўсёды вяртаецца!»

— Наша пошта развіваецца і з кожным днём прапаноўвае людзям усё больш розных вельмі карысных паслуг, — ад эмоцый пераходжу да бізнэс-планаў свайго прадпрыемства Грабская. — Калі я толькі прыйшла працаваць, іх было нашмат менш, а цяпер вялікі спектр — ад абслугоўвання банкаў да значнага асартыменту тавараў на продаж.

Самае галоўнае, лічыць Таццяна, — гэта быць ветлівымі і ніколі не крыўдзіць кліентаў, як бы ні было складана. «Каб кожнаму чалавеку было прыемна прыйсці на пошту — тады і ў нас будзе заробак!»

Васіль Аляксеевіч Грабскі і яго дачка лічаць, што і ў даўнія часіны, калі пачыналася іх дынастыя, і цяпер таксама, добраму паштоваму супрацоўніку патрэбны цярплівасць, руплівасць і ветлівасць, а таксама не пашкодзіць і добрая фізічная форма. А дысцыплінаванасць — дык гэта абавязковая рыса!

— Трэба быць адказнымі людзьмі, спадзявацца адно на аднаго і паважаць адно аднаго, каб усе разумелі: калі добра працаваць і не падводзіць людзей, то заўтра абавязкова будзе, хоць трошачку, але ўсё ж лепш!

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Крычаўскі раён.

МАЛАКА МНОГА НЕ БЫВАЕ

У Лунінецкім раёне адмаўляюцца ад паслуг малаказборшчыкаў, і цяпер нарыхтоўкай малака ў прыватным сектары займаюцца прадпрымальнікі. На сёння іх у раёне 16 чалавек.

На Лунінеччыне насельніцтва малако здае, і сёлета колькасць яго ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася больш чым на 26 працэнтаў. Прырост істотны. У раёне ёсць і свае рэкардсмены па продажы. Напрыклад, Уладзімір Кісель з Вулькаўскага сельсавета ад сваіх 4 кароў здаў 19 265 кг малака.

Але такіх гаспадароў усё ж адзінкі, а ў цэлым па сельсавеце прыватны статак з года ў год памяншаецца. Калі ў 2009 годзе налічвалася 580 кароў, то летась — толькі 470, а на сёння іх засталося 368 на 1500 двароў.

А вось у Лахвенскім сельсавеце сітуацыя больш радасная. **Старшыня сельскага Савета Людміла ПАШКЕВІЧ** расказала:

— Па продажы малака дзяржаве нашы людзі самыя актыўныя ў раёне. Што датычыцца колькасці прыватных кароў на тэрыторыі сельсавета, то не ўсе гаспадары іх уносяць у спісы, і ў наяўнасці кароў можа нават быць больш, чым праходзіць па паперах.

— Людміла Аляксандраўна, прадпрымальнікі замянілі малаказборшчыкаў, і што з гэтага?

— Зборшчыкі працавалі аморфна. Збіралі малако, і яго якасць іх не цікавіла. Прыватныя прадпрымальнікі паводзяць сябе інакш, бо ад якасці малака залежыць іх зарплата. У іх ёсць прыборы і прэпараты, якімі якасць можна кантраляваць.

— Сярод здатчыкаў малака ў вас ёсць «стаханаўцы»?

— Вольга Лушчык прадала 17 410 кг малака, а для пенсіянеркі — гэта шмат. Больш чым яна на тэрыторыі сельсавета ніхто не здаў, ды і па раёне яна другая.

Даўно прыкмеціў, што людзі, якія здольны столькі прадаць малака, апантаныя. І тут не важна, што іх падштурхоўвае да гэтага, — жаданне дапамагчы дзецям ці прага грошай. Чалавек працуе — і гэтым сказана ўсё.

У размове з Вольгай Лушчык даведаўся, што ў яе пяць дойных кароў і тры цялушкі. Мнагавата на адну душу.

— Вольга Сцяпанаўна, як вам удаецца ўтрымліваць 8 кароў?

— Цяжка, але я жыву наводшыбе і без жывёлы не магу. Бывае, паразмаўляеш з кароўкамі — і на душы лягчэй. А пры хаце яшчэ чатыры сабакі.

— З кароваміусё ясна, але навошта столькі сабак?

— А сабакі што людзі, толькі не могуць сказаць. Мне ісці да чыгункі 10 кіламетраў, а каля адной вёскі сабака тры дні на адным месцы сядзеў. Аказалася, вартуе шапку і валізку гаспадара, які, відаць, напіўся і забыўся пра сабаку, а той так і застаўся пры шапцы свайго гаспадара... Казалі, што і сканаў там... Жывёла таксама розум мае.

— З адной кароўкай праблем хапае, а як пракарміць восем? На зіму сена шмат трэба...

— Малако здаю і купляю сена. А калі карова ацеліцца, то і за цяля сянаж даюць. Вось такім чынам і выкручваюся.

— Кароў трэба падаіць, гной з хлява выкінуць, яшчэ і агарод ёсць... Дзеці дапамагаюць?

— Дзеці прыязджаюць, але яны хочуць, каб я кароў здала, бо бачаць, як цяжка даводзіцца.

— Але малака многа прадалі ў мінулым годзе.

— Многа, але ўсё залежыць ад тлустасці, а ў мяне цэлую тону зрэзалі, толькі хіба дакажаш...

— Трымаць кароў будзеце ці дзяцей паслухаеце?

— Пакуль яшчэ сіла ёсць, то не здам. Без кароў і жыцця не будзе — жыву імі.

ААТ «Лунінецкі малочны завод» зацікаўлены, каб насельніцтва здавала малака як мага больш. Лепшым здатчыкам і зборшчыкам малака прадпрыемства ўручае грашовыя прэміі і падарункі — наборы сваёй прадукцыі. Акрамя гэтага, завод летась выдзеліў 100 мільёнаў на пакупку прыбораў, прэпаратаў і іншых матэрыялаў, а яшчэ 60 мільёнаў — для падтрымкі прадпрымальнікаў, якія займаюцца нарыхтоўкай малака.

Сярод фермераў вызначылася Валянціна Ліпская, яе гаспадарка здала больш за 34 тоны малака.

Сітуацыя з прыватным статкам у раёне неадназначная, бо калі, з аднаго боку, колькасць кароў знікаецца, то з другога — ёсць зацікаўленасць да іх набыцця. Але дзе тую карову купіць? Сельгаскааператывы не прадаюць, бо хочуць павялічыць свой статак. Застаецца толькі чакаць, калі нейкі гаспадар на вёсцы надумае збыць сваю рагулю.

Праблема ёсць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Добрыя весткі

ПАЛЁТ У «КОСМАС» НАРМАЛЬНЫ

У Магілёве адкрылася абноўленая зала ў кінатэатры «Космас», якому без малага паўстагоддзя.

Маштабны рамонт доўжыўся больш за год. Свой выгляд змяніла фае, а ў зале для гледачоў усталявалі сістэму «Dolby Digital», 132 новыя ўтульныя крэслы і сучаснае святло. Запрошаныя ветэраны, якія працавалі ў «Космасе» ад яго адкрыцця, шчыра казалі, што ніколі ў жыцці не бачылі падобнага.

Увогуле ў кінатэатры дзве залы, і ў будучым, калі з'явіцца грошы, тут мяркуюць зрабіць рамонт і ў другой. Тады ў «Космасе» з'явіцца спецыяльныя сямейныя праграмы: бацькі будуць глядзець фільм у адной зале, а дзеці — у іншай, на свой узрост.

Хоць новая глядзельная зала і адкрылася найноўшым анімацыйным фільмам «Ранга», усё ж на самой урачыстай цырымоніі паказалі ўрывак з французскай стужкі 1958 года з Жанам Габэнам «Адрынутыя» паводле рамана Віктора Гюго. Менавіта ёй адкрыўся «Космас» у 1963 годзе, і цяперашнія магілёўцы адразу далі заяўку вярнуць «Адрынутых» на вялікі экран.

Ілона ІВАНОВА.

СПАЧАТКУ ПРЫНЦЫПОВАЯ ЗГОДА, ПОТЫМ — ДЭТАЛЁВАЕ АБСЛЕДАВАННЕ ДОМА

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

СВЯТЛАНА Уладзіміраўна Кароткая пражывае ў сталіцы па вуліцы Бялінскага ў доме 1961 года пабудовы. Гэта пяціпавярхоўка, так званая «хрушчоўка». Звярнуцца ў рэдакцыю яе прымусілі наступныя абставіны.

— Быццам бы сабраліся зрабіць у нашым доме мансарду. З гэтай нагоды ў канцы мінулага года распаўсюдзілі сярод жыхароў апытальны ліст: згодныя мы на такое будаўніцтва ці не. Было ўказана, што калі 50 працэнтаў насельнікаў нашага дома падтрымаюць гэтую ідэю, тады надбудову будуць рабіць. Апытальны ліст быў складзены даволі спакойна. Праўда, прыкладна ў той жа час мы накіравалі ў адміністрацыю свайго раёна калектыўнае пісьмо ад нас, жыхароў, дзе задавалі шэраг пытанняў, у прыватнасці, наконт правядзення капітальнага рамонту дома. Адказу дагэтуль не атрымалі, — расказвала нам Святлана Уладзіміраўна. — А нядаўна гісторыя атрымала працяг: мы паўторна атрымалі апытальны ліст, але ўжо ў больш ультыматыўнай форме. У прыватнасці, было сказана, што ён з'яўляецца падставай для заключэння пагаднення на будаўніцтва мансарды. І ў выпадку не прадастаўлення запоўненага ліста будзе лічыцца, што жылец выказваецца за ўзвядзенне мансарды. А калі я проста не атрымала яго, не заўважыла сярод іншай пошты, ці мяне нейкі час не было дома? А атрымаецца, што я выказалася станоўча? Нават калі дапусціць, што большасць згодная з будаўніцтвам, чаму не праводзілася патрэбная экспертыза: ці магчымыя ўвогуле такія работы? Мяне гэта асабліва цікавіць, паколькі я жыву якраз на пятым паверсе. Як мне потым жыць два-тры гады запар? Ці будзе праводзіцца адсяленне жыльцоў?..

— Калі жыхары дома звярнуліся да вас у газету, а яны яшчэ і да мяне звярталіся, гэта гаворыць пра тое, што папершае, апытальныя лісты яны атрымалі, а па-другое, у іх прынцыповая, актыўная пазіцыя. І гэта добра. Таму што падчас правядзення першага апытання не ўсе жыхары дома вярнулі тыя лісты і нам было даручана правесці яго паўторна. Прыпіска тая была зробленая, каб падштурхнуць ініцыятыву людзей, каб яны запоўнілі і адправілі апытальны ліст, — распавёў у адказ на нашы пытанні **дырэктар ЖЭС-65 Віктар ДАНІЛОВІЧ**. — Вынікі яго павінны быць падведзеныя да 1 красавіка. І калі жыхарамі дома будзе прынятае прынцыповае рашэнне будаваць мансарду (50 працэнтаў «за» плюс адзін голас), тады і будзе праведзена патрэбнае абследаванне дома: можна рабіць надбудову ці не. У іншых умовах няма сэнсу ўкладваць сродкі ў правядзенне такой экспертызы, калі насельнікі не патрымаюць будаўніцтва.

Як патлумачыў далей Віктар Леанідавіч, гэты дом уключаны ў дзяржпраграму забудовы жылля мансардамі. Калі жыльцы пагодзяцца на яе ўзвядзенне, работы будуць праводзіцца, хутчэй за ўсё, без адсялення. Гэта, праўда, папярэдняя інфармацыя, зыходзячы з вопыту будаўніцтва мансардаў на двух іншых дамах. Забудоўшчык будзе аплачваць насельнікам камунальныя паслугі на час узвядзення, плюс закладзены рамонт пад'езду (дом уцеплены ўжо зараз). Усе жыхары дома будуць мець першачарговае права на набыццё атрыманай шляхам будаўніцтва мансарды дадатковай плошчы, праўда, варта нагадаць, што прадавацца яна будзе па камерцыйнай цане. Што датычыцца таго, што заяўнікі быццам бы не атрымалі адказу на свой калектыўны зварот, дырэктар ЖЭСа адказаў коратка: такога проста не можа быць. Але, паколькі ліст быў калектыўным, адказ павінен быў прыйсці на адрас першага ў спісе падпісанта, які, у сваю чаргу павінен быў давесці атрыманую інфармацыю да іншых суседзяў па доме.

Гэта нам пацвердзілі і ў **аддзелах па зваротах грамадзян ЖРЭА і адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска**. У першым выпадку зазначылі, што з 24.12.2010 г. у адрас жыхароў дома было накіравана чатыры адказы (апошні яны павінны атрымаць днямі). І пытанне дагэтуль знаходзіцца на кантролі. У другім выпадку таксама сказалі, што на калектыўны зварот ад канца снежня мінулага года адказ быў накіраваны на адрас першага падпісанта 12 студзеня бягучага года. У пачатку лютага быў яшчэ адзін адказ з адміністрацыі раёна на той жа адрас і прозвішча... У прыватнасці, жыхарам паведамлялася, што іх дом уключаны ў праграму капітальнага рамонту жылля, дзе магчыма будаўніцтва мансардаў, да 2015 года. Калі больш канкрэтна, капрамонт гэтай канкрэтнай «хрушчоўкі» запланаваны на 2014 год.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАЛІ ЎЛАСНІК НЕ СУПРАЦЬ

Кватэрнае пытанне

Нас з жонкай угаворваюць пераехаць у аграгарадок, абяцаюць там працу і дом... Як яго можна будзе прыватызаваць? Ці распаўсюджваецца на жылыя памяшканні сельгасарганізацый Закон аб прыватызацыі жыллёвага фонду?

Л.Р., *г. Орша.*

Артыкулам 7 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» вызначана, што перадача ва ўласнасць грамадзян жылых памяшканняў у дамах калгасаў або іншых вытворчых ці спажывецкіх кааператываў ажыццяўляецца згодна з рашэннем вышэйшага органа кіравання калгаса або кааператыва.

У пункце 11 пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» гаворыцца, што наймальнікі жылых памяшканняў у дамах калгасаў і іншых прадпрыемстваў і арганізацый, заснаваных на калектыўных формах уласнасці, маюць права прыватызаваць жылыя памяшканні, якія займаюць, пры згодзе ўласніка і на ўмовах, што вызначае ўласнік.

Такім чынам, умовы і парадак перадачы ва ўласнасць наймальнікам жылых памяшканняў у дамах, якія належаць сельскагаспадарчым вытворчым кааператывам, вызначае сход членаў кааператыва, які з'яўляецца вышэйшым органам кіравання кааператыва.

Пры вызначэнні гэтых умоў перадачы (продажу) кватэр, што належаць кааператыву, члены кааператыва могуць улічваць, напрыклад, стаж працы ў названым кааператыве, асабісты ўклад і г.д., могуць вызначыць ільготныя падставы для перадачы (продажу) кватэр, у тым ліку і перадачу бязвыплатна або з частковай аплатай яе кошту.

Сход таксама можа вызначыць, што перадача (продаж) вышэйназваных кватэр ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Законам Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь» для прыватызацыі дзяржаўнага жыллёвага фонду. Пры гэтым, як вынікае з тлумачэння Мінжылкамгаса, сельскагаспадарчым вытворчым кааператывам не кампенсуецца кошт чэкаў «Жыллё» ў выпадку, калі кааператыў прыме рашэнне аб іх заліку ў лік пагашэння кошту жылых памяшканняў, якія перадаюцца.

Сход членаў кааператыва таксама ўстанаўлівае і парадак вызначэння кошту жылых памяшканняў пры іх перадачы (продажы) членам кааператыва. Так, напрыклад, можа быць выкарыстана методыка вызначэння кошту, якая прымяняецца пры прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду або ацэнка па рынкавым кошце. Зрабіць ацэнку гэтых жылых памяшканняў па заяўцы СВК могуць таксама тэрытарыяльныя органы дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, права на яе і здзелак з ёй.

Прыняты рашэннем сходу членаў кааператыва парадак перадачы (продажу) кватэр ва ўласнасць членам кааператыва можа быць адлюстраваны ў статуце СВК і абавязкова ў пратаколе сходу.

Віктар САВІЦКІ.

РУПЛІВЫЯ ПАШТАЛЬЁНЫ

Ардэнаносец з вёскі павялічвае тыраж «Звязды»

Шчыра здзівіўся, калі начальнік Верхнядзвінскага раённага вузла паштовай сувязі Алена Міхайлаўна КАВАЛЕЎСКАЯ сказала, што руплівы пашталён, якому «Звязда» вырашыла падзякаваць за добрую работу па падпісцы падарункам (прасам), аказваецца, ардэнаносец. Таццяна Пятроўна ГЛАЦЁНАК летась Указам Прэзідэнта ўзнагароджана ордэнам Маці. У яе тры сыны і дзве дачкі. Ужо дарослыя і вельмі, як мама, працавітыя. Што яшчэ цікава, Таццяна Пятроўна ў свой час пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў Верхнядзвінскі раён ажно з Рыгі. Закахалася ў беларускага хлопца — будучага мужа — і пераехала ў Беларусь.

Да Верхнядзвінска з Віцебска больш за тры гадзіны на маршрутцы. Ды яшчэ ж трэба неяк дабрацца да вёскі Каханавічы, дзе жыве і працуе Таццяна Пятроўна. Дапамог прадстаўніку «Звязды» **намеснік старшыні Верхнядзвінскага райвыканкама Уладзімір Яфімавіч ЯКАЎЛЕЎ**, які збіраўся ехаць па службовых справах у тым жа кірунку.

Дарэчы, вельмі запомніўся ў раёне леташні візіт маіх мінскіх калег, якія прывезлі жанчыне — шчаслівай падпісчыцы — халадзільнік. Добрым словам успомнілі Яўгена Пясецкага, нашага фотакарэспандэнта, які, па словах работніц пошты, з яшчэ адным прадстаўніком «Звязды» (прозвішча якога яны не запомнілі) падчас паводкі мужна цягнуў на сабе халадзільнік.

Да Каханавічаў даехалі хутка. Алена Міхайлаўна Кавалеўская прадставіла мне руплівага пашталёна.

Таццяна Пятроўна Глацёнак аказалася вельмі сціплым чалавекам. Расказала, што на пошце працуе пяць гадоў. Жыве ў вёсцы Каханавічы. Да таго, як стала пашталёнам, працавала гадоў дванаццаць у сельскагаспадарчай арганізацыі цялятніцай. Паколькі пашталён спяшалася па службовых справах, задаў ёй усяго некалькі пытанняў.

— А вам асабіста што ў «Звяздзе» падабаецца?

— Усё мне цікава. Навіны, інфармацыю пра цэны друкуюць і шмат іншага — газета насычаная самай рознай карыснай інфармацыяй.

— У вольны час чым любіце займацца? Можа трымаеце асабістую гаспадарку?

— Вядома ж. Карова ёсць, малако здаём, парсюкі, куры. А як жа? Старэйшаму, калі муж памёр, было 13-14 гадоў. А маленькай — гадкоў пяць. І тады не адна карова ў нас была, а тры. Дзесці ўжо выраслі. Аляксей працуе ў Верхнядзвінскім райпа, ён слесар па халадзільным абсталяванні. Максім вучыцца на чацвёртым курсе ў Полацкім гандлёва-тэхналагічным каледжы. Каця працуе кандытарам першы год. Мікалай вучыцца ў 11-м класе, а Марына — у 10-м.

— Унукаў няма яшчэ?

— Не, пакуль няма...

Руплівы пашталён абслугоўвае дзве вёскі, дзе жывуць 375 жыхароў. Ад імя ўсяго калектыву рэдакцыі жадаю ёй моцнага здароўя, поспехаў у рабоце. Добрыя дзеці, павага людзей — гэта так здорава! Ёсць упэўненасць, што прас — гэта толькі першы падарунак ад нас.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.

Віцебск — Верхнядзвінск — Каханавічы.

Лісы хварэюць

У цэнтры Камянца сярод белага дня свабодна гуляла ліса. Рыжая пакусалася з трыма сабакамі, у якіх потым было выяўлена шаленства. А ў цэлым з пачатку года ў Камянецкім раёне зафіксавана ўжо сем выпадкаў, калі шалёныя лісы і адна куніца зазіралі ў населеныя пункты. Як вядома, здаровы звер у вёску ці горад удзень не пойдзе. Летась за цэлы год было выяўлена 12 выпадкаў шаленства ліс. Цяпер работнікі ветэрынарнай службы абыходзяць падворкі Камянца і робяць прафілактычныя прышчэпкі ўсім свойскім жывёлам.

Яна СВЕТАВА.

Шампур, нажніцы, бензапіла?

85-гадовую жыхарку Рагачова ў бальніцу даставілі са шматлікімі цяжкімі раненнямі жывата, траўмамі твару і цела. Нажніцамі іх нанёс старой жанчыне 28-гадовы мясцовы жыхар — у яе ж кватэры. А вось у Ельскім раёне сужыцель пагражаў сваёй сяброўцы забойствам бензапілой. У гэтым выпадку абышлося без ахвяр. Міліцыя высвятляе, што не падзялілі паміж сабой двое непрацуючых у пасёлку Бальшавік Гомельскага раёна. Адзін з іх трапіў у бальніцу з пранікальным колата-рэзаным раненнем жывата. 30-гадовы «сябар» падчас сваркі пракалоў 58-гадовага... шампурам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Дазваніцца да сяброў

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Івацэвічы.

Вялікі і малыя

У 70-я гады настаўнікам музыкі і спеваў у нашай школе працаваў вельмі цікавы малады чалавек. На выгляд ён быў досыць блажэнькі — худы, невысочанькі, але ж браў у рукі баян і... Нешта рабілася з ім, з яго тварам. Ды што там — нават з фігурай. Музыка, што лілася, як здавалася, з самага сэрца, неяк узвышала яго, падымала, рабіла не проста прыгожым, але яшчэ і вялікім.

Не дзіва, што за такім хлопцам бегалі дзяўчаты. І што адна, як той казаў, дагнала — пажаніліся яны, прыжылі ажно трох хлапчукоў.

...Сынкі ўжо ладныя былі, калі бацька купіў матацыкл. Вядома ж, апасаўся, што дзеці могуць выкаціць яго, каб адвесці душу — накатацца. Таму адразу вырашыў, што тэхніку трэба замыкаць, а ключы надзейна хаваць.

Што і зрабіў. Але ж сынкі тую хованку адразу знайшлі.

Бацька прыдумаў новую, — яны асцярожна дасталі прабой...

Нарэшце, нанач, ён укацію матацыкл у хату і паставіў ля ўласнага ложка.

Хлопцы і тут не разгубіліся: пасядзелі «ў засадзе» — пачакалі, пакуль бацька добра засне (захрапе), а тады разуліся, ціхенька зайшлі ў пакой і вынеслі матацыкл з хаты, а потым, добра накатаўшыся, пачысцілі ад гразі, на руках унеслі назад і паставілі — зрабілі, як было. Бацька раніцай нічога не заўважыў і быў дужа задаволены, што прыдумка ўдалася — аж пакуль не выйшаў на двор ды не сустрэў суседа:

— І куды цябе па начах цяпер носіць? — пытаецца ён. — Я са сну ўжо выбіўся ад твайго матацыкла!

Іван Пятровіч нічога не сказаў — ні яму, ні дзецям, але ж высновы зрабіў. Наступным вечарам лёг у ложак і нават прыкінуўся, што спіць — як заўсёды, захроп...

Хлопцы на радасцях тут жа ў пакой... Толькі паднялі матацыкл, каб вынесці, а бацька як ускочыць, як гаркне:

— Ах вы паганцы...

У тых з перапуду рукі і апусціліся — матацыкл брызь аб падлогу...

На грукат тут жа прыбегла маці, уключыла святло. Бачыць: на падлозе з разбітай фарай ляжыць матацыкл, вакол яго стаіць трое падшыванцаў, а на ложку ў сямейных трусах у зялёны гарошак узвышаецца муж.

І сапраўды вялікі.

Дзіна Дубадзелава,
в. Леніна Добрушскага раёна.

Няма роду без выроду

Яшчэ продкі нашы казалі, што са сваім статутам у чужы манастыр не ходзяць, але ж чулі гэта не ўсе.

...У нас, у Лучыне здавён усё адметным было — па-свойму жылі, па-свойму працавалі, па-свойму святы святкавалі. І ўжо спевы тады...

Слон у мяне па вушах не таптаўся, таму смела скажу: спяваюць у нас, як нідзе! Вёска ж на Дняпры стаіць. Відаць, адтуль і расейскі размах, і ўкраінская галасістасць, і беларуская туга... Нават старыя, вядомыя песні ў нас па-іншаму гучаць! Бо ёсць яшчэ група носьбітаў гэтай лучынскай манеры спеваў. Жанчынам — ці не апошнім з Магікан — па восемдзесят і болей ужо, але па святах збіраюцца — паспяваць, «язык распраміць» (пагаварыць значыць). Знясуць тады ў адно месца, у каго што смачнейшае ёсць, стол накрыюць, на сярэдзінку пляшку беленькай і...

Дык вось сабраліся неяк Тройцу з размахам адзначыць. Ужо добранька пасядзелі, пагаманілі, завялі каронную — «Ванька-ключнік». Ды гэтак — Дняпро прыціх, заслухаўся, не тое што людзі!

Вось адна з наезджых і не вытрывала — кавыль-кавыль праз вуліцу, далучаецца.

Лучынцы што — яны людзі гасцінныя: налілі і ёй той беленькай, павіталі. А ўжо ж сама распеліся, то ты, маўляў, выпіла, а цяпер пасядзі ды паслухай. Але ж баба, аказваецца, не за тым прыйшла, а... каб свае тры грошы ўваткнуць, голас свой далучыць: як зацягне — ні два ні паўтара: то занізка, то завысака...

Нашы спявачкі скрывіліся, але ж па правілах гасціннасці прамаўчалі.

А госця, між тым, настырнай аказалася: мала таго, што ўсю абедню, можна сказаць, сапсавала на Тройцу, на наступныя спеўкі зноўку прыйшла — ужо са сшытачкам, з песнямі, якія ў іх там спявалі. Горш за тое — «дырыжыраваць» захацела, вучыць. А каго — шаноўнага веку лучынак!

Не паддаліся яны: на яе тоненькі сшытачак дасталі свой агульны сшытак і даказалі, што ў яе нават словы няправільныя, бо ў многіх песень, якія лічацца народнымі, насамрэч аўтары ёсць: «Ванька-ключнік» — Крастоўскага, «Ухар-купец» — Нікіціна, «Бывайце здаровы» — Адама Русака і г.д. Так што мы не супраць, маўляў, калі ў вас там гэтак спяваюць, то няхай — спявай, калі хочаш, і ты, але ж нас перайначваць... Гэта ўсё роўна, што хор Пятніцкага!.. (Нашы абы з кім раўнацца не будуць, бо цану сабе ведаюць!). А значыць, слухай і вучыся, пакуль мы жывыя. А не...

Больш тая кабета на спеўкі не прыходзіла, хоць яе адтуль ніхто і не праганяў.

Соф'я Кусянкова,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

Праз усё жыццё

...У апошнія дні вайны ў нашу хату, дзе расло шасцёра малых, уваліліся нейкія людзі, сказалі, што яны партызаны, і забралі ўсё, у тым ліку — і апошнюю карову.

Так што адна ў нас радасць была — з фронту вярнуўся тата! Але і тая — дужа ж нядоўгая, бо ён вельмі цяжка хварэў і хутка памёр.

Як выжывалі, без слёз не раскажаш! Трымалі гаспадарку, шмат гусей, курэй, мама вазіла прадаваць гародніну і ягады, дзядуля плёў лапці. Мы, малыя, пасвілі калгасных цялят і кароў, насілі абутак з дрэва, а падросшы...

У школу я хадзіла ў другую змену, а ў першую — няньчыла дзіця, каб зарабіць на кавалак хлеба. Так рабілі і дзве мае сястры.

Пасля сямігодкі вельмі хацелася вучыцца далей, але ж не было як: ні адзення, ні абутку, ні кніг... Таму я пайшла працаваць, каб зарабіць хоць трохі грошай, усё купіць і атрымаць-такі сярэднюю адукацыю. Работа ў мяне была звычная — служанкай у старшыні мясцовага калгаса...

І вось, памятаю, 1958 год. На раён Вілія ладзіцца свята песні і працы — фестываль. Усе туды едуць. І — цуд — гаспадыня (жонка старшыні) мяне адпусціла! Больш за тое — выдала зарплату — 10 рублёў. Сказала: «Там будуць магазіны, мо, што купіш сабе».

Ад шчасця я на сёмым небе была: паклала грошы ў кішэнь пінжачка, разам з людзьмі, на калгаснай машыне паехала на свята.

Аднак патрэбных кніг там не было, адзення таксама, толькі прадукты, прысмакі. Траціцца на іх я не стала: раз-пораз засоўвала руку ў кішэнь, каб пацешыцца сваім заробкам і, як зачараваная, слухала спевы хору.

Але ж заўважыла, як побач спыніліся трое хлопцаў-падлеткаў (на той час досыць прыгожа апранутых)...

— Дзяўчынка, у цябе грошы былі? — ціха спытаў адзін з іх.

Я скамянела ад жаху: «Іх што, няма?!»

Крыніцай заражэння з'яўляецца кроў інфіцыяванага чалавека. Некалькі дзесяцігоддзяў таму асноўнымі шляхамі заражэння былі пераліванні донарскай крыві і хірургічныя ўмяшанні. З увядзеннем прафілактычных мерапрыемстваў, а менавіта тэсціравання на вірус «С» донарскай крыві і выкарыстання толькі аднаразовых шпрыцаў і інструментаў, асноўным шляхам заражэння стала выкарыстанне нестэрыльных іголак пры ўвядзенні наркотыкаў, нанясенні татуіровак, пірсінгу. Заражэнне магчымае і палавым шляхам, асабліва пры наяўнасці некалькіх палавых партнёраў. Перадача віруса ад інфіцыяванай маці дзіцяці адбываецца пры родах у 5 працэнтах выпадкаў.

Дарэчы, жанчын маладога ўзросту можна аднесці да групы рызыкі па гепатыце С. Бо ім можна заразіцца не толькі пры пераліванні крыві і лячэнні зубоў, але і пры наведванні цырульняў і салонаў прыгажосці, калі там карыстаюцца нестэрыльнымі інструментамі. У гэтым плане небяспечныя манікюр, расчэсванне валасоў вострым грэбнем, вышчыпванне броваў, эпіляцыя, праколванне вушэй, татуіроўка і іголкаўколванне. Таму жанчынам ёсць над чым задумацца.

Нячутны поступ хваробы

Галоўная небяспека гепатыту С у тым, што пасля заражэння яўных сімптомаў захворвання можа і не быць. У 80 працэнтах выпадкаў востры перыяд інфіцыявання праходзіць без бачных сімптомаў. Толькі ў 5 працэнтаў людзей пасля заражэння развіваецца так званая жаўтушная форма вострага гепатыту — цямнее мача, жаўцюцюць бялкі вачэй і скура. Часцей характэрныя лёгкія формы жаўтухі, якія часам увогуле праходзяць незаўважанымі. (Колер скуры не змяняецца, жаўцюцюць толькі склеры вачэй. На кароткі час можа пацямнець мача — яна становіцца колеру піва, а стул, наадварот, абясколерваецца.)

Каварства віруса гепатыту С заключаецца ў тым, што перыяд скрытага працякання хваробы можа доўжыцца некалькі гадоў. Часта пасля заражэння чалавек адчувае сябе абсалютна здаровым, а першыя сімптомы захворвання праяўляюцца толькі на позняй стадыі цырозу печані, калі хвароба цяжэй паддаецца лячэнню.

Асаблівасць гепатыту С — надзвычай высокая частата хранізацыі інфекцыі. Хранічная пажыццёвая інфекцыя і прагрэсуючае захворванне печані развіваецца ў 85 працэнтаў інфіцыяваных.

«Непячоначныя» сімптомы

Важна ведаць, што жаўтуха пры хранічным гепатыце С бывае вельмі рэдка, як правіла, ужо на фоне цырозу. Найбольш частымі сімптомамі хваробы з'яўляецца слабасць, павышаная стамляльнасць. Вірус пашкоджвае не толькі печань, але і іншыя органы. Таму часцей, чым жаўтуха, назіраюцца такія «непячоначныя» сімптомы, як болі ў суставах і мышцах, скурныя высыпкі, павышэнне тэмпературы. Да іх могуць далучацца ваніты, страта апетыту.

Скрытае бессімптомнае цячэнне хваробы або наяўнасць «непячоначных» сімптомаў — асноўныя прычыны позняга ўстанаўлення правільнага дыягназу. Паколькі без лячэння хвароба прагрэсуе, вельмі важна своечасова выявіць наяўнасць гепатыту С і пачаць неабходнае лячэнне.

«... І не забудзьце здаць кроў!»

У цяперашні час распрацаваны даступныя метады дыягностыкі гэтай інфекцыі. Асноўны метад — аналіз крыві на наяўнасць антыцел да віруса і на наяўнасць фрагментаў самога віруса. У апошнія гады нярэдкім становіцца «выпадковае» ўстанаўленне дыягназу гепатыту С пры абследаванні з прычыны іншых захворванняў, перад родамі або перад аперацыяй.

Асабліва важна праводзіць даследаванне на наяўнасць гепатыту С у групах рызыкі: у асоб, якія мелі ў мінулым пераліванні крыві, аперацыі; хварэлі на жаўтуху; наркаманаў; дзяцей, якія нарадзіліся ад маці, хворых на гепатыт; асоб, якія вядуць бязладнае палавое жыццё.

Генеральнае адступленне хваробы

Асновай сучаснага лячэння гепатыту С з'яўляюцца прэпараты інтэрферону-альфа. Інтэрфероны — гэта бялкі, якія выпрацоўваюцца ў арганізме кожнага чалавека і валодаюць супрацьвірусным актыўнасцю. Аднак часам гэтай актыўнасці бывае недастаткова для барацьбы з каварным і зменлівым «хамелеонам» — вірусам гепатыту С. Увядзенне прэпаратаў інтэрферону дапамагае арганізму справіцца з інфекцыяй. Спалучэнне інтэрферону з іншымі супрацьвірусными прэпаратамі значна павышае эфектыўнасць тэрапіі. Гарантыяй поспеху з'яўляецца як мага больш ранняя вызначэнне дыягназу і пачатак лячэння.

Як пазбегнуць абвастрэння?

Адразу пасля выпіскі са стацыянара хворыя на гепатыт С пераходзяць у рукі ўрача-інфекцыяніста. Ён праводзіць дыспансэрныя назіранні кожныя тры месяцы на працягу першага года. Трэба рэгулярна здаваць кроў на біяхімічнае даследаванне і на антыцелы да гепатыту С. Калі чалавек выздаравеў і антыцелы ў крыві больш не выяўляюцца, то ўсё роўна назіранне працягваецца яшчэ год.

Каб трымаць хваробу ў цуглях, хворым даводзіцца ісці на пэўныя ахвяры. Для іх пажаданыя ўмераныя фізічныя нагрузкі. Медыкі і ў далейшым рэкамендуюць ім прытрымлівацца дыеты. Харчаванне павінна быць дробным — 4—5 разоў у дзень невялікімі порцыямі. Ежу варта гатаваць на пары, адварваць або запякаць у духоўцы.

Урачы раяць назаўсёды адмовіцца ад наварыстых мясных і грыбных бульёнаў, агароднінных адвараў, тлустага мяса (свініны, бараніны і да т.п.). Неабходна забыць пра вяндліну і кансервы. Нельга дадаваць у ежу вострыя прыправы: воцат, перац, гарчыцу, хрэн. Нават маленькая доза алкаголю за святочным сталом можа выклікаць абвастрэнне захворвання. І гэта яшчэ не ўсё: соль, шакалад, какава і здоба — таксама ворагі хворай печані.

Але, нягледзячы на такую жорсткую дыету, пацыент усё-такі можа адвесці душу і паласавацца варэннем, мёдам, вінаградам або кавуном. Дазваляюцца тварог, кефір, ёгурт, зяленіва і агародніна. З напояў: гарбата, нямоцная кава (лепш з малаком), адвар шыпшыны, салодкія сокі і морсы.

З вялікай асцярогай варта ўжываць лекі — іх прыём абавязкова павінен быць узгоднены з урачом-інфекцыяністам. Гэта звязана з тым, што большасць прэпаратаў разбураецца ў печані, а лішняя нагрузка ёй зусім не патрэбна.

Як папярэдзіць хваробу?

- Будзьце пільныя і не рызыкуйце дарэмна. Не наведвайце сумніўныя салоны прыгажосці і цырульні, не давярайце сваё здароўе тым, хто не мае ліцэнзіі на права практыкаваць на доме.
- У любой медустанове пераканайцеся, што стандартныя меры засцярогі строга захоўваюцца.
- Хоць рызыка перадачы віруса пры палавым кантакце не надта вялікая, яе можна знізіць яшчэ больш, выкарыстоўваючы прэзерватыў або іншы бар'ерны супрацьзачаткавы сродак.
- Калі ў доме ёсць хворы на гепатыт, усе члены сям'і павінны захоўваць правілы асабістай гігіены і карыстацца толькі індывідуальнымі расчоскамі, манікюрнымі інструментамі, брытвамі, эпілятарамі, шчыпчыкамі для броваў, зубнымі шчоткамі і да т.п.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ЦЫБУЛІНА З БУЛЬБІТАМ

Язва дванаццаціперснай кішкі — хвароба распаўсюджаная, пра яе чуў кожны. Але мала хто ведае, што ў большасці выпадкаў лакалізуецца язва ў верхняй частцы кішкі. Анатамічныя падрабязнасці, магчыма, былі б лішнімі, калі не прымаць да ўвагі, што папярэднічае язве, як правіла, бульбіт — немач, пра якую чалавек часта даведваецца, калі гэты самы бульбіт ужо паўнацэнная язва.

Бульбіт — запаленне слізістай абалонкі цыбуліны дванаццаціперснай кішкі (таго яе ўчастка, які мяжуе са страўнікам).

Адным з асноўных фактараў узнікнення захворвання з'яўляецца інфекцыя, выкліканая бактэрыяй Helicobacter pylori (Hp). Пры гэтай інфекцыі бульбіт узнікае на фоне хелікабактэрнага гастрыту і скідвання кіслага страўнікавага зместу ў дванаццаціперсную кішку.

Нярэдка бульбіт праяўляецца ў раннім дзяцінстве па прычыне празмернай рухавасці дванаццаціперснай кішкі. Калі ў чалавека празмерная рухавасць дванаццаціперснай кішкі, то гэта садзейнічае ўзнікненню непатрэбных дадатковых петляў. У апошніх збіраецца ежа, якая не можа быць нармальна ператраўлена і з'яўляецца ідэальным асяродкам для размнажэння бактэрый.

Востры бульбіт можа быць справакаваны злоўжываннем алкаголю, рознымі атручэннямі, а таксама прыёмам лекаў, што ўздзейнічаюць на слізістую абалонку страўнікава-кішачнага тракту. Прычынай вострай формы захворвання таксама можа стаць траўма страўнікава-кішачнага тракту ў выніку пападання іншароднага цела. Хранічны бульбіт узнікае на фоне лямбліёзу, глісных інвазій і хваробы Крона.

Найбольш тыповай праявай бульбіту з'яўляецца ныючы, радзей схваткападобны боль у падлыжачнай вобласці, звязаны з адчуваннем лёгкага голаду. Бульбіт нярэдка суправаджаецца пякоткай, млоснасцю, моцнымі запорамі. Пры абвастрэнні хваробы назіраецца агульнае недамаганне, галаўны боль, вегетатыўныя парушэнні. Пры працяглым перапынку паміж прыёмамі ежы могуць узнікаць мышачная слабасць, дрыжанне ў целе, патлівасць.

У выпадку, калі слізістая пакрываецца паверхневымі ранкамі — эрозіямі, гавораць пра эразіўны бульбіт. Менавіта гэты варыянт захворвання пры несвоечасовым лячэнні даволі часта пераходзіць у язвавую хваробу дванаццаціперснай кішкі.

Адзіным надзейным метадам вызначэння стану слізістай абалонкі лічыцца гастрадуадэноскапія — агляд слізістай пры дапамозе эндаскопа. Пры гэтым можна не толькі ўбачыць ступень запалення, наяўнасць, памеры і колькасць эрозій, але і правесці дадатковыя даследаванні. Для вызначэння прычыны бульбіту праводзяць аналіз на хелікабактэрную інфекцыю і поўнае абследаванне органаў СКТ.

Медыкаментознае лячэнне прызначаецца, зыходзячы з прычын узнікнення бульбіту. Пры наяўнасці Hp праводзіцца курс антыбіётыкатэрапіі. Калі бульбіт выкліканы паразітамі, то прызначаецца супрацьпаразітарнае лячэнне. У абавязковым парадку доктар прапіша сродкі для нармалізацыі сакрэцыі салянай кіслаты, прэпараты, якія паскараюць загойванне слізістай абалонкі і якія рэгулююць маторыку СКТ.

Хвораму на бульбіт у першую чаргу неабходна скарэктаваць свой лад жыцця: перагледзець рацыён і рэжым харчавання, выключыць шкодныя звычкі (такія, як ужыванне алкаголю і курэнне), знізіць нервова-эмацыянальную нагрузку. У перыяд абвастрэння немачы рэкамендуецца механічнае, тэрмічнае і хімічнае ашчаджэнне слізістай.

Яшчэ адзін фактар, які садзейнічае ўстараненню бульбіту, — гэта якасць жавання. Чым лепш перажаваная ежа, тым большая верагоднасць таго, што ў страўніку ўтвараецца так званы хімус — паўвадкая маса, якая складаецца з часткова ператраўленай ежы і страўнікавага соку. А паколькі апошні, вобразна кажучы, «заняты сваёй работай», яго агрэсіўнасць змяншаецца. Таму, калі сядаеце за абедзенны стол, абстрагуйцеся ад турбот, тэлевізара, газет і не пашкадуйце 20—30 хвілін на яду. Важны і рытм харчавання. Нельга, паснедаўшы ў 8 гадзін раніцы, абедаць у 8 вечара, а вячэраць бліжэй да апоўначы. Лепш есці часта, дробнымі порцыямі.

Пры бульбіце давядзецца выключыць вострыя, тлустыя, кіслыя стравы, наварыстыя супы, марынады, шакалад, моцную гарбату, асабліва каву. Дарэчы, апошняя — гэта бізун, прычым не толькі для «ўзбадзёрвання» арганізма, але і для страўніка: кафеін стымулюе ўтварэнне страўнікавага соку. Між тым многія п'юць каву ўвогуле нашча, чым павялічваюць рызыку захворвання. Калі не можаце адмовіцца ад кавы, моцнай гарбаты, успомніце добрую англійскую традыцыю і піце іх з вяршкамі, малаком. Што датычыцца мяса — лепш, каб яно было адвараным. Садавіну і агародніну пажадана тушыць, запякаць. Альбо жуйце іх у свежым выглядзе так доўга, каб у роце атрымаўся сок — маркоўны, капусны, яблычны. (Дарэчы, маркоўны сок нармалізуе павышаную кіслотнасць страўнікавага соку: прымайце 1/4 шклянкі 3 разы на дзень за 40 хвілін да яды.)

Добра выпіць раніцай нашча за 30 хвілін да яды шклянку мінеральнай вады ў крыху падагрэтым выглядзе і абавязкова без газу (не забудзьцеся з вечара адкаркаваць бутэльку).

Змагацца з бульбітам дапамогуць і травы

- Настой рамонку і ісландскага моху гатуйце з разліку 2 ст. лыжкі іх сумесі на 2 шклянкі кіпеню, настойвайце 1 гадзіну. Піце па 0,5 шклянкі 3 разы на дзень да яды.
- Прыгатуйце настой кары дуба: вазьміце 1 ст. лыжку без горкі на шклянку кіпеню. Заварваць лепш у тэрмасе. Вытрымаць 6—8 гадзін. Прымаць па 1/4 шклянкі 2—3 разы на дзень перад ядой.
- Можна прыгатаваць і такі збор: змяшайце па 2 ст. лыжкі кветак рамонку, кораня алтэі, лакрычніку і травы святаянніку. Заліце 2 ст. лыжкі збору 2 шклянкамі кіпеню ў тэрмасе на ноч. Выпіце на працягу дня ў цёплым выглядзе за 30 хвілін да яды і на ноч.
- Збор «духмяны»: вазьміце па 25 г лісця шалфею, травы маяранy, лісця мяты, кветак лаванды. Прыгатуйце настой і прымайце яго па 0,5—1 шклянцы пасля абеду і вячэры.
- Плады фенхелю, корань валяр'яну — па 10 г, лісце мяты — 20 г, кветкі рамонку — 60 г. Прыгатуйце настой. Піце па 1 шклянцы пры коліках і адчуванні цяжару ў страўніку.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

Да канца месяца на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) дзяжурыць плануюць:

28 сакавіка — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач горада Мінска Фёдар Аляксандравіч ГЕРМАНОВІЧ.

29 сакавіка — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Савецкага раёна горада Мінска Уладзіслаў Вячаслававіч ЗУБЕЛЕВІЧ.

30 сакавіка — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Фрунзенскага раёна горада Мінска Аляксандр Леанідавіч ВОЙЦІК.

31 сакавіка — галоўны ўрач мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Людміла Аляксандраўна КАЛАСКОВА.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

28 сакавіка — загадчык хірургічнага аддзялення №1 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Дзмітрый Аляксандравіч ЧЭПІК.

29 сакавіка — загадчык філіяла № 1 «Атолінская бальніца» Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Мікалай Рыгоравіч ГРЫШУК.

30 сакавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя — наркалогія» Вячаслаў Уладзіміравіч САЛАДУХА.

31 сакавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яраслаў Леанідавіч ПЕРАЛЫГІН.

1 красавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Аксана Уладзіміраўна ЗАРОДАВА.

Дата ў гісторыі: 98 гадоў таму ў Мінску адкрыты першы выцвярэзнік

21 сакавіка 1913 года губернскі камітэт папячыцельства аб народнай цвярозасці адкрыў у Мінску «прытулак для працвярэжвання» асоб, якія затрымліваліся ў п'яным выглядзе чынамі паліцыі. Як нагадвае карэспандэнт агенцтва «Мінск—Навіны», на абсталяванне і адкрыццё гэтага прытулку, а таксама на наём фельчара і вартаўніка былі асігнаваны 743 рублі. Зачынілі выцвярэзнік 1 верасня 1914 года, калі ў Расійскай імперыі ў сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны была ўведзена забарона на продаж алкаголю.

Дзмітрый ІСАЙЧУК, «Мінск—Навіны».

ОАО «ДЗЕРЖИНСКИЙ МОТОРОРЕМОНТНЫЙ ЗАВОД»

Адрес: **г. Дзержинск, ул. Фоминых, 6, 222720**
Ф.И.О. руководителя: **Битченко Н.Н.**
Ф.И.О. гл. бухгалтера: **Воронова Т.Ф.**
УНП 600005728
Осн. вид деятельности: **ремонт с/х техники**
Единица измерения: **млн руб.**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 года

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец года
1. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	2 478	2 964
Нематериальные активы	120		
Вложения во внеобор. активы	140	35	35
Итого по разделу 1	190	2 513	2 899
2. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	802	1 217
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	36	49
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	4	4
Кредиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	240	23	17
Денежные средства	260	3	11
Итого по разделу 2	290	868	1 298
БАЛАНС (190+290)	**300**	**3 381**	**4 197**
ПАССИВ	**Код строки**	**На начало года**	**На конец года**
3. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	920	920
Добавочный фонд	430	2 252	2 690
Нераспр. прибыль (непокр. убыток)	450	-631	-515
Итого по разделу 3	490	2 541	3 095
4. ДОЛГОСР. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	510	159	144
5. КРАТКОСР. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	690	681	958
БАЛАНС (490+510+690)	**700**	**3 381**	**4 197**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01.2010 г. по 31.12.2010 г.

Наименование показателей	Код строки	На начало года	На конец года
1. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации	010	1727	1905
Налоги и сборы	011	1448	1618
Себестоимость реализованной продукции	030	1164	1456
Прибыль (убыток) от реализации	070	284	162
2. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	14	58
Налоги и сборы	081	2	28
Операционные расходы	100	12	50
Прибыль (убыток)	120	5	-19
3. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	17	12
Внереализационные расходы	150	78	59
Прибыль (убыток)	160	-66	-42
Прибыль (убыток) (+/-070+/-120+/-160)	200	223	101
Налог на прибыль	250	62	25
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	45	45
Чистая прибыль (убыток)	**300**	**116**	**31**

Количество акционеров – всего 286, в том числе: юридических лиц – 1, физических лиц – 285.

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	На начало года	На конец года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	0	0
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	0	0
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	36,5	44,4
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	0	0

Информация о задолженности

Наименование показателя	Единица измерения	На начало года	На конец года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	4	4
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	753	943

Среднесписочная численность работающих (человек) – 58.

ЗДАРОВЫЯ ЗУБЫ — СТРАХОЎКА І АД ДЫЯБЕТУ, І АД АТЭРАСКЛЕРОЗУ

НА КОЖНАГА беларуса ў сярэднім прыпадае 1,5 наведвання дзяржаўных стаматалагаў у год. Усяго ў дзяржаўным сектары было зарэгістравана летась 14 млн 140 тысяч зваротаў плюс 784 тысячы — у недзяржаўных арганізацыях, якія аказваюць насельніцтву стаматалагічную дапамогу. Многа гэта ці мала? Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожны чалавек павінен сама меней двойчы на год наведваць стаматолага з прафілактычнымі мэтамі...

— На жаль, але стаматалагічнае здароўе наша насельніцтва звязвае, у першую чаргу, з эстэтыкай. У большасці людзей адсутнічае разуменне, што ад стаматалагічнага здароўя залежаць стан усіх нашых унутраных органаў, страўнікава-кішачнага тракту, крыві, скуры і ўвогуле якасць нашага жыцця, — канстатуе **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ**. — Даказана, што прафілактыка стаматалагічных захворванняў замаруджвае прагрэсаванне атэрасклератычных парушэнняў, цукровага дыябету, спрыяе змяншэнню частаты абвастрэнняў захворванняў бронха-лёгачнай сістэмы. А мы бяжым да доктара часцей за ўсё, калі нам ужо штосьці баліць. І гэта абсалютна няправільна.

— Цяжка ўявіць сабе, каб чалавек спакойна чакаў выдалення і замены якога-небудзь іншага свайго органа, аднак што тычыцца здароўя зубоў, то з імі многія расстаюцца з лёгкасцю, маўляў, выдалю сабе «дрэнныя» зубы, а на іх месца ўстаўлю потым новыя. Гэта, прабачце, нонсенс, — дзеліцца сваім бачаннем сітуацыі **загадчык кафедры агульнай стаматалогіі БелМАПА Наталля ЮДЗІНА**. — Такую псіхалогію трэба тэрмінова змяняць...

Як сведчыць праведзенае эпідэміялагічнае даследаванне, найбольш высокі працэнт карыесу выяўляецца ва ўзроставай групе 35—44 гады: у людзей гэтага ўзросту карыёзнай хваробе падвержаны 13 зубоў з 32. Дарэчы, рэалізацыя 10-гадовай Нацыянальнай праграмы прафілактыкі захворванняў на карыес зубоў і захворванняў перыядонту прынесла добрыя вынікі, асабліва ва ўзроставых групах 6-гадовых і 12-гадовых дзяцей. Працэнт здаровых шасцігадовых дзяцей павялічыўся з 17,6 працэнта ў 1999 годзе да 23,8 працэнта ў 2010 годзе. Інтэнсіўнасць карыесу пастаянных зубоў у 12-гадовых дзяцей зменшылася з 3,5 у 1999 годзе да 2,27 у 2010 годзе і ацэньваецца спецыялістамі як нізкая. У 18-гадовых маладых людзей колькасць карыёзных зубоў зменшылася на адзінку — да 5,7. Зменшылася і колькасць зубоў, выдаленых у 18-гадовым узросце, хоць, безумоўна, выдаленых зубоў у такім узросце ўвогуле быць не павінна. А ва ўзроставай групе 35-44 гады сярэдняя колькасць карыёзных зубоў стабілізавалася і склала летась 11,93.

На думку **галоўнага пазаштатнага дзіцячага стаматолага г. Мінска Аляксандра ЖАРДЗЕЦКАГА**, толькі ад бацькоў залежыць, наколькі здаровыя будуць у іх дзіцяці малочныя, а затым і пастаянныя зубы. Удзел стаматолага нават менш важны, чым удзел адукаваных бацькоў, якія ведаюць, чым дзіця трэба карміць і як правільна чысціць зубы. А наведваць дзіцячага стаматолага трэба яшчэ да таго, як у дзіцяці з'явяцца першыя зубкі, каб той мог выявіць нейкія анамаліі, якія пазней могуць паўплываць на стаматалагічнае здароўе.

— Майце на ўвазе, што карыес імкліва маладзее, — папярэджвае спецыяліст. — І нярэдка бацькі не паспяваюць парадавацца першаму зубіку, як той праз пару месяцаў пачынае чарнець. Салодкія кампоты, падсаладжаная вадзічка зусім не спрыяюць здароўю дзіцячых зубоў.

На працягу двух гадоў у некалькіх мінскіх школах праводзіўся эксперымент. Дзеці былі «ўзброеныя» дзіцячай зубной пастай і дзіцячым зубнымі шчоткамі, прадстаўленымі адной з кампаній-спонсараў. Пасля прыёму ежы малыя пад кантролем сваіх педагогаў чысцілі зубы. Вынікі пераўзышлі ўсе чаканні: зубы сталі намнога чысцейшымі (чысціня вызначалася спецыяльнымі індэксамі), адпаведна рэзка знізілася і захваральнасць дзяснаў, якую выклікае дрэнная гігіена рота (узровень гінгівітаў зменшыўся ў дзяцей на 50 працэнтаў).

— Нам удалося даказаць, што не мае значэння, якая выкарыстоўваецца паста (з фторам, кальцыем, лячэбна-прафілактычная, гігіенічная і г.д.). Галоўнае ў прафілактыцы захворванняў карыесу і перыядантыту — гэта чысціня зубоў, — дадаў Аляксандр Жардзецкі.

Людміла Жылевіч звярнула ўвагу на адну цікавую тэндэнцыю — жыхары сельскай мясцовасці часцей за гараджан прыбягаюць да прафілактыкі:

— У сельскай мясцовасці стаматолагі самі ідуць да дзяцей у школу, запрашаюць выхаванцаў дзіцячых садкоў з выхавацелямі двойчы на год да сябе на ФАПы, прычым, што мне асабіста імпануе, пры кантактах з дзецьмі ўрачы не апранаюць белыя халаты. Калі ў малодшым узросце ўрачу ўдасца заваяваць у дзіцяці давер, то і пазней маленькі чалавечак будзе застрахаваны ад псіхалагічнага дыскамфорту пры наведванні кабінета зубнога ўрача, вядома, калі бацькі не падзеляцца з ім сваімі «ўражаннямі».

Між іншым, у старэйшага пакалення беларусаў паказчыкі стаматалагічнага здароўя не вытрымліваюць ніякай крытыкі: 23 зуба з 32 або пацярпелі ад карыесу, або ўжо выдаленыя. Паводле еўрапейскага прагнозу на бліжэйшыя 10 гадоў, пацыенты ва ўзроставай групе ад 65 да 74 гадоў павінны мець 20 сваіх зубоў. Для многіх немаладых беларусаў гэта пакуль сапраўдная раскоша.

Не сакрэт, што Закон «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» рэзка абмежаваў кола людзей, за якім захавалася права на бясплатнае ці льготнае зубапратэзаванне. Таму адбыўся некаторы адток пацыентаў, якія маюць патрэбу ў зубапратэзаванні, з дзяржаўных клінік у прыватны сектар, хоць прадстаўнікі дзяржаўнай медыцыны і запэўніваюць, што ў дзяржаўных медустановах

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 5 (121)

Фестывалі

Асаблівая чалавечасць

Тэатр становіцца сродкам рэабілітацыі людзей з фізічнымі і псіханеўралагічнымі асаблівасцямі.

Тэатральны фестываль «Крок насустрач» адкрыўся ў Мінску 24 сакавіка. Пра гэта абвясціла дабрачынная арганізацыя «Хэсэд-Рахамім», якая займаецца яго арганізацыяй. Яе падтрымаў шэраг грамадскіх і дзяржаўных арганізацый, такіх як Міністэрства культуры, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

«Крок насустрач» — гэта міжнародны фестываль асаблівых тэатраў. Тэатры сапраўды асаблівыя — такімі іх робяць самі ўдзельнікі, людзі ў нейкім сэнсе гераічныя, сціплыя, не асабліва спешчаныя славай, але безумоўна апантаныя. Часам пра іх кажуць: людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Але мастацтва вялікае таму, што здольнае рассоўваць межы, а людзі не заўсёды могуць уявіць самі свае сапраўдныя магчымасці.

Таму фестываль — гэта магчымасць абсалютна для ўсіх адчуць сілу мастацтва напярэдадні Міжнароднага Дня тэатра: для тых, хто шукае ад спектакляў узрушэння, для тых, хто сродкамі тэатра можа распавесці пра сябе. Тут адно і другое павінна супасці.

Вось як, напрыклад, у тэатры «Натхненне», які існуе з 2005 года ў рамках адмысловай праграмы «Вясёлка». За гэты час у рэпертуары з'явілася восем спектакляў і тры перформансы. Беларускі тэатр «Натхненне» унесены ў міжнародны каталог асаблівых тэатраў. Дзякуючы кіраўніку Алене Кавалевіч тэатр стаў заснавальнікам Практычнага Фестывалю «Цуд творчасці!». І здолеў прыцягнуць увагу да праблем «асаблівай творчасці». А праз тры гады зрабіў сапраўдны «Крок насустрач» праз межы: як тэрытарыяльныя, так і тыя, што раз'ядноўваюць людзей нябачным падзелам на звычайных і асаблівых. А можа, усё гэта штучна некім прыдумана? Таму што ўсе ж адналькава належаць да чалавечага роду і кожны мае права на свае асаблівасці і незвычайнасці. Пра гэта запрашаюць паразважаць удзельнікі тэатраў з Мінска, Брэста, Бабруйска, Кіева, Санкт-Пецярбурга, Вільнюса. У рамках фестывалю ў Мінскім яўрэйскім абшчынным доме пройдзе «круглы стол» «Мастацтва, якое лекуе».

Гаючую сілу праз мастацтва павінны даць і гледачы — гэта важна для таго, каб у грамадстве мянялася стаўленне да людзей з асаблівасцямі развіцця. Асабліва з улікам таго, што ў Беларусі распрацоўваецца праграма па рэабілітацыі і адаптацыі маладых людзей з фізічнымі і псіханеўралагічнымі захворваннямі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Працяг тэмы: Погляд

РАТУШНЫЯ ФУНКЦЫІ ЛІДСКАГА ЗАМКА?

Такую прапанову выказвае інжынер-будаўнік, у мінулым — старшыня Лідскага гарвыканкама Уладзімір Логаш, які ў пачатку 1970-х гадоў быў ініцыятарам і адным з першапраходцаў працы па захаванні рэшткаў руінаў замка, а потым і па яго аднаўленні ў першародным выглядзе. Друкуем ягоны ліст у «Звязду».

«Пабудаваны ў 1323—1325 гадах Вялікім князем Гедымінам, Лідскі замак вытрымаў не адну аблогу ворагаў, захоўваючы жыцці нашым продкам і даўшы выжыць нашай дзяржаве — Вялікаму Княству Літоўскаму, Рускаму і Жамойцкаму. Пазней, падчас вайны Расіі са Швецыяй, якая вялася на нашай тэрыторыі, вежы і рагі замка былі ўзарваныя і ён страціў сваё абарончае прызначэнне.

Затым на працягу больш чым 200 гадоў, калі наша зямля адышла да Расіі, па палітычных і эканамічных прычынах тагачаснай уладзе ніякай справы не было да нашай сцяны, гістарычнай памяці, і замак паволі разбураўся, прыходзіў у заняпад, як і Крэва, Навагрудак, Мір, Меднікі, Трокі... У міжваенны перыяд, «за польскім часам», таксама амаль нічога не рабілася. Так усё і прыйшло ў нашу сучаснасць: напалову разбураныя сцены, у кутках — праломы ад выбухаў, замкавая тэрыторыя ператварылася ў прахадны двор.

У пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя выканкам Лідскага гарсавета стаў настойліва прасоўваць ідэю аднаўлення замка. Да гэтага прыхільна паставілася Міністэрства культуры рэспублікі, а непасрэдна намеснік міністра А. Ваніцкі дапамагаў у вырашэнні канкрэтных задач. У горадзе стварылі спецыяльную брыгаду, і пасля дэталёвых раскопак маладым археолагам А. Трусавым і падрыхтоўкі праекта таленавітым архітэктарам С. Багласавым распачаліся аднаўленчыя работы. Рэстаўрацыйную цэглу і дахоўку прывозілі з Літвы, а фінансаванне забяспечвалася за кошт перавыканання гарадскога бюджэту і дапамогі аблвыканкама. Дапамагалі і кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў.

Ставілася задача: аднавіць сцены, баявыя галерэі і накрыць іх, каб усё захаваць ад вільгаці і разбурэння. Па-другое, аднавіць вежы, прыстасаваўшы адну з іх пад музей гісторыі горада і замка. А з другой вежай — пачакаць, час пакажа, што там зрабіць. Што ж тычыцца двара, то, як паказалі раскопкі, ніякіх мураваных пабудоў там не было. І правільна газета «Звязда» звярнула ўвагу, што «пасярод Лідскага замка будуюць невядома што». І галоўнае, для чаго?

Да сярэдзіны 1980-х гадоў, калі былі адноўлены тры сцяны з галерэямі і адна вежа, замак набыў маштаб і веліч як звонку, так і з замкавага двара. І калі будаваць яшчэ штосьці ў двары, то гэта, кажучы словамі Я. Купалы, «глупства, пане дабрадзею» і марная трата грошай. Вось з сярэдзіны двара і трэба, каб наведнікі ўбачылі і адчулі ўсе прапорцыі замка, архітэктурную прыгажосць, усвядомілі, як таленавіта і хутка, усяго за два гады, без кранаў і механізмаў нашы продкі стварыць такі шэдэўр.

І яшчэ. З 1990-х і недзе да 2005 года замкам ніхто не займаўся, таму і пагнілі драўляныя канструкцыі галерэй, паціху разбураліся дах і кладка сцен. Таму трэба выдаткоўваць грошы і арганізаваць нармальную эксплуатацыю ўсёй забудовы.

І, безумоўна, трэба зарабляць грошы на турыстах, экскурсіях, для чаго цяпер і павінен паслужыць славуты помнік. У гэтым кірунку праца вядзецца, але, мяркую, турыстычны патэнцыял замка яшчэ цалкам не выкарыстаны. Тут патрэбна больш намаганняў, ініцыятывы з боку не толькі ўладных, але і прыватных структур.

Што ж тычыцца другой вежы Лідскага замка, то ёсць такая прапанова. Калісьці ў горадзе была ратуша. На мой погляд, другую вежу было б добра часова (да мажлівай адбудовы ратушы) прыстасаваць для выканання ратушных функцый: прыёму высокіх гасцей, урачыстасцяў і г. д.

Уладзімір ЛОГАШ, старшыня Лідскага гарвыканкама ў 1969—1980 гадах.

ПРАДАЎ ЛЯСНІК

Бяседныя песні

Салісты ансамбля народнай музыкі «Бяседа» — асобы. Кожны з іх вылучаецца апантанай натхнёнасцю, вялікім творчым патэнцыялам.

У сузор'і таленавітых спявачак Святланы Суседчык і Наталлі Раманскай, заслужаных артыстак Беларусі, прыкметнае месца займае Таццяна Лазоўская. Яна — руплівая выканаўца народных песень, выдатная прадстаўніца новага артыстычнага пакалення.

Будучая спявачка нарадзілася 14 чэрвеня 1979 года ў старадаўнім горадзе на Дняпры — Быхаве. З маленства душою яна цягнулася да музыкі, да сцэны, жадала выступаць, каб спевам радаваць людзей. Найбольш блізкія ёй бадзёрыя, жыццярадасныя песні, якія нясуць прасвятленне, светлую энергію. Пасля трэцяга курса Магілёўскага музычнага вучылішча імя М. Рымскага-Корсакава Таццяна Лазоўская адважылася прыехаць у Мінск на праслухоўванне. Яе вакальныя дадзеныя, яркі артыстычны выгляд спадабаліся, і ў 1997 годзе была прынята ў «Бяседу».

Спрактыкаваныя калегі ўзялі добразычлівае апякунства над маладой спявачкай. Яны перадавалі ёй навыкі выканальніцкага майстэрства, сцэнічнага мастацтва, дапамагалі закончыць Мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі, куды яна паравялася з Магілёва, і Беларускі ўніверсітэт культуры.

Песні «Бяседы», запал ансамбля адпавядаюць характару Таццяны Лазоўскай. Гэта выразна пераданецца ў яе спеве, сцэнічных паводзінах, ад якіх ствараюцца маляўнічыя дзеі, як на сапраўдных народных гуляннях.

ПРАДАЎ ЛЯСНІК

Беларуская народная песня

Прадаў ляснік маладога дуба,
Купіў ляснік залатога зуба.

Прыпеў:
А я чарнява, малада, кудрава,
Цэлу ноч не спала,
З лесніком гуляла.

Завёў ляснік пад белу бярозу,
Зрабіў ляснік з п'янай цвярозу.

Прыпеў.

Завёў ляснік пад белу капіцу,
Зрабіў ляснік з дзеўкі маладзіцу.

Прыпеў.

Люлі, люлі, спі,
маё дзіцятка,
А ты не ведаеш, хто ў цябе быў татка.

Прыпеў.

Прапіў ляснік маладога дуба,
Згубіў ляснік залатога зуба.

Прыпеў.



Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Кінакрокі

БЕЛАРУСКАЕ ГЛЯДЗІ, КАЛІ МАЕШ DVD

Найноўшая айчынная кінапрадукцыя з'явіцца ў крамах на дысках.

Хто думае, дзе знайсці стужку «Снайпер. Зброя помсты»? Ці то хтосьці не ведае, што чакае прыхільнікаў латарэй, двух дзядоў з фільма «На спіне ў чорнага ката»? А ў крывавую «Масакру» пагрузіцца з галавою слабо — на ўвесь вечар? Дык купі і глядзі. Няма праблем: «Беларусьфільм» знайшоў паразуменне з кампаніяй «Вігма», якая цяпер выпускае навінкі кіно на DVD.

Колькасць пунктаў продажу дыскаў будзе пашырацца: праз «Еўрасетку» і сетку «Сувязны», праз крамы і гіпермаркеты, дылерскія арганізацыі ў рэгіёнах. Вопыт арганізацыі продажаў ёсць: кампанія выпускала і гандлявала музычнымі дыскамі.

Прадаваць беларускае кіно — значыць фактычна пачаць гэтую справу наноў. Нават з улікам таго, што старыя фільмы, «зробленыя ў БССР», калісьці карысталіся любоўю гледача, але даходзілі да яго праз вялікі экран і ТБ, на дысках іх не было да апошняга часу. Цяпер сітуацыя можа змяніцца, і кінастудыя, напрыклад, вельмі зацікаўлена ў рэстаўрацыі класікі беларускага савецкага кіно.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Вера КАВАЛЕРАВА: «Па колькасці роляў мяне можна заносіць у кнігу рэкордаў Гінэса»

Беларускі «Оскар» ідзе ў Тэатр юнага гледача!

МІЖНАРОДНЫ дзень тэатра актрыса Вера Кавалерава святкуе ў новым статусе. «Хрустальная Паўлінка» — узнагарода, якую штогод атрымліваюць асобы, якія задаюць тон у беларускім тэатральным мастацтве.

— Я напалоханая такой увагай, якую апошнія дні адчуваю ў сувязі з узнагародай, — прызнаецца Вера Кавалерава. — Думаю, такія ўзнагароды патрэбныя нашым акцёрам. Гэта ж сведчанне прызнання. Акцёр не можа без прызнання. Ён для гэтага жыве.

— У гісторыі гэтай узнагароды першы раз, калі «Хрустальную Паўлінку» атрымлівае актрыса ТЮГа. Ёсць меркаванне, што дзіцячы тэатр — нібыта не галоўны, у адрозненне ад акадэмічных...

— А я ўсё жыццё лічу, што мой тэатр — галоўны ў краіне. Таму што гэта дзеці, іх душы. Я нават лічу, што ў Тэатры юнага гледача не ўсе маюць права працаваць. Толькі людзі з чыстымі душамі, таму што мы нясём мастацтва дзецям. Мала таго, мы рыхтуем гледача да іншых тэатраў. Таму ў сувязі з гэтай узнагародай я радуюся, што на наш тэатр звярнулі ўвагу. Па маім глыбокім перакананні акцёры паўсюль аднолькавыя. Не важна, іграе ён у нацыянальным тэатры, у акадэмічным, ці ў ТЮГу, яны аднолькавыя па адоранасці.

— З пункту гледжання гледача, напэўна, няма такіх пытанняў.

— Гледачы якраз нас вельмі любяць. І, дзякуй Богу, да нас актыўна ходзяць.

— Сярод дзяцей, якія ходзяць у тэатр, хто самыя важныя для вас прыхільнікі? І як вы бачыце сучаснае дзіця, якое любіць тэатр, але расце на фільмах пра Гары Потэра?

— Яны не заўсёды разумеюць, што знаходзяцца ў тэатры, і што мы — не кіно. Аднойчы на сустрэчы з дзецьмі я спытала: «Чаму вы так крычыце, калі гасне святло? Чаму вы ўслых рэагуеце, перакрываючы акцёра? Вас жа шмат, а ён адзін... Перакрычаць вас нельга». Аказалася, гэта не таму, што нецікава. Яны так бурна абмяркоўваюць, гэта іх рэакцыя. Яны былі здзіўленыя. Я ім сказала: «Тое, што вы бачыце зараз — гэта імгненна існуе і ніколі больш не паўторыцца. Мы не плёнка, нас нельга адматаць і яшчэ раз пракруціць. Калі вы прыйдзеце на гэты спектакль наступны раз, ён будзе іншы. Хоць на трошкі, але іншы. І мы жывыя людзі». Гэта іх так уразіла, што мы не на плёнцы! Хоць жывую энергетыку, якую мы даём, яны вельмі адчуваюць. Гавораць, што акцёры ТЮГа доўга не старэюць. А чаму? Таму што за тое, што мы аддалі, мы атрымалі ў некалькі разоў больш ад іх. Калі ты выкладваешся, яны твоёй энергіяй напітваюцца і аддаюць значна больш. У гэтым сакрэт нашага тэатра.

— Вы актрыса, якая марыла іграць нейкія ролі. Для Вас галоўныя ролі — якія? Ці ёсць у Вас патаемныя акцёрскія жаданні?

— Я столькі сыграла розных роляў — напэўна, можна ў кнігу Гінэса ўносіць. У асноўным у мяне былі дзіцячыя ролі, дарослых было мала. Я настолькі падыходзіла да дзіцячых роляў па-даросламу. Вачыма дзяцей, душой дзяцей. Але ўсе свае патаемныя жаданні я сыграла. Асабліва ў жывёлах. Іграючы котку — чаму я не магу іграць лэдзі Макбет? Хто мне можа гэта забараніць? Гэта адчуе толькі дарослы, што за гэтым нешта стаіць, а дзіця ўспрымае як котку. Магчыма, з нейкай загадкай. Таму я якраз шчаслівы чалавек — усе свае мары ажыццявіла.

— І ў кіно сталі здымацца...

— Ведаеце, усе актрысы робяць пластычныя аперацыі, асабліва маскоўскія — там жа не стала старых. Я хоць і не вельмі падобная на старую, але я з сабой нічога не раблю. Прынамсі, такую дзіўную бабулю я магу сыграць. Але мне не хапае фактуры пакуль і для гэтых роляў.

— Усё ж можна намаляваць, прыляпіць, зрабіць грым...

— Ну як? Масу ж цела не набярэш, калі яе няма. Вось зараз я здымалася ў маскоўскім фільме. Мяне пастараліся апрануць шматслойна. Але ж я маленькага росту... Увосень мы здымаліся ў Маскве. Такая сцэна: бяда здарылася, мой унук па сюжэце збягае, я — за ім, таму што не магу аднаго адпусціць. Былі такія «ястрабкі» напрыканцы вайны, байцы знішчальных батальёнаў, таму што бандытызм квітнеў. І вось гэты «ястрабок» бяжыць. І я пытаюся перад здымкамі эпізода: «Як мне бегчы?» — «Як хочаце, так і бяжыце». Я і пабегла... Таму што была чэмпіёнкай Мінска па бегу на кароткія дыстанцыі. Пабегла. А потым мы завярнулі за вугал... Камера не ўбачыла, што я і ўнука перамагла, маладога хлопца. І калі мы вярнуліся, уся група проста ляжала ад смеху. Гавораць: нам потым скажуць, што замест Серафімы мы падставілі чэмпіёнку нейкую. А я ім: «Дык вы ж сказалі — бяжы як хочаш... Дык патлумачце, як бегчы». — «Бяжыце, Вера Ільінічна, як хочаце, толькі ўнука не пераганяйце». Таму я не вельмі падыходжу пакуль пад такія ролі. Але тым не менш, на мяне ўжо звярнулі ўвагу. Таму што пакуль я была маладая, хапала гераінь. Я разумею, чаму я стала здымацца...

— Кар'еру ў кіно пачынаць ніколі не позна...

— Увогуле ж я шмат адмаўлялася ў свой час, таму што шмат працавала: 3-4 спектаклі ў дзень. Гэта было нерэальна, яшчэ недзе здымацца. Я надта люблю тэатр. Гэта маё. У дарослым тэатры не хачу працаваць. ТЮГ — мой тэатр. Дай Бог, каб ён хутчэй стаў працаваць у звычайным рэжыме. А то мы не першы год існуем у рамонтным рэжыме, фактычна на колах, пакуль наш будынак закрыты. Хоць бы хутчэй яго зрабілі, каб сапраўды не складвалася ўражанне, што вельмі шмат увагі нашаму тэатру. Бо гэта ж не так!?. І было інакш, напрыклад, Машэраў вельмі любіў наш тэатр, разумеў яго значэнне для будучыні краіны.

— Калі ідзе беларуская дзіцячая класіка, якая нашым дзецям распавядае па-беларуску пра іх саміх і свет, у які яны прыйшлі...

— А яе практычна няма. Мы імкнёмся знаходзіць. Перакладалі ў асноўным. У нас тады Артур Вольскі быў, ён рабіў цудоўныя пераклады, было поўнае адчуванне, што гэта беларуская п'еса. Я яго лічу геніем, вельмі люблю, вельмі пакутую, што яго не стала. Цудоўны быў чалавек — і паэт, і драматург, і дырэктар быў добры. Ён разумеў, што ў Тэатры юнага гледача могуць працаваць толькі людзі апантаныя. Якім баліць толькі гэта, і нічога больш. А бываюць і «перакаці-поле», ТЮГ для іх — перавалачная база. Не толькі для акцёраў, але і для рэжысёраў. Прыступка для таго, каб пайсці далей. Але жыць у гэтым тэатры можна, толькі прысвяціўшы сябе менавіта яму, менавіта нашаму асабліваму гледачу.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Вясновае, жаночае

РЭАЛЬНЫЯ АНЁЛЫ

Жанчыны хочуць пісаць, чытаць і глядзець пра сябе

Хто не ведае, якую сілу маюць жаночыя слёзы? А жаночы смех?.. Жаночыя эмоцыі асаблівыя тым, што іх цяжка стрымаць. Ды навошта? Калі парадавацца і паплакаць — то абавязкова ад душы. І для душы, дзеля тых самых эмоцый жанчынам патрэбныя ўзрушэнні. А то ўсё неяк звычайна-будзённа, сур'ёзна, сур'ёзна, зноў сур'ёзна. Праблемы, справы, мітусня. Занятая, патэлефануй заўтра, няма часу на сустрэчу, планы, планы... Жывём у адным горадзе, а перасячыся цяжка, каб элементарна патрашчаць, пабалбатаць, папляткарыць. Даведацца пра апошнія падзеі з жыцця знаёмых: вяселлі, разводы, зноў сышліся, нарадзілася дзіця, расце, вырасла, закахалася, ужо ўнукі пайшлі — хто б мог падумаць?.. Як я адстала ад жыцця. Нібыта і не жанчына, а так, чалавек. Чалавек-клопат, чалавек-бег па коле, чалавек-пчала. Амаль як у Кафкі...

Але па-жаночаму. Не так, усё-такі з іншым бачаннем пішуць пра сябе жанчыны-пісьменніцы, якія жывуць у Беларусі. Яны пішуць, а іншыя чытаюць. А то яшчэ і глядзяць знятыя паводле іх кніг фільмы. Юлія Ляшко не адзін твор напісала, якім зацікавілася кіно. А цяпер яшчэ і Тамара Лісіцкая напісала гісторыю не на адну серыю. А выдавецтва «Рэгістр» закруціла з іх творамі асобную кніжную серыю «Кінараман».

Кажуць, гэта «жаночая літаратура». Я не разумею, што значыць — жаночая? Літаратура — значыць літаратура, ці не так? У сэнсе — прыходзіць да чалавека ў выглядзе кнігі. Хачу пра гэта пагаварыць з кімсьці. Сама сабе ўсміхаюся, таму што выглядае, амаль як у кіно: «...Вы хочаце пра гэта пагаварыць?..» Не, я дакладна хворая. Але, напэўна, не як жанчына, а як чалавек... Усе навокал (на прэзентацыі) святочныя, вясновыя, летуценныя, узрушаныя, скараюць эмоцыямі. Яны — жанчыны. Гераіні вечарыны, якія ці напісалі кнігі, ці сябруюць з тымі, хто напісаў, ці здымаліся ў фільмах з іх сцэнарам. Прыго-о-ожыя... Я, на адлегласці, падумала, што ўсё гэта не для мяне і не пра мяне. І мне стала сорамна, што я, просты чалавек, апынулася сярод жанчын — і не гатовая быць такой, як яны. О, Божухна! Як я магла не падумаць калі не пра законы прыгажосці, то хоць бы пра карпаратыўную... Не, жаночую салідарнасць. Няўжо я перастала быць жанчынай? А мне пра гэта паспрабавалі нагадаць: руковымі пялёсткамі пад нагамі, келіхам чырвонага віна і сакавітымі яблыкамі, ігрушамі, вінаградам. Сукенкамі і абцасамі. І такімі жаночымі прызнаннямі — пра тое, як можна ўзяць сваё ж жыццё ў свае рукі, як у гэтым жыцці бачыць незвычайнае, адзначаць у ім самыя цікавыя сітуацыі, якія так і просяцца ў кнігі. Рэальна...

Юлія ЛЯШКО, напрыклад, прызналася:

— Правобразам гераіні маёй кнігі «Анёл у цемры» стала актрыса Святлана Бароўская. Яна мяне натхніла сваёй біяграфіяй, сваім характарам, жыццялюбствам, мностам сваіх вартасцяў, якія спалучаюцца ў неверагодных прапорцыях. Так нарадзілася на свет мая гераіня. Падрабязнасцяў яе біяграфіі там шукаць не трэба — працэнтаў на 80 гэта выдуманы персанаж. Але тое, што мне ў Святлане дарагое, тое, чым я захапляюся ў ёй, я ўклала ў гэтую гераіню. Таксама як і аповесць «Рыфмуецца з любоўю», якая таксама ўвайшла ў гэтую кнігу, звязаная нейкім нябачным чынам з актрысай Валерыяй Арланавай, якая потым выканала ролю галоўнай гераіні ў кіно. Гэты вобраз я адразу пісала з разлікам на Валерыю. Яна спалучае для мяне шмат якія якасці: яна танюткая, цудоўная, але ў ёй вельмі моцны ўнутраны стрыжань. Калісьці я працавала над аповесцю «Сяброўка-восень», потым паводле яе знялі фільм. Было зусім смешна: я «замаскіравала» персанаж, біяграфія амаль зусім не супадала з рэальным чалавекам, але калі пайшоў фільм па тэлебачанні, сталі тэлефанаваць ёй дадому і казаць: уключай, там пра цябе кіно паказваюць. Ёсць яшчэ адна асабліваясць маіх кніг — так казалі, калі здымалі фільмы паводле іх, — вельмі шмат жаночых удач здаралася ў здымачных груп, у выканаўцаў галоўных роляў. Усё пачынала атрымлівацца. Спадзяюся, што хоць бы адна мая кніжка прынясе ўдачу таму, каму яна патрапіць у рукі.

— Цудоўны і разумны чалавек, пяшчотны і таленавіты, раптам мне прысвяціў кнігу, — адзначыла **Святлана БАРОЎСКАЯ**. — Што я такое зрабіла?.. Гэта мне вельмі прыемна. Я вельмі ўдзячная Юлі. Але як шукаць падабенства? Малюнак на вокладцы падобны. Эпізод, што я ў дзяцінстве «сакрэцікі» з зіхатлівымі паперкамі хавала пад шкло, — праўда. І тое, што адной дзяўчынцы ў пяць гадоў паабяцала за здрадніцтва: «Ты яшчэ мяне папомніш, бочка дынамітная», — таксама праўда. А астатняе — мастацкі вымысел.

Рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў, які супрацоўнічаў з Юліяй Ляшко, адзначыў, што мужчыны не ўмеюць перадаць такую пачуццёвасць, разуменне, як болем жыць, як жыць радасцю. Для яго гэта і ёсць прыкмета сапраўднай жаночай літаратуры. Выбар яе для кіно можа прынесці поспех: напрыклад, фільм «Рыфмуецца з любоўю» любяць за тое ўспрыманне болю і радасці жыцця і як мінімум раз на два месяцы паказваюць па расійскіх тэлеканалах.

У фільма «Ціхі цэнтр» усё яшчэ наперадзе. Летась паводле другога пасля «Ідыёт так» рамана Тамары Лісіцкай на кінастудыі «Беларусьфільм» знялі чатыры серыі. І каб не сядзець у чаканні, можна ўзяць у рукі кнігу і даведацца, што і да чаго. Тым больш што пасля працы над фільмам аўтарка ўнесла змяненні ў кнігу.

Тамара ЛІСІЦКАЯ:

— Я напісала раман «Ціхі цэнтр» у 2007 годзе. Ён быў вынікам узрушэння, было здзіўленне, часам на мяжы жудасці. Я бачыла прыклады бытавога подзвігу — маленькага, ціхага, але такога магутнага; маленькіх, ціхіх, але такіх магутных здрадаў; маленькага, ціхага, але такога магутнага кахання. Вось таму і з'явіўся раман «Ціхі цэнтр». Гэты раман трапіў у рукі галоўнага рэдактара кінастудыі Наталлі Сцяжко, пачаўся яго новы лёс, новая прыступка біяграфіі. Мы палову года працавалі над сцэнарам з рэжысёрам Рынатай Грыцковай. І тут мы зразумелі неабходнасць трошкі змяніць сюжэт. Палова года шліфовак, трошкі іншага погляду на гісторыю герояў, уцісканне і развіццё некаторых новых ліній... Я зразумела, што нясу адказнасць за тое, каб кніга была лепшай. Таму, можна сказаць, што цяпер выйшла палепшаная версія рамана «Ціхі цэнтр»...

Актрыса Тамара Міронава сыграла ў фільме дворнічыху, маму галоўнай гераіні, «харызматычную алкагалічку». Прызнаецца, што калі прачытала сцэнар, то вельмі хацела сыграць менавіта гэтую ролю:

— Я бачыла такое ў сваім жыцці. Гэта рэальныя персанажы. У фільме павінна быць вельмі шмат цеплыні да людзей. Там няма злосці, і як бы чалавек ні аступаўся, што б ні звалілася на яго бедную галаву, ён захоўвае жаданне быць анёлам. Хоць я ведаю, што ў чалавеку змагаюцца два бакі — цёмны і светлы. Але чамусьці нам хочацца быць анёламі. Мне хацелася гэта перадаць у сваёй ролі.

У кнізе Тамары Лісіцкай адзін з галоўных герояў — горад Мінск. Тое, як апісаны горад, прыцягнула ўвагу галоўнага рэдактара кінастудыі «Беларусьфільм» Наталлі Сцяжко. І яшчэ тое, што ёсць канфлікт, а сама гісторыя цёплая. Але ўсё-такі ў фільме роля горада Мінска не апошняя. Трэба ж паказваць нашу краіну, і чаму б не ў беларускім фільме? Здымаліся куточкі Мінска — мы яго пазнаем, а іншыя ўбачаць. Рэдактар кінастудыі паведаміла, што кампанія АНТ гатовая рабіць прэм'еру на сваім канале. Украінскі канал «Інтэр» збіраецца купляць карціну за добрыя грошы. Аказваецца, вельмі добра бяруць нашы беларускія фільмы, таму што яны на парадак вышэй за тое, што вельмі часта паказваюць расійскія тэлеканалы.

І чытачам такія кніжкі павінны прыйсціся даспадобы, упэўнены ў выдавецтве «Рэгістр»: аб простых рэчах распавядаецца проста і цікава, хоць часам банальнае становіцца прадметам адлюстравання, бо ўсё ж нас акаляе побыт. А галоўнае — эмацыйна. Аўтаркі паказваюць, як мысляць жанчыны, і даюць магчымасць назіраць за гэтым працэсам чытачам. Ці чытачкам? Хоць бы дзеля таго, каб паглядзець на сябе збоку...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Жыццёвінкі

1.

У Васілевічах сеў на дызель, каб вярнуцца дадому — у Гомель. Людзей у вагоне было мала, і кожны з іх займаўся хто чым. Некаторыя пасажыры сядзелі моўчкі, паглядаючы на краявіды за акном, іншыя чыталі, а нехта проста драмаў. Я дастаў газету, толькі разгарнуў яе, і ў гэты самы момант да мяне падсеў дзядок са слоікам у руках.

— На дзіва глянуць не жадаеце? — ён прыўзняў слоік, у якім ляніва плаваў рак. — А?

Сапраўды, гэта было дзіва. Так ужо ў нас атрымалася, што ракі (а яны, як высветлілася пазней, надта далікатныя рачныя асобы) надоўга зніклі ад нас: хімія, што тут паробіш. Ні для каго не сакрэт, што не шкадавалі мы мінеральных тукаў для палёў, а яны, як ты ні старайся адгарадзіць ад іх рэчку, усё ж траплялі ў яе. Ракі звяліся. І вось — дзядок са слоікам, у якім плаваў рак...

— Ну, як? — весела, шчасліва глядзеў ён на мяне.— Паменела ўгнаенняў, і ракі з'явіліся. Значыць, вада ў Дняпры чыстая. Калі ракі жывуць, то яе і піць можна.

Да нас пачалі падыходзіць некаторыя пасажыры, і дзядок са слоікамі з ракам апынуўся ў цэнтры ўвагі. Ён хваліўся, што рака злавіў сам, і не аднаго — астатніх пакінуў унукам, а гэтага, самага большага, вязе ў горад напаказ.

Больш шчаслівага чалавека, чым той стары з ракам, я доўга потым не бачыў.

2.

Прыгадался неяк...

Малочнатаварная ферма. У мяне тут літаратурнае выступленне, ці так бы мовіць, сустрэча з чытачамі. Чакаем разам са старшынёй у цесным пакойчыку — чырвоным кутку — калі збярэцца даяркі. Прыходзяць, садзяцца. Старшыня калгаса дастаў тым часам з кішэні невялічкі карабок, паклаў перад сабой на стол, сабраўся, як мне падалося, з думкамі, крэкнуў, пастараўся ўсміхнуцца, ціха сказаў:

— Жанчыны, сёння ў нас імянінніца. Хто б вы думалі? Не здагадаецеся?

Па тварах даярак прабегла ажыўленне, яны пераглянуліся, некаторыя пацяснулі плячыма: а хто, сапраўды?

— Вера Сяргееўна...

Усе адразу паглядзелі на бабульку, шчупленькую, маленькага расточку, з густымі дробнымі маршчынкамі на твары: яна забілася ў куток, здзіўлена паглядала то на старшыню, то на сябровак — таксама, відаць, не разумела. Якая яна імянінніца? Толькі ж вунь, праўда, карабок на стале... Медаль хіба старшыня прывёз? Хадзілі чуткі. Ёй, значыць...

Пад воплескі старшыня прышпіліў Веры Сяргееўне медаль да жакеціка, паціснуў руку.

— Малайчына ты, Вера Сяргееўна, — сказаў старшыня.— Малайчына. Даўно працуеш на ферме. Тваім рукам, дарагая ты наша, цаны няма. Маладзейшыя не помняць, як працавалася тады на ферме. Цяпер — што? Апарат падключыў... Ведаеце самі, як цяпер... Ну што ж, дазволь цябе яшчэ раз павіншаваць з медалём «Ветэран працы», Вера Сяргееўна...

Бабулька ж, на маё здзіўленне, не радавалася. А потым і зусім захлімкала, сарамліва выціраючы далонню твар. Старшыня адчуў сябе крыху ніякавата, пераглянуўся з даяркамі: медаль уручылі, святочная хвіліна, а што гэта з нашым ветэранам? Радавацца б!

А бабулька дрыготкімі вуснамі шаптала:

— Гэта ж, старшынёк, кароўка адна мая згубілася... ага... У лесе... Лыска... З малаком ходзіць, бедненькая... Шукала, шукала... Ага... Не адгукаецца...

3.

Універсам. Ён у невялікім раённым гарадку, пра які звычайна гавораць: на адным рагу слова скажаш — на другім пачуюць. Час вячэрні, за вокнамі шэра, імжыць дождж. Што мяне, новага чалавека, у гарадку здзівіла, дык тое, што каля адной касы людзей багата, хоць у вузел завязвай, а каля другой — нікога. Пытаюся ў жанчыны, чаму так?

МЫ

— Тая, расфуфыраная, ні за што цябе абразіць можа. І прычэпіцца да рознай дробязі. Таму ўсе ў гэтую касу ідуць. Ніхто не хоча настрой сабе псаваць. Гаварылі, і не раз, загадчыцы, толькі, дзіўна, — сядзіць як сядзела... Бы манекен... Цяпер хоць і ўсміхацца пачне, а да яе не стану... Лепш у чарзе пастаю. Вунь, вунь — зноў спрачаецца з пакупніком. Не наш ён, камандзіровачны, я сваіх тут усіх ведаю...

4.

Ліст ад сына адзінокі дзядзька Мітрафан атрымаў на нейкае свята. Стары быў пад добрай «мухай» і, пакалекі жыў адзін і не было яму каму пахваліцца радасцю, хадзіў з хаты ў хату, трос перад суседзямі кашчавай рукой:

— Пісьмо! Ад Сашкі! Жэніцца, каб яму! Гарадскую, відаць, мымру там абкруціў! Вось вам і Сашка! А вы з садоў яго ганялі! А-а-а! — і жартаўліва грозіў аднавяскоўцам жоўтым ад папяроснага дыму пальцам. — На вяселле заве. Паеду! А як жа — абавязкова-а!.. Паеду-у!..

На вяселле Мітрафан не паехаў, на другі дзень ён і ўвогуле пра яго не ўспамінаў. Так і цягнуліся дні. І раптам прыходзіць яшчэ адно пісьмо. Мітрафан на гэты раз быў цвярозы і ўжо не хадзіў па хатах, а толькі бурчэў сабе пад нос:

— Ён жа халасцяк, Сашка. А як зразумець — «павіншуй з унукам»? Цьфу!

Пазней Мітрафан знайшоў выпадкова тое пісьмо. І жахнуўся: «Яна ж, гарэлка, і не тое можа зрабіць з чалавекам. Адзінага сына людску жаніць не атрымалася...». Выцер слязу.

З таго дня не п'е. Ні кроплі.

5.

Марфу Мікалаеўну я ведаю даўно. Жыве яна з мужам, Васілём Трафімавічам, сынам, нявесткай і ўнукамі. Не ў Беларусі жыве цётка Марфа — у далёкай ад нас Удмурціі, пад Іжэўскам. Я нярэдка бываю там у жончыных сваякоў і абавязкова заходжу да Глездзянёвых — такое прозвішча ў гэтай дружнай сям'і. Гасцінныя яны людзі. Мёд на стол, чырванабокія яблыкі, ягады са свайго агародчыка і абавязкова круглы бохан хлеба. З печы. І колькі я не бываў у іх, ніколі не бачыў, каб падавалі хлеб да стала з крамы (а крама насупраць, вокны ў вокны, і хлеб прывозяць рэгулярна). А вось Марфа Мікалаеўна аддае перавагу свайму.

Аднаго разу да Марфы Мікалаеўны, пахвалілася яна мне, завітаў кіраўнік раёна.

— Ехаў побач і чую духмяны пах хлеба. Сама, значыць, Марфа Мікалаеўна, выпякаеш? Малайчына. А мне дзяцінства ўспомнілася. Мама... А мы, малеча, каля печы таў

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Казярогі мусяць кантраляваць эмоцыі, а Блізнятам трэба быць асцярожнымі

ВАЕН. Авены будуць знаходзіцца ў цэнтры ўвагі і падзей. У панядзелак адчуюць прыліў новых жыццёвых сіл, свежых ідэй для творчага самавыяўлення. Аўторак абяцае поспех многім пачынанням, дзень таксама добры для сяброўскіх стасункаў і знаёмстваў. А вось на сераду і суботу лепш нічога сур'ёзнага не планаваць, бо абставіны могуць рэзка змяніцца. У нядзелю, хутчэй за ўсё, абвострыцца інтуіцыя, якая дазволіць паспяхова справіцца з назапашанымі праблемамі — у тым ліку і тымі, што здаваліся невырашальнымі. Інтэлектуальныя заняткі і гульні ў гэты перыяд прынясуць сапраўднае задавальненне.

ЦЯЛЕЦ. Давядзецца выйсці за рамкі звыклага асяроддзя, каб лепш зразумець сітуацыю, якая склалася, і ўбачыць далейшыя перспектывы. Больш увагі надавайце прафесійным абавязкам. У панядзелак не варта спяшацца з падпісаннем новых дамоў. У сярэдзіне тыдня можаце апынуцца перад выбарам новага шляху для сваёй кар'еры. Не даводзьце сябе да ператамлення: ёсць немалая верагоднасць, што здароўе можа падвесці. У нядзелю варта трохі расслабіцца і выбраць пасіўны адпачынак.

БЛІЗНЯТЫ. Могуць спатрэбіцца асцярожнасць, цярпенне і вера ў сябе і сваю шчаслівую зорку. З'явіцца спрыяльны шанц выкарыстаць сяброўскія сувязі або памяняць працу, аднак для гэтага давядзецца прыкласці максімум намаганняў. У гэты перыяд асцерагайцеся людзей, якія здольныя паўплываць на ваш пункт гледжання. У чацвер не ўлазьце ў канфлікты на працы і не вядзіце доўгіх дыскусій з начальствам. У выхадныя паспрабуйце выбрацца ў гасці да сяброў або запрасіце іх да сябе.

РАК. Каб не расчароўвацца ў выніках сваёй дзейнасці, не спрабуйце плыць супраць цячэння. Калі вам так ужо хочацца вылучыцца з натоўпу — праяўляйце арыгінальнасць, але сцеражыцеся агаломшыць шаноўную публіку. Тыдзень надзвычай спрыяльны для творчых заняткаў, якія патрабуюць адзіноты, а рэклама ўласнай персоны не спатрэбіцца і не рэкамендуецца. Перш чым пачынаць нешта новае, пераканайцеся: тое, што вы лічыце скончаным, сапраўды даведзена да розуму? Не пакідайце недаробак. Цяпер вы на грэбні хвалі, але пры гэтым не забывайце дапамагаць іншым. У чацвер знайдзіце час для таго, каб застацца са сваімі думкамі сам-насам.

ЛЕЎ. Вам неабходны свежы погляд на падзеі, якія адбываюцца вакол. Можаце сутыкнуцца з загружанасцю тэрміновымі справамі, стомленасцю і стрэсамі. Давядзецца папрасіць дапамогі — самастойна, хутчэй за ўсё, тут не справіцца. Імкніцеся выкарыстаць любую магчымасць для адпачынку, аднаўляйце свой энергетычны патэнцыял. У аўторак нядрэнна знайсці час для генеральнай прыборкі свайго жылля. Паспрабуйце менш гаварыць і больш слухаць. Нават удзельнічаючы ў спрэчках, захоўвайце нейтральную пазіцыю.

ДЗЕВА. Вельмі важна праяўляць ініцыятыву і ўсяляк дэманстраваць сваю актыўнасць. Асабліва карыснымі такія паводзіны будуць для кар'ернага росту. Можа з'явіцца магчымасць для вандроўкі, якая прынясе новыя знаёмствы — не выключана, што і рамантычныя ў тым ліку. Самым складаным днём будзе панядзелак. У сераду не варта расслабляцца на працы, бо верагодна адказнае даручэнне, якое перашкодзіць скончыць бягучыя справы, адкладзеныя «на потым». Лепшы дзень для вырашэння сур'ёзных праблем — пятніца.

ШАЛІ. У вас засталіся нявырашаныя праблемы? Пажадана па меры магчымасці справіцца з імі, каб не валачы за сабой цяжкі груз недаробленага. Неабходны актыўная дзейнасць і самадысцыпліна — ад гэтых якасцяў залежаць новыя перспектывы. Няўважлівасць можа прывесці да няпамятлівасці і спазненняў: каб гэтага пазбегнуць, усю важную інфармацыю лепш дзе-небудзь запісваць, пажадана — на бачным месцы. Найбольш спрыяльны дзень — серада, неспрыяльны — нядзеля.

СКАРПІЁН. Вашы намаганні будуць узнагароджаныя, а ідэі пачнуць прыносіць выдатны плён, таму што надышоў час атрымання вынікаў. Ваш аўтарытэт на высокім узроўні, таму навакольныя будуць прыслухвацца і прасіць парады. Было б нядрэнна, калі б атрымалася прымусіць сябе не спыняцца на дасягнутым і паступова ажыццяўляць астатнія выдатныя ідэі. Пажадана рацыянальна выкарыстаць сілы і дазаваць нагрузку на працы. Праўда, дома вас могуць недаацэньваць, але гэта не падстава для засмучэння. Правядзіце выхадныя ў сяброўскай кампаніі — і не пашкадуеце аб гэтым.

СТРАЛЕЦ. Самы час высветліць сутнасць назапашаных праблем. У панядзелак варта падумаць аб сваіх перспектывах і, вызначыўшыся, спакойна і метадычна дзейнічаць. Ёсць рэальны шанц стаць гаспадаром становішча. Творчы настрой у чацвер дазволіць здзівіць свежымі ідэямі сяброў або калегаў. У сярэдзіне тыдня адносіны з блізкімі людзьмі могуць здацца не такімі ўжо бясхмарнымі, але да выхадных хмары рассеюцца, і вы выдатна праведзяце час у сямейным коле.

КАЗЯРОГ. Калі ў вас бурляць горным струменем пачуцці і эмоцыі, то адной з галоўных задач тыдня будзе навучыцца імі кіраваць. Стрыманы падыход і прадуманыя крокі дазволяць пазбавіцца ад цяжару непатрэбных і дакучлівых праблем. Стрыманасць, аднак, не азначае замкнёнасці — не варта хаваць сябе і свае таленты ў чатырох сценах. На працы неабходна выбраць правільную стратэгію, якая апынецца гарантыяй вашай паспяховасці. Час схіляе да ўдасканалення прафесійных ведаў або засваення якой-небудзь сумежнай прафесіі. Не варта спяшацца са зменай месца працы.

ВАДАЛЕЙ. Самая лепшая тактыка — чакальная. Заставайцеся сабой у любой сітуацыі, захоўвайце спакой і душэўную раўнавагу нават у самых складаных абставінах. У прафесійных справах пажадана пазбягаць самаўпэўненасці, асабліва ў рызыкоўных прадпрыемствах. Тыдзень можа ссунуць з мёртвага пункта многія пытанні, у тым ліку і даўно набалелыя. Неабходна пабудаваць правільны план дзеянняў, які будзе спрыяць пасоўванню па кар'ернай лесвіцы і паляпшэнню вашага матэрыяльнага становішча. У дзелавым плане тыдзень спрыяльны для сустрэч, нарадаў і распрацоўкі планаў на будучыню. Верагодныя прыемныя неспадзеўкі.

РЫБЫ. Мабільнасць і кантактнасць дазволяць справіцца з досыць складанымі праблемамі. У першай палове гэтага перыяду вам неабходна рэалізоўваць свае творчыя задумы. У аўторак сябры дапамогуць вам у сітуацыі, якая склалася. У сераду лепш не прад'яўляць прэтэнзій або патрабаванняў да начальства, бо гэта прывядзе да канфліктнай сітуацыі. Не грэбуйце інфармацыяй, якая паступіць да вас у пятніцу. Да суботы верагодныя знаёмствы з цікавымі і ўплывовымі людзьмі — не прапусціце свой шанц, выкарыстайце гэтую магчымасць. У пятніцу і суботу пажадана паступова завяршаць пачатыя справы, не забываючыся нават пра малаважныя дробязі. Нядзелю паспрабуйце прысвяціць адпачынку.

БЕЗ АЭС НАМ НЕ АБЫСЦІСЯ

Будаўніцтва сваёй атамнай электрастанцыі — гэта якасна новы скачок для нашай краіны. Гэта абсалютна новыя тэхналогіі, якія прыходзяць на Беларусь, развіццё новай галіны нацыянальнай эканомікі, новы ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Стварэнне такога аб'екта, як АЭС, пацягне за сабой развіццё пэўных галін прамысловасці, развіццё рэгіёна і інш. Пра гэта расказаў журналістам намеснік міністра энергетыкі Міхаіл МІХАДЗЮК.

Ён нагадаў, што наша дзяржава не валодае ў дастатковай колькасці ўласнымі паліўна-энергетычнымі рэсурсамі. Доля ўласных ПЭР у агульным балансе рэспублікі складае 20,6 працэнта. У 2005-м яна раўнялася 16,8 працэнта. У краіне праводзіцца вялікая праца, скіраваная ў першую чаргу на прыцягненне ў паліўны баланс мясцовых і альтэрнатыўных відаў паліва. У 2015 годзе гэтая доля павінна дасягнуць 31 працэнта, а да 2020 — 33,6 працэнта.

Доля прыроднага газу ў электраэнергетыцы краіны летась склала 96 працэнтаў. Менавіта рост цэн на гэты від паліва абумоўлівае высокія тарыфы, дадаў намеснік міністра. У валавым спажыванні ПЭР газ у рэспубліцы за мінулы год склаў 63,4 працэнта, а ў аб'ёме кацельна-пячнога паліва — 89,3 працэнта.

— Не шмат краін свету мае такую сітуацыю па энергетычных рэсурсах. Усё гэта аказвае істотны ўплыў на ўзровень энергетычнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. І далейшае захаванне такога становішча, асабліва ва ўмовах сусветнай інфляцыі і з улікам росту цэн на імпартныя энергарэсурсы, становіцца для нашай краіны небяспечным фактарам, які ўплывае на яе ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё. У цэлым сусветная супольнасць уступіла ў паласу дэфіцыту і значных структурных зрухаў у спажыванні ПЭР.

Праграмныя дакументы, якія сёння рэалізуюцца ў нашай дзяржаве — канцэпцыя энергетычнай бяспекі, Дырэктыва №3 і інш. — скіраваны на павышэнне энергетычнай бяспекі. Асноўныя кірункі — энергазберажэнне, развіццё і мадэрнізацыя энергетычных магутнасцяў рэспублікі за кошт укаранення самых сучасных высокаэфектыўных тэхналогій. Паводле слоў Міхаіла Міхадзюка, у перспектыве плануецца знізіць удзельныя затраты паліва на выпрацоўку адной кілават-гадзіны электраэнергіі на 25-30 грамаў. Ужо сёння ў цэлым па краіне яны ніжэй, чым у Расіі. Наша энергетычная палітыка скіравана на дывэрсіфікацыю паліўна-энергетычнага балансу краіны за кошт максімальнага задзейнічання мясцовых відаў паліва і аднаўляемых крыніц энергіі. Прыняты шэраг праграм: па торфе, каменным і бурым вугалі, біягазе, развіццю гідраэнергетыкі, нетрадыцыйнай энергетыцы і інш. Аднак асноўны важкі элемент дывэрсіфікацыі — развіццё ядзернай энергетыкі. Атамная электрастанцыя дазволіць замясціць 5 млрд кубоў прыроднага газу з 22 млрд, якія спажываюцца рэспублікай.

У Беларусі актыўна вядзецца ўкараненне сучасных энергазберагальных тэхналогій ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Ёсць поспехі ў зніжэнні энергаёмістасці нашага валавога ўнутранага прадукту, але, разам з тым, па спажыванні энергіі на адзінку ВУП мы яшчэ не выйшлі на ўзровень заходніх краін.

Як бы мы ні намагаліся, але запасаў карысных выкапняў, мясцовых відаў паліва і аднаўляльных крыніц энергіі ў нас недастаткова для пакрыцця патрэб краіны і павышэння ўзроўню энергетычнай бяспекі, патлумачыў намеснік міністра энергетыкі. Без атамнай электрастанцыі нам не абысціся.

Інга МІНДАЛЁВА.

ПАЛЁТЫ — ПА ЛЕТНІМ РАСКЛАДЗЕ

Паветраныя судны Нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» перахадзяць на палёты па летнім раскладзе. Па ім яны будуць лятаць з 27 сакавіка па 29 кастрычніка.

Паводле інфармацыі прэс-службы авіякампаніі, у новай версіі карты палётаў дабавілася некалькі новых напрамкаў. У першы дзень чэрвеня адкрыецца рэгулярная лінія Мінск — Хельсінкі — Мінск. На новым рэйсе, які будзе выконвацца тройчы ў тыдзень, будуць эксплуатавацца самалёты CRJ — 100/200, што дазволіць перавозіць да 50 пасажыраў з абслугоўваннем па бізнэс і эканом-класах. У аэрапорце Мінска новы напрамак будзе састыкоўвацца з маршрутамі авіякампаніі ў Екацярынбург, Ерэван, Маскву і Тбілісі. Прапрацоўваецца пытанне арганізацыі транзітных перавозак праз Хельсінкі ў аэрапорты Скандынавіі, Паўднёва-Усходняй Азіі, Паўночнай Амерыкі.

З 10 чэрвеня карта палётаў авіякампаніі папоўніцца новым напрамкам Калінінград — Брэст. Пасажыры «Белавія» атрымаюць магчымасць адпраўляцца ў Калінінград, не выкарыстоўваючы транзітную візу.

Традыцыйна ў летнім раскладзе з'явяцца Ганавер, Манчэстар, Сочы. А таксама транзітная лінія Германія — Казахстан (Астана, Кустанай, Паўладар, і новы напрамак — Караганда) са стыкоўкай у аэрапорце ў Мінску. Будзе ў раскладзе і кірунак Мінск — Ашхабад — Мінск, які адкрыўся ў снежні.

У летнім сезоне адновяцца палёты ў Сімферопаль, якія авіякампанія не выконвала некалькі апошніх гадоў. Першы рэйс адбудзецца 17 чэрвеня, далей — кожныя аўторак і пятніцу да 20 верасня.

Будзе павялічана частата палётаў прамых і транзітных рэйсаў па ўжо існуючых напрамках: Баку, Батумі, Варшава, Калінінград, Ларнака, Парыж, Прага, Санк-Пецярбург, Стакгольм, Тэгеран, Тэль-Авіў, Франкфурт.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Факт

Адна гадзіна дзеля Зямлі

Сусветны фонд дзікай прыроды праводзіць у апошнюю суботу сакавіка Гадзіну Зямлі. З 20.30 да 21.30 па мясцовым часе прапануецца выключыць святло ў сваіх дамах, кватэрах і гд. Акрамя таго, гучыць заклік наогул эканоміць электраэнергію, берагчы ваду, радзей выкарыстоўваць аўтамабілі, здаваць у перапрацоўку макулатуру і іншыя адходы.

Паводле справаздачы Фонду ААН у галіне народанасельніцтва, за перыяд з 1880 года дзесяць самых цёплых гадоў прыпадаюць на апошнія 13 з іх. Кліматолагі ва ўсім свеце звязваюць нядаўняе пацяпленне з парніковымі газамі, якія выкідваюцца ў атмасферу ў выніку дзейнасці людзей, чый дабрабыт узрастае. З-за павелічэння аб'ёмаў спальвання вугалю, нафты і газу, у атмасферу трапляе ўсё большая колькасць двувокісу вуглероду, што ўзмацняе і паскарае «парніковы эфект».

Святлана БАРЫСЕНКА.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МИНСКСОРТСЕМОВОЩ»

Адрес: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.

Основные виды деятельности: оптовая и розничная торговля

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 года *млн руб.*

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
АКТИВ			
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	4565	5926
Нематериальные активы	120	3	1
Итого по разделу I	**190**	**4568**	**5927**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	8837	10 361
в т. ч. сырье, материалы и др. активы	211	649	647
расходы на реализацию	214	134	195
готовая продукция и товары для реализации	215	6608	8102
товары отгруженные	216	1238	1303
расходы будущих периодов	218	208	94
Налоги по приобретенным ценностям	220	217	328
Дебиторская задолженность	240	2029	2842
Денежные средства	260	339	723
Финансовые вложения	270	12	12
ИТОГО по разделу II	**290**	**11 434**	**14 266**
БАЛАНС		**16 002**	**20 193**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	214	214
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	-	1006
Резервный фонд	420	260	260
Добавочный фонд	430	5931	7181
Нераспределенная прибыль	450	5930	9443
Доходы буд. периодов	470	1778	2283
ИТОГО по разделу III	**490**	**14 113**	**18 375**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Кредиторская задолженность	620	1886	1815
Задолженность перед учредителями	630	3	3
ИТОГО по разделу V	**690**	**1889**	**1818**
БАЛАНС		**16 002**	**20 193**

Дивиденды, приходящиеся на одну акцию за 2010 год — 1903,7 руб.
Количество акционеров всего — 1037, в т. ч. юридических лиц — 1.
Среднесписочная численность работающих — 175 чел.
Данные бухгалтерской отчетности подтверждены аудиторской проверкой.
Руководитель: Черняк Анатолий Иосифович
Гл. бухгалтер: Островская Людмила Николаевна

УНП 600052664

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН серии БА № 0035935--0035940, № 0035933, № 0043139; серии ПТ № 0527506--0527507, № 0527788, № 0530230; по гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии ВС № 2885995, № 2439727; квитанцию формы 1-СУ серии КС № 0703550 **считать недействительными**.

УНП 100357923

ОАО «ДРОЖЖЕВОЙ КОМБИНАТ»

Учетный номер плательщика: **УНП 100104781**
Вид деятельности: **производство дрожжей**
Орган управления: **КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220030, г. Минск, ул. Октябрьская, 14**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2010 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость (01)	101	25321	28664
амортизация (02)	102	7904	9640
остаточная стоимость	110	17417	19024
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость (04)	111	7	5
амортизация (05)	112	2	2
остаточная стоимость	120	5	3
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость (03)	121		
амортизация (02)	122		
остаточная стоимость	130		
Вложения во внеоборотные активы (07,08)	140	879	1128
в том числе: незавершенное строительство (08)	141	465	540
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	18301	20155
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	14525	12277
в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы (10,15,16)	211	4925	2763
животные на выращивании и откорме (11)	212		
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты (20,21,23,29)	213		
расходы на реализацию (44)	214	220	51
готовая продукция и товары для реализации (40,41,43,44)	215	729	2234
товары отгруженные (45)	216	7729	6451
выполненные этапы по незавершенным работам (46)	217		
расходы будущих периодов (97)	218	922	778
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам (18,76)	220	3281	3355
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230		
в том числе: покупателей и заказчиков (62)	231		
прочая дебиторская задолженность (60,76)	232		
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	455	1000
в том числе: покупателей и заказчиков (62)	241		
поставщиков и подрядчиков (60)	242	177	601
по налогам и сборам (68,69)	243	55	179
по расчетам с персоналом (70,71,73)	244	9	37
разных дебиторов (76)	245	214	183
прочая дебиторская задолженность	249		
Расчеты с учредителями (75)	250	1	1
в том числе: по вкладам в уставный фонд (75)	251	1	1
прочие (75)	252		
Денежные средства (50,51,52,55,57)	260	189	153
в том числе: денежные средства на депозитных счетах (55)	261		
Финансовые вложения (58)	270	58	59
Прочие оборотные активы (79,94)	280	276	943
ИТОГО по разделу II	290	18785	17788
БАЛАНС (190+290)	**300**	**37086**	**37943**
ПАССИВ	**Код строки**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд (80)	410	3967	4367
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81)	411		
Резервный фонд (82)	420	37	37
в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	37	37
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422		
Добавочный фонд (83)	430	6399	8562
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99)	440	X	X
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) (84)	450	-13427	-14990
Целевое финансирование (86)	460	393	668
Доходы будущих периодов (98)	470		
ИТОГО по разделу III	490	-2631	-1356
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы (67)	510	13855	15853
Прочие долгосрочные обязательства	520	264	168
ИТОГО по разделу IV	590	14119	16021
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	610	5114	4488
Кредиторская задолженность	620	20482	18788
в том числе: перед поставщиками и подрядчикам (60)	621	19554	17361
перед покупателями и заказчиками (62)	622	54	220
по расчетам с персоналом по оплате труда (70)	623	312	386
по прочим расчетам с персоналом (71,73)	624	5	5
по налогам и сборам (68)	625	439	634
по социальному страхованию и обеспечению (69)	626	44	88
по лизинговым платежам (76)	627	41	
перед прочими кредиторами	628	33	94
Задолженность перед участниками (учредителями) (75)	630	2	2
в том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	2	2
прочая задолженность	632		
Резервы предстоящих расходов (96)	640		
Прочие краткосрочные обязательства (79)	650		
ИТОГО по разделу V	690	25598	23278
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**37086**	**37943**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701		
краткосрочная кредиторская задолженность	702	20441	18788

АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	615	613
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002		
Материалы, принятые в переработку	003		
Товары, принятые на комиссию	004		
Оборудование, принятое для монтажа	005		15
Бланки строгой отчетности	006		4
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007		
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008		
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009		
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	3085	3484
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011		30
Нематериальные активы, полученные в пользование	012		
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013		
Потеря стоимости основных средств	014		
Товары, отгруженные в отпускных ценах	015	7729	7538
Имущество, находящееся в совместном владении	016		
Именные приватизационные чеки «Имущество»	017		
Материалы, оборудование, принятые (переданные) в рамках гарантийных обязательств	018		

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	27970	24081
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	2551	2522
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	25419	21559
СПРАВОЧНО (из строки 010): Сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	19550	19963
Валовая прибыль (020-021-030)	040	5869	1596
Управленческие расходы	050		
Расходы на реализацию	060	571	326
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	5298	1270
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	1651	824
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	55	99
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	1596	725
в том числе: проценты к получению	091	1	
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092		
доходы от операций с активами	093	125	
прочие операционные доходы	099	1470	725
Операционные расходы	100	3629	962
в том числе: проценты к уплате	101	2067	
расходы от операций с активами	102	91	
прочие операционные расходы	109	1471	962
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	-2033	-237
III.ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	954	248
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	4	8
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	950	240
Внереализационные расходы	150	4618	2578
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-3668	-2338
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160)	200	-403	-1305
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	5219	2464
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	706	
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+210-220)	240	4110	1159
Налог на прибыль	250	874	283
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	243	404
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	43	361
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	-1563	-2353
СПРАВОЧНО (из строки 300): Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310		
Прибыль (убыток) на акцию	320		
Количество прибыльных организаций по конечному финансовому результату	330		0
Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату	330А		0
Количество убыточных организаций по конечному финансовому результату	340	1	1
Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату	340А	1563	2353

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
Наименование	Код	Доход	Расход	Доход	Расход
1	2	3	4	5	6
Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании	350	27	280		6
Прибыль (убыток) прошлых лет	360				
Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств	370				
Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте	380	710	1165		65
Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности	390	187	1068	215	9
Прочие доходы и расходы	400	26	2105	25	2498
ИТОГО	**500**	**950**	**4618**	**240**	**2578**

Руководитель **И.П. Забаштанский**
Главный бухгалтер **О.В. Ладнева**

г. ВИТЕБСК **29.04.2011**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 20 %

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Неиспользуемое здание склада грузового прирельсового с рампой, расположенного по адресу: Шумилинский район, г.п. Шумилино (ст. Шумилино, 569 км-570 км), ул. Вокзальная, 15/3, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 203/С-16381 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бетонный, крыша шиферная, общая площадь 262,3 кв.м. Назначение – здание склада грузового прирельсового с рампой. Земельный участок: с кадастровым номером 225855100002000001 площадью 0,0765 га для обслуживания недвижимого имущества с возможным использованием его под объект, предназначенный для оказания услуг, производства товаров, выполнения работ или под объект торговли, сроком аренды 50 лет.	55039061	5503900
2	Здание растворобетонного узла с деревянной галереей, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, промышленная зона, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 252/С-10275 (здание специализированное обрабатывающей промышленности), трехэтажное кирпичное, частично деревянное, общая площадь 360,9 кв.м, объем 2016 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие – железобетонные плиты, крыша рулонная. Земельный участок: с кадастровым номером 241800000009002107, площадь 0,0438 га, для содержания и обслуживания растворобетонного узла, сроком аренды 20 лет. Использование – под объект административного, производственного, коммунально-хозяйственного назначения.	208515696	20851560

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: по ЛОТУ № 1 – Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», тел. (0212) 37 88 87; по ЛОТУ № 2 – Витебское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Витебскэнерго», телефон в Витебске (0212) 47 52 99.

Условия предоставления земельных участков:

Лот № 1: заключение победителем аукциона с Шумилинским райисполкомом договора аренды земельного участка, осуществление государственной регистрации права на земельный участок, получение свидетельства о государственной регистрации права на земельный участок в течение двух месяцев после получения решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий один год; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Лот № 2: заключение победителем аукциона с Новополоцким горисполкомом договора аренды и в двухмесячный срок после его заключения осуществление государственной регистрации прекращения права Витебского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Витебскэнерго» на земельный участок и возникновение права на земельный участок; получение победителем аукциона, в случае изменения назначения недвижимого имущества (растворобетонный узел), в установленном порядке разрешения Новополоцкого горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.

Аукцион состоится 29.04.2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, а также консолидированные участники – два и более суб

Кропка на планеце

ВЫГАНАШЧАНСКІЯ «ДАКІ»: ЖЫЦЦЁ ПАД «ПРЫЦЭЛАМ»

Даўгачасовыя агнявыя кропкі («дакі», па-руску «доты») у вёсцы Выганашчы аказаліся надзвычай даўгавечнымі. Хутка споўніцца сто гадоў, як яны з'явіліся ў гэтай багністай мясціне, а ім хоць бы што. Як толькі з імі не змагаліся, для чаго толькі не прыстасоўвалі, нават падкопвалі і ўзрывалі. А яны як новенькія.

26° 16" усх. даўж.
52° 40" паўн. шыр.

«Нічога ім не робіцца, — кажуць пра гэтыя жалезабетонныя ўмацаванні мясцовыя жыхары і дадаюць: цяпер так будаваць не ўмеюць. І маюць рацыю.

Ніхто дакладна не ведае, колькі дакаў у Выганашчах — восем, дзесяць ці дванаццаць. За стагоддзе яны сталі не толькі неад'емнаю часткаю вясковага ландшафту, але і часткаю самога жыцця. Куды хто ідзе ці едзе, за ім сочаць чорныя праёмы амбразур.

«Жывём нібы пад якім прыцэлам», — кажуць жанчыны, вяртаючыся ў нядзелю з царквы. Калі браць за розніцу паміж пакаленнямі дваццаць пяць гадоў, дык не цяжка падлічыць, што чатыры выганашчанскія генерацыі прайшлі праз тутэйшыя агнявыя кропкі, сталелі сярод, у і на даках.

— У іх мы гулялі ў вайну і рэзалі ў дурня, хаваліся ад бацькоў, стралялі з рагатак, курылі, палілі вогнішчы, — расказваюць мужчыны, якім цяпер пад шэсцьдзясят.

Цяпер у насельніцтва цікавасці да гэтых шэрых і зусім не прыветлівых на выгляд канструкцый мала. Бо збяднела вёска на моладзь і дзяцей. Да таго ж у сярэдзіне дакаў шмат смецця, вільготна, непрыемны пах, цёмна.

На думку карэнных жыхароў, усе дакі былі ўзведзены нямецкай арміяй падчас Першай сусветнай вайны ў 1915 годзе. Іх ставілі праз кожныя 400-500 метраў уздоўж Агінскага канала ад Выганашчанскага возера да ракі Ясельды. Выганашчы стаялі першымі на гэтым стратэгічным шляху. І выглядалі, напэўна, значна сур'ёзней, чым цяпер. Невыпадкова на кожным скрыжаванні былі гэтыя магутныя ўмацаванні.

Але вайны тут не было і па прызначэнні дакі ніколі не выкарыстоўваліся. Затое прыйшліся дарэчы ў цывільным жыцці. У адным з іх быў калгасны склад ГЗМ, у другім хаваліся ад дажджу рыбакі, у трэцім гаспадарскі склеп і паветка. Яшчэ адзін служыў складам вясковай крамы, як у склепе, у ім захоўваліся селядцы, газа, цукеркі. 53-гадовы жыхар распавёў, як у дзяцінстве з сябрам зрабілі падкоп пад дзвярыма дака і паціху цягалі цукеркі. Пакуль іх не высачылі і не пакаралі цяганнем за вушы і папругаю па азадках.

Па адным з колішніх дакаў цяпер праходзіць дарога на возера. Калі не падкажуць, нізавошта не здагадаешся, што пад тваімі нагамі бетонны маналіт. Як і пра той, над якім узвышаецца курган Славы. Вяскоўцы не робяць таямніцы з таго, што помнік загінулым землякам на апошняй вайне быў усталяваны менавіта над нямецкім дакам, засыпаным пяском, і прастаяў там даволі доўга, пакуль народнае абурэнне не дайшло да кіраўніцтва. Шыльду з імёнамі пазней перанеслі на абеліск да сельсавета, а курган з голым помнікам пад зорачкай так і застаўся на вышыні. Як апафеоз праклясці ўсім войнам.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.
Івацэвіцкі раён.

Алесь КУШНЕР, дырэктар турыстычнага агенцтва:

«У БЕЛАРУСІ ЛЮДЗІ ДОБРЫЯ, АДНАК СЭРВІС — ДРЭНЬ»

Егіпет і Туніс пакуль застаюцца небяспечнымі для наведвання турыстаў, у Турцыі таксама нестабільна. І турыстычным аператарам даводзіцца круціцца і вынаходзіць новыя, часам зусім нечаканыя шляхі. Ці будуць валіць валам турысты ў Беларусь і што гэтаму можа перашкодзіць, «Звязда» высвятляла ў Алеся Кушнера, дырэктара турыстычнага агенцтва «Гісторыя-Тур».

— Да 2015-га года Міністэрства спорту і турызму планує росту прыбытку ад турыстычных паслуг у тры з паловай разы. Многія кажуць, што гэта немагчыма. На ваш погляд, ці ёсць у нас шанц, тым больш у сувязі з праблемамі на папулярных маршрутах — такіх, як Егіпет, напрыклад?

— Можна запраграмаваць і ў 10 разоў павялічыць прыток турыстаў. Прагназаваць можна ўсё што заўгодна, але ёсць рэалii тых, хто піша, і тых, хто выконвае. Я магу сказаць, што прыток турыстаў, а адпаведна і прыбыткі, можна павялічыць пры трох умовах. Калі на тэрыторыі Беларусі будзе створаны нармальны еўрапейскі сэрвіс, які ўключае пражыванне, харчаванне і набор усіх астатніх турыстычных паслуг. Гэта раз. Аднаўленне архітэктурных помнікаў, за наведванне якіх замежнікі будуць плаціць грошы. Гэта два. І трэцяе пытанне — візы. Калі гэтыя тры пытанні на дзяржаўным узроўні будуць вырашаны, то магчыма павялічыць і ў тры, і ў пяць, і ў сем разоў і колькасць турыстаў, і пакінутых імі ў Беларусі грошай. Ва ўсіх астатніх выпадках гэта застанецца толькі марай. Таму што, па вялікім рахунку, калі параўноўваць нас з іншымі еўрапейскімі краінамі, то мы значна саступаем па ўсіх паказчыках — я кажу зараз пра ўязны турызм. Бо гэта вельмі моцная крыніца прытоку замежнай валюты ў Беларусь.

І гэтая крыніца ў нас вельмі кволая, бо мы маем недастатковую колькасць турыстычных аб'ектаў. Вельмі многае у нас стаіць у руінах.

Беларусь адзіная краіна ў Еўропе, якая ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай мела на сваёй тэрыторыі найбольшую колькасць замкаў і палацаў, чаго не было ні ў адной краіне Еўропы. Я нават не кажу пра палацы і сядзібы дробнай шляхты. Гэта пра нешта сведчыць, на мой погляд. І калі проста спраграмаваць, што мы гэта ўсё аднаўляем і запускаем, маючы на ўвазе экспазіцыі, месцы для пражывання і харчавання, набор іншых паслуг, які ўключае магчымасць арганізацыі адпачынку для ўсёй сям'і, то прыток турыстаў будзе.

Мірскі замак рэстаўравалі 23 гады... Калі ўсё будзе рабіцца такімі ж тэмпамі, мара пра павелічэнне турыстычных плыняў застанецца толькі марай.

— Наколькі дорага адпачываць у Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі?

— У Беларусі сапраўды дорага. Калі ацэньваць па кошце атэляў, то мы абагналі па гэтым паказчыку бліжэйшых сваіх суседзяў. Грошы, якія просяць за набор паслуг, што аказваюцца ў нашых атэлях, неадпаведныя ў параўнанні з Еўропай.

— Вось якраз давайце параўнаем: колькі нумар каштуе ў Беларусі і колькі ў Еўропе?

— Я зараз буду казаць не пра зоркавыя атэлі, а пра атэлі эканомкласа, якія можна назваць турыстычнымі. Беларускі нумар каштуе ў раёне 30 долараў. А са сняданкам усе 35 долараў атрымаецца.

Напрыклад, у Вільні, Беластоку ці Варшаве такія ж самыя атэлі магчыма знайсці і за 20 долараў, а то і танней.

Але пры гэтым іх тур-клас адрозніваецца ад нашага. Нават па напаўненні нумара. Пры засяленні ў атэлі эканом-класа ў Беларусі ты, у асноўным, бачыш мэблю і сантэхніку 1970-80 гг. Напрыклад, расійскі турыст адносна спакойна ставіцца да такога напаўнення нумара, а вось для еўрапейскага гэта жудасна.

Увогуле, для Мінска як для сталіцы вельмі нестае атэляў эканом-класа, ды і зоркавых таксама.

— З чым гэта звязана, на ваш погляд?

— Проста недаразвітасць інфраструктуры. На дзяржаўным узроўні павінны зразумець, што турыста магчыма прывабіць адкрытасцю, даступнасцю, сэрвісам і паўнавартасным турыстычным прадуктам.

— Значыць гэта стварае вам, як турыстычнаму агенцтву, сур'ёзныя перашкоды для працы?

— Па вялікім рахунку, так. Таму што добра паказваць тое, што зараз адноўлена, такія аб'екты, безумоўна, ёсць, але іх катастрафічна недастаткова!

Потым пытанне наконт цаны віз. Яна занадта высокая, і ўсе ў нас пра гэта ведаюць. Замежнікі, якія прыязджаюць, вельмі здзіўлены і абураны гэтым. Чаму такія цэны для тых, хто робіць візу ў аэрапорце?

Наступная праблема — «добразычлівасць» супрацоўнікаў атэляў, аэрапортаў і іншых аб'ектаў, якія з'яўляюцца першымі, хто кантактуе з турыстамі. На жаль, трэба канстатаваць вельмі нізкі ўзровень іх прафесіяналізму і агульнай культуры, у параўнанні з той жа Еўропай.

— З вашых слоў атрымліваецца, што нават калі ў краіны будзе ідэальны імідж, то ўсё разаб'ецца на мяжы?

— Скажам так, імідж — гэта агульны малюнак. Ён складаецца з дробных рэчаў. Набор гэтага дробнага стварае нешта адзінае. І калі большасць гэтага дробнага абы-якое, то вядома, што агульны малюнак прыгожым быць не можа. Турыст вернецца дадому і скажа: «У Беларусі людзі добрыя, аднак сэрвіс — дрэнь».

— Калі б вам прапанавалі стварыць імідж Беларусі, які б вы стварылі?

— Першая праблема, на мой погляд, якая замінае стварэнню добрага іміджу за мяжой, — пытанне прэзентацыі краіны. Калі ўзяць любую еўрапейскую краіну, то кожная будзе нечым адметная, будзе асацыявацца з чымсьці. Немцы — дакладнасць, аўтамабілі, якасць; швейцарцы — сыры, гадзіннікі, шакалад і г.д.

На мой погляд, вельмі памылкова мы акцэнтуем шмат увагі на перыядзе Другой сусветнай вайны і каштоўнасцях камуністычнага часу.

У мяне два дзяды ваявалі, прайшлі ўсю вайну ад першага да апошняга дня. Бабуля была ў канцэнтрацыйным лагеры. Я ўдзячны і схіляю галаву перад тымі, хто сапраўды ваяваў, што перажыў тыя жудасныя часы, гэта была вялікая бяда і трагедыя для ўсяго беларускага народа. Але гэта бяда, а на бядзе нацыю не будуюць. Усё, што было негатыўнае і жудаснае, — гэта памяць. Трэба, каб маладое пакаленне абавязкова памятала пра гэта, каб не дапусціць нечага падобнага ў будучыні. Але нацыю будуюць на нечым узвышаным, на нечым вельмі каштоўным і вельмі шляхецкім. На нечым, што складае, скажам так, касцяк дзяржавы і нацыі. Прычым якраз ідэалагічныя дзяржаўныя інстытуты павінны дбаць пра тое, каб маладое пакаленне выхоўвалася не на бядотных расповедах пра пакуты беларусаў у розныя часы. Бо ўсё ж гэта не фундамент, на якім будуецца светапогляд нацыі і ўспрыманне нас за мяжой. Гэта памылкова.

— Што тады, на ваш погляд, можа складаць гэты касцяк нацыі?

— Патрэбна капаць глыбей. У нас ёсць з чаго пачаць. У нас шмат славутых людзей і падзей. Але чамусьці, я нават не ведаю, з якой прычыны гэты пласт не падымаецца. Бо ўсё тое каштоўнае гістарычнае, што не было намі скарыстана, вельмі паспяхова расцягалі нашы суседзі і ўжо даўно зрабілі сваім...

І ў нас дзяржава павінна зразумець, што за аснову трэба браць тое, што заўжды нам належала. Гэта абсалютна абгрунтавана можа быць ВКЛ, у нас ёсць для гэтага ўсе падставы. Маючы шыкоўную гістарычную мінуўшчыну, мы не выкарыстоўваем яе на сваю карысць. Замест гэтага ствараецца нейкі вобраз спакутаванага, змардаванага, бязвольнага народа, які паўстаў у 1919 г. Нам варта дбаць пра аднаўленне сапраўднай беларускай гісторыі, захоўваць яе і перадаваць наступным пакаленням. Бо грамадзянін, які ведае аб тым, што калісьці яго Радзіма была адной з самых магутных і развітых у Еўропе, будзе значна больш актыўны і адказны і ў прафесійным, і ў асабістым плане, і яго будуць усе паважаць!

Настасся ЗАНЬКО.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Алесь Кушнер нарадзіўся ў 1982 годзе. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры з адзнакай. Футбаліст, гуляў за юнацкую зборную Беларусі. Паспрабаваў сябе ў розных сферах, аднак знайшоў у турызме. З 2009 года з'яўляецца дырэктарам турыстычнага агенцтва «Гісторыя-Тур», якое спецыялізуецца на гістарычным і этнаграфічным турызме. Лічыць кнігу Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» сваёй настольнай, размаўляе выключна па-беларуску, не жанаты.

ТОП БАЕК ПРА БЕЛАРУСЬ

Пра Беларусь у інтэрнэце ходзяць часам неверагодныя і камічныя расповеды. Прапануем некалькі з іх.

У БЕЛАРУСІ НЯМА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ І ПРЫБІРАЛЬНЯЎ

Віцябчанка Вера Каралёва ў сацыяльнай сетцы расказала, як была перакладчыцай пры нямецкіх паляўнічых, што збіраліся ў Беларусь — «у дзікунскую краіну без электрычнасці і «ватэрклазетаў», з напоўненымі бандытамі лясамі». І па яе словах, так думала ўся суполка сяброў-паляўнічых. Пры гэтым яны спакойна вандравалі па Афрыцы, але баяліся ехаць у нашу краіну.

БЕЛАРУСЫ ЕЗДЗЯЦЬ ТОЛЬКІ НА ТРАКТАРАХ

Шмат хто з наведвальнікаў сеціва пытаецца ў беларусаў, ці насамрэч яны ўсе ездзяць на трактарах. Прычым пытаюцца пра гэта, у асноўным, людзі з-за акіяна.

БЕЛАРУСКІЯ ДЗЯЎЧАТЫ ЛЁГКАДАСТУПНЫЯ

Такое меркаванне складваецца пераважна ў выхадцаў з усходніх краін. На многіх форумах, па словах турэцкіх і іранскіх студэнтаў, можна прачытаць, што нашых дзяўчат толькі пальцам памані — і яны да ўсяго гатовыя.

БЕЛАРУСЫ НЕ ЛЮБЯЦЬ УСМІХАЦЦА

Гэтым назіраннем пасля наведвання нашай краіны дзеляцца жыхары сонечных Італіі, Іспаніі і Ірана. Ёсць меркаванне, што гэта звязана з кліматычнымі ўмовамі. Маўляў, у нас мала сонечных дзён, таму мы такія хмурыя.

Ці трэба ехаць у Егіпет?

З-за беспарадкаў у гэтай краіне адпачынак патаннеў, але нам падарожнічаць туды пакуль нельга

Егіпет — адна з самых папулярных краін для адпачынку ў міжсезонне ў тым ліку і ў беларусаў — страціла з-за сёлетніх беспарадкаў тысячы турыстаў. Міністэрства замежных спраў Беларусі пакуль не рэкамендуе нашым грамадзянам набываць пуцёўкі на адпачынак на егіпецкіх курортах. З лютага адмененыя вылеты ў Егіпет з Мінска і Масквы. І пакуль не адноўлены, нягледзячы на тое, што многія еўрапейскія краіны, такія як Вялікабрытанія, Германія, Нідэрланды, Францыя, Чэхія, Украіна з нядаўняга часу знялі абмежаванне для сваіх грамадзян для адпачынку на знакамітых пляжах Хургады і Шарм Эль Шэйха.

Нагадаем, што беспарадкі ў Каіры пачаліся 25 студзеня. Першыя два тыдні яны не закраналі курорты. 31 студзеня ў Егіпце, паводле інфармацыі дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, знаходзілася 2137 беларускіх турыстаў. Ужо 30 студзеня з'явіліся рэкамендацыі МЗС і

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 11 (390)

Веснавыя клопаты

Сакавік — самы небяспечны перыяд для пладовых дрэў. Той бок ствала, які звернуты на поўдзень, у сонечны дзень значна награваецца, а ўначы ахалоджваецца, прычым ваганні могуць даходзіць да 20 градусаў. Такія перапады паўтараюцца шмат разоў, і дрэвы атрымліваюць трэшчыны апёкі. Асабліва пакутуюць яблыні, грушы, вішні, слівы і чарэшні. Каб абараніць дрэвы, і робіцца пабелка. Гэта важная аперацыя, і таму лепш яе зрабіць 2 разы на год — вясной і ўвосень (пра пабелку мы не адзін раз пісалі). Яшчэ адзін спосаб абароны ад апёкаў — абмотка ствалоў і асноў шкілетных галін белай стужкай. Для гэтай мэты можна выкарыстаць белыя сінтэтычныя мяхі з-пад цукру. Разрэзаць на палосы, а потым абматаць вакол шпагатам. Але перад тым, як абматаць дрэвы ці пабяліць, не забудзьцеся зачысціць іх ад лушчэння кары.

Падкормка

У пачатку вясны, калі яшчэ сям-там ляжыць снег, аслабленыя зімою кай пладовыя і ягадныя расліны неабходна падкарміць азотнымі ўгнаеннямі. Для гэтага ў прыствольных кругі, а таксама ў глебу паміж раслінамі суніц садовых звычайна ўносяць карбамід. Гэты сродак раскідваюць па паверхні глебы з разліку 20 г (запалкавы карабок) на 1 кв. м.

Апрацоўка глебы

Ранняй вясной, калі сад сустракае нас сырасцю, сухой травой, голымі дрэвамі і кустамі, не спяшайцеся бракца за рыдлёўку. Вядома, страціш вясной гадзіну — летам за ўвесь дзень не навярстаеш, але можна і напсаваць. Глеба надта сырая, і, ідучы па ёй, вы ўшчыльняеце верхні слой, пазбаўляючы каранёвую сістэму раслін нармальнага паветранага рэжыму. Калі ў глебе няма паветра, то і вільгаць захоўвацца не будзе. Калі ўжо неабходна прайсці па садзе, пакладзіце старыя дошкі і перамяшчайцеся па іх. Праз некаторы час слой глебы растане, расталай вады робіцца менш і глеба пачне паспяваць. Але і тут трэба дзейнічаць асцярожна: працуйце граблямі, лёгкай матыкай, але не рыдлёўкай. А перакопваць трэба толькі тады, калі глеба канчаткова паспее, інакш потым давядзецца разбіваць камякі зямлі.

Глеба вясной можа паспець хутка. Усё залежыць ад надвор'я. Калі камок зямлі, сціснуты ў кулаку, распадаецца на часткі, тады глебу можна капаць. Але спачатку раскідайце любыя арганічныя ўгнаенні (кампост, торф, гной, які перагніў) або выкарыстайце азотныя мінеральныя ўгнаенні (карбамід, нітрафоску ці амафоску).

(Працяг тэмы ў наступным выпуску.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Тэрміны захоўвання насення

Самы час паклапаціцца пра насенне, якое трэба будзе высяваць вельмі хутка. Але ў вас засталося штосьці з запасаў мінулых гадоў. Нагадаем тэрмін захоўвання насення некаторых культур:

Капуста качанная і квацістая — 4—5 гадоў;
цыбуля — 3 гады;
агуркі, гарбузы, кабачкі — 6—8 гадоў;
пятрушка каранёвая — 2—3 гады;
памідоры, фізаліс — 4—5 гадоў;
радыска, рэдзька, рэпа — 4—5 гадоў;
салат, перац — 3—4 гады;
буракі сталовыя — 4—5 гадоў;
сельдэрэй, кроп —1—2 гады;
фасоля, гарох — 5—6 гадоў;
шпінат — 3—4 гады.

Для павышэння якасці насенне калібруюць. Для гэтага трэба апусціць яго на 3—5 хвілін у салёную ваду (1 ч. лыжка солі на 0,5 шклянкі вады). Насенне, якое апусцілася на дно, прамыць і прасушыць, а тое, што ўсплыло, выкінуць.

Захоўваць насенне агародніннных культур трэба ў папяровых пакецiках альбо ў мяшочках з тканіны ў цёмным сухім і прахалодным месцы (16—18 градусаў). Нельга трымаць насенне ў поліэтыленавых пакетах, без доступу паветра. З павелічэннем тэрміну захоўвання ўсходжасць можа зменшыцца, але ўраджайнасць павышаецца, асабліва ў агуркоў і памідораў (лепш за ўсё 2—3-гадовага захоўвання).

Пуансеція — калядная зорка

«У мяне ёсць пакаёвая кветка, у якой зімой чырванеюць лісты. У народзе яе называюць калядная зоркай. Напішыце, калі ласка, як яе даглядаць. Як яна размнажаецца?»

А. Трухан, *г. Старобін.*

«Малачай цудоўнейшы» родам з Мексікі. У прыродных умовах гэта куст да 3 м вышынёй, зацвітае зімой, калі стаяць доўгія ночы і кароткія дні. Гэтым ён прыцягнуў увагу першага пасла ЗША Дж. Р.Пуансета ў Мексіцы — урача і батаніка. Упершыню ўбачыўшы «малачай цудоўнейшы» ў 1828 годзе, ён паслаў некалькі ўзораў гэтай дзівоснай расліны ў свае аранжарэі ў горадзе Грынвілі, дзе пазней, пасля заканчэння службы, пачаў размнажаць і рассылаць у батанічныя сады свету пад назвай «пуансеція».

У краінах, якія спавядаюць хрысціянства, пуансеція стала сімвалам каляднай зоркі. Яе лісцікі на верхавінцы маюць ярка-чырвоны колер, утвараючы над зялёнымі лістамі надзвычай прыгожую кветку, якая па форме нагадвае зорку. Тую зорку, якая ўказала шлях вешчунам да месца нараджэння Ісуса Хрыста. Паступова расцвітаючы і набіраючы сілу, яна напамінае ўсім аб набліжэнні самага вялікага свята — Нараджэння Хрыстовага. Перад гэтым святам у еўрапейскіх краінах пуансецыю прыносяць у падарунак, ставяць на святочны стол.

Дзякуючы дэкаратыўнасці вялікай папулярнасцю пуансеція (малачай цудоўнейшы) карыстаецца і ў нас. Ёсць гатункі высакарослыя і нізкарослыя, з вялікімі чырвонымі, ружовымі, бардовымі, аранжавымі, крэмавымі, жоўтымі і белымі лістамі, якія ўпрыгожваюць расліну амаль 6 месяцаў. Сапраўдныя ж кветкі, жоўтыя і маленькія, размешчаны паміж імі зверху. Купляючы расліну, выберыце такую, дзе кветкі толькі пачынаюць фарміравацца, тады пуансеція будзе даўжэй цвісці і радаваць вас.

Пуансеція любіць светлыя месцы, дзе няма скразнякоў, а тэмпература паветра — 16—20 градусаў. Паліваць яе трэба па меры падсыхання глебы. У перыяд цвіцення і росту пуансеція патрабуе частага апырскання лістоў. Падкормліваць трэба поўнымі мінеральнымі ўгнаеннямі 2—3 разы ў месяц (2 г на 1 л вады). Адзін раз у 3—4 месяцы рэкамендуецца падкормка малібдэнам натрыю (75 мг на 1 л вады).

У лютым лісце пачынае вянуць. Абрэзаўшы парасткі на вышыні 10 см ад глебы, расліну трэба паставіць у цёмнае халаднаватае месца. Паліваць 1 раз у месяц, каб земляны камяк не перасох.

У пачатку мая пуасецію варта перасадзіць у тарфяную слабакіслую глебу і пачынаць паліваць. Калі пачнуць расці маладыя парасткі, трэба рэгулярна падкормліваць угнаеннем. У ліпені лішнія парасткі абрэзаць, пакінуўшы 3—4 самыя моцныя. Каб расліна зацвіла ў канцы верасня, важна вытрымаць рэжым асвятлення. Увечары з 16—17 гадзін накрывайце яе цёмным поліэтыленавым пакетам, які не прапускае святло, і здымайце яго толькі раніцай — з такім разлікам, каб расліна праводзіла ў поўнай цемры 14—16 гадзін у суткі. Рабіце так на працягу 8 тыдняў, пакуль не з'явіцца яркая афарбоўка лістоў. Затым даглядайце расліну як звычайна. На Каляды пуансеція зноў расцвіце.

Размнажаецца расліна верхавінкавымі сцяблоўымі чаранкамі. Зрэзаныя чаранкі ўкараніць у пяску ці сумесі торфу з пяском пры тэмпературы +20—24 градусы і павышанай вільготнасці паветра. Зрэзаная пуансеція не будзе доўга вянуць, калі месца зрэзу апаліць, патрымаўшы кветку над полымем.

Нябесная грамата

РЫБЫ

Урадлівы знак. Добры час для пасадкі і пасеву практычна любых раслін, асабліва сакавітых (напрыклад, бахчавых культур, фруктаў з тоўстай скуркай) а таксама агародніны і лекавых раслін.

Магчыма перасадка і чаранкаванне розных культур. Але праполка і барацьба са шкоднікамі будуць неэфектыўнымі. Нельга выкарыстоўваць хімічныя прэпараты і ўгнаенні.

Не рэкамендуецца сеяць вострапахучыя культуры, а таксама квасіць капусту і саліць агуркі.

Майце на ўвазе, што ўраджай, атрыманы ад пасадак, калі Месяц знаходзіцца ў гэтым знаку, захоўваецца не вельмі ўдала.

Як змагацца з пладовай гніллю?

Такое пытанне задаюць многія садаводы менавіта вясной і правільна робяць.

У комплекс мер барацьбы з гэтай хваробай пладовых культур уваходзяць мерапрыемствы, якія засцерагаюць сад ад паршы і пладажэркі. Адзін раз у тры гады ранняй вясной па пупышках, якія яшчэ спяць, трэба апрацаваць дрэвы і глебу пад імі 3-працэнтным нітрафенам. Успрымальныя да паршы гатункі апрацаваць перад цвіценнем, адразу ж пасля яго і яшчэ праз два тыдні 1-працэнтным растворам бардоскай вадкасці або 0,4-працэнтным полікарбацынам. Каб не было пладажэркі, з моманту з'яўлення першага чарвівага ападу трэба штодзённа яго збіраць і закопваць. Добра на штамбы накласці лоўчыя паясы са шчыльнай паперы: вусеняў, якія забраліся туды, увосень трэба знішчаць.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Для всех форм собственности. Для любых целей

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Автомобильный прицеп мод. ГКБ-817, г/н 53-97 ГС, инв. № 22-0025	1 800 000	180 000

Продавец имущества: ОАО «Гомельский радиозавод». Цена указана без НДС. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 5%. Вознаграждение – 5% от цены продажи лота оплачивает покупатель.

Срок подачи заявления	**До 17.00 25 апреля 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**26 апреля 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация»

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:
- Заявление; соглашение о правах и обязанностях сторон по установленной форме; - копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении; - юридические лица должны предоставить – копии учредительных документов, индивидуальные предприниматели – копию свидетельства индивидуального предпринимателя. *При участии в торгах представителя предоставляются: * для юридического лица – документ, подтверждающий полномочия представителя на участие в аукционе и подписание необходимых документов, паспорт представителя; * для индивидуального предпринимателя – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, нотариально заверенную доверенность.

Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012105618010 Региональная Дирекция № 700 ОАО «БПС-БАНК», БИК 153001369
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87, 77 52 78 (факс).

05 апреля 2011 г. в 12.00 состоится ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Полесьежилстрой»

Повестка дня:
1. О совершении сделок общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.

Начало регистрации участников собрания: 11.30.

УНП 200050191

НІШТО САБЕ КОШАЧКІ Ў САДКУ...

Паліцыя Румыніі забрала ў мясцовага жыхара двух дарослых ільвоў, якіх ён трымаў у сваім садзе ў якасці гадаванцаў. Аперацыя па канфіскацыі жывёл прайшла на поўдні краіны, у вобласці Валахія.

Супрацоўнікі праваахоўных органаў прыехалі да 45-гадовага Ларыяну Галкешку пасля таго, як яго суседзі паскардзіліся на гучныя гукі, якія робяць яго жывёлы (пры гэтым суседзі румына не ведалі, што ў яго жывуць ільвы). Калі да мужчыны прыехалі паліцэйскія, ён заявіў ім, што не разумее, якое правапарушэнне ён здзейсніў. Паліцэйскія растлумачылі, што для ўтрымання такіх буйных жывёл яму неабходна было атрымаць адмысловы дазвол. Мужчына ў сваю чаргу заявіў, што купіў ільвоў на кірмашы ў Бухарэсце і там яму не сказалі, што на дзікіх кошак трэба афармляць якія-небудзь дакументы. Па словах Галкешку, калі ён іх набыў, жывёлы былі яшчэ маленькімі, а калі яны падраслі, ён пасадзіў іх у клетку, каб не ставіць пад небяспеку ні сябе, ні сваіх гасцей, ні суседзяў. Ён быў надзвычай абураны візітам паліцыі і паведаміў супрацоўнікам праваахоўных органаў, што яго львы нікому не прычынілі зла. Тым не менш, жывёл у румына адабралі і адвезлі ў заапарк. Неўзабаве будзе прынята рашэнне аб далейшым лёсе ільвоў.

ДАЙЦЕ МНЕ ДАВЕДКУ, ШТО Я... ГАСПАДАР СУСВЕТУ!

Вярхоўны суд Латвіі атрымаў дзіўную заяву ад прыватнай асобы, якая падала заяўку на атрыманне статусу... Адзінага Гаспадара Сусвету. Больш за тое, гэтая персона, імя якой не называецца, выслала квітанцыю аб тым, што неабходны дзяржпадатак на суму 444 Ls выплачаны.

У сувязі з гэтым выпадкам старшыня Вярхоўнага суда Івар Бычковіч на пленуме заявіў, што неабходна пачаць працу над паляпшэннем закона аб падачы заяў, бо цяперашняя рэдакцыя закона «прымушае нас займацца Гаспадарамі Сусвету і іншымі цудамі». Праз некаторы час Вярхоўны суд адмовіў невядомаму (таксама па электронай пошце), які пажадаў юрыдычна афарміць сябе уладальнікам «усяго-усяго» на падставе таго, што разгляданне падобных заяў не ўваходзіць у яго кампетэнцыю, а заяву, дарэчы, трэба падаваць на латышскай мове (складзена яна была на рускай). У выпадку, калі заяўнік захоча вярнуць грошы, ён павінен звярнуцца ў Дзяржказну.

У галівудскім фільме «Уладары сусвету» гаспадаром сусвету хацеў стаць злодзей Шкілетар, але яму не дазволіў гэта зрабіць герой Хімэн у выкананні Дольфа Лунгрэна.

КАСАВОКІ АПОСУМ ПАЧНЕ КІНАКАР'ЕРУ

Знакаміты касавокі апосум Хайдзі з лейпцыгскага заапарка здымецца ў новых эпізодах нямецкага серыяла «Доктар Мертэнс, ветэрынар».

Калі нямецкія журналісты даведаліся аб здымках Хайдзі ў серыяле аб працы ветэрынараў, у прэсе з'явілася інфармацыя аб тым, што самка апосума стане героем серыі, дзе ёй зробяць аперацыю на вачах. Аднак неўзабаве прадстаўнікі ARD аспрэчылі гэтую чутку і паведамілі, што эпізоды з удзелам Хайдзі будуць знятыя ў заапарку Лейпцыга і жывёле нават не прыйдзецца пакідаць свой вальер. Ніякага адмысловага вобразу прадзюсары «Доктара Мертэнса» для касавокага апосума прыдумваць не сталі — па звестках выдання, Хайдзі сыграе ў серыяле саму сябе. Хайдзі дэбютавала ў шоу-бізнэсе ў лютым, калі выступіла ў ролі прадказальніцы — жывёла дала прагноз на вынікі ўручэння кінапрэміі «Оскар». У прадказанні апосум дапусціла толькі адну памылку, калі няправільна выбрала пераможцу ў намінацыі «фільм года» (Хайдзі напрарочыла перамогу карціне «127 гадзін», тады як статуэтку атрымаў «Кароль кажа!»).

НУ ШТО, ДАРАГАЯ, ПАЕХАЛІ КАТАЦЦА!

Звычайны сямейны скандал скончыўся смяротна небяспечнай гонкай у каліфарнійскім мястэчку.

Пасля бытавой сваркі раззлаваны муж вырашыў з'ехаць з дома і зняць напружанне, гаяючы па трасе. Але яго жонка так баялася за яго, што паспрабавала спыніць мужа і скокнула яму на капот. Мужчына і не думаў спыняцца — ён імчаў па шашы з хуткасцю больш за 160 кіламетраў у гадзіну. Няшчасная жанчына ўвесь гэты час спрабавала ўтрымацца на слізкай паверхні аўтамабіля, чапляючыся за люстэрка бакавога віду. Праехаўшы 65 кіламетраў, мужчына супакоіўся, злітаваўся з жонкі і спыніўся. Дзіўным чынам ніхто з іх не пацярпеў. Калі машына спынілася, жанчына не магла сама хадзіць — ад моцнага запалу, які ішоў ад рухавіка, і ашалелага ветру. Яе муж цяпер знаходзіцца за кратамі, яго вінавацяць у замаху на забойства.

НЕ ХОЧАЦЕ РАМАНТАВАЦЬ — ЗЛАМАЮ!

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Жыхар кітайскага горада Ціндао адзначыў Сусветны дзень абароны правоў спажыўца, разбіўшы суперкар Lamborghini Gallardo.

Пасля няўдалага досведу зносін з фірмовым сэрвісам тэхнічнага абслугоўвання кампаніі Lamborghini кітайскі прадпрымальнік наняў некалькі чалавек, каб тыя кавадламі разбілі нядаўна набыты люксавы аўтамабіль італьянскай маркі. Бізнэсмен набыў Lamborghini летась у кастрычніку. Неўзабаве высветлілася, што рухавік аўтамабіля няспраўны. У лістападзе аўтаўладальнік звярнуўся да афіцыйнага дылера з просьбай выправіць непаладку. Аднак у сэрвісе так і не змаглі вырашыць праблему. Больш за тое, падчас рамонту механікі пашкодзілі бампер і хадавую частку суперкара, пасля чаго адмовіліся ўзяць на сябе адказнасць. Працяглыя спрэчкі з супрацоўнікамі дылерскага цэнтра і некаторымі прадстаўнікамі кіраўніцтва кампаніі Lamborghini ні да чаго не прывялі. У знак пратэсту супраць няякаснага ўзроўню абслугоўвання і некампетэнтнасці супрацоўнікаў бізнэсмен вырашыў 15 сакавіка — у Сусветны дзень абароны правоў спажыўца — на вачах ва ўсіх знішчыць няспраўны аўтамабіль. Lamborghini Gallardo выпускаецца з 2003 года.

Сярэдні кошт новага аўтамабіля складае каля 300 тысяч долараў, а ў Кітаі ён дасягае 750 тысяч.

РОБАТЫ ПАЧНУЦЬ БЕГАЦЬ

Амерыканская Boston Dynamics атрымала заказ ад Агенцтва перадавых абаронных даследчых праектаў (DARPA), які ўваходзіць у склад міністэрства абароны ЗША, распрацаваць робата-гуманоіда Atlas («Атлант») і механічнага «гепарда» Cheetah. Кошт абодвух праектаў не ўдакладняецца.

Паводле артыкула ў Boston Herald, Atlas і Cheetah уваходзяць у частку шматмільённых кантрактаў Boston Dynamics з DARPA, разлічаных на чатыры гады. Пра саміх робатаў вядома мала. Мяркуецца, што «робат-кот» зможа развіваць хуткасць да 50 км/г, а яго прататып павінен быць выпушчаны прыкладна праз паўтара года. Atlas, у сваю чаргу, будзе здольны пранікаць у цяжкадаступныя месцы і «падключаць» рукі для хуткага руху па перасечанай мясцовасці. Акрамя ваенных мэт, гэтыя робаты могуць знайсці выкарыстанне ў сельскай гаспадарцы, пажаратушэнні і аварыйных службах. Cheetah будзе створаны на аснове робата BigDog, выпушчанага ў 2008 годзе. Гэты «робат-сабака» ўмее ўзбірацца на схіл да 35 градусаў, а таксама несці груз да 55 кілаграмаў з хуткасцю каля 8 км/г. Boston Dynamics пазіцыяную BigDog як «самага прасунутага чатырохногага робата на Зямлі».

ЗДАРОЎЕ МОЖНА ПАПРАВІЦЬ ТРЫМА МЯХАМІ ДОЛАРАЎ

Тры мяхі долараў не даляцелі цэлымі з Гвадэлупы на Анцільскія астравы. Пасажыр самалёта авіякампаніі Air Antilles, які здзяйсняў рэйс з Гвадэлупы ў Сен-Мартэн (Анцільскія астравы), заявіў у пачатку палёту, што дрэнна сябе адчувае, і правёў большую частку часу ў прыбіральні.

За гэтыя 40 хвілін ён паспеў разабраць перагародку, якая аддзяляе кабінку туалета ад багажнага аддзялення, і выкраў адтуль 238 000 долараў наяўнымі. Як адзначылі прадстаўнікі службы бяспекі авіякампаніі, у багажным аддзяленні турбавінтавога самалёта ATR-42 знаходзілася тры мяхі з грашыма — увогуле больш за 1,5 мільёна долараў. Яны былі пагружаныя туды да таго, як лайнер пакінуў аэрапорт вострава Гвадэлупа. Незадоўга да прызямлення злодзей, які ляцеў у суправаджэнні спадарожніцы, заявіў, што стан яго здароўя рэзка пагоршыўся, і запатрабаваў выклікаць да трапа самалёта «хуткую дапамогу» — з мэтай пазбегнуць такім чынам мытнага дагляду. Калі ж медыкі сустрэлі яго каля выхаду, злачынца паведаміў ім, што ўжо адчувае сябе добра, пасля чаго самастойна перасёк лётнае поле і знік у невядомым кірунку. Жанчына, якая ляцела разам з ім, была дапрошаная і абшуканая, аднак выкрадзеных грошай пры ёй не знайшлі.

ЖАДАЕЦЕ ГРУДЗІ? ВЫРАСЦІМ!

Навукоўцы апублікавалі вынік сенсацыйнага эксперымента: ім удалося выгадаваць жаночую малочную залозу, «сканструяваўшы» яе з тлушчавых і ствалавых клетак.

На этапе падрыхтоўкі з дапамогай ліпасакцыі са сцёгнаў або жывата бярэцца тлушч, аддзяляюцца тлушчавыя і ствалавыя клеткі. Прычым апошнія вырошчваюцца ў лабараторыі. Затым іх зноў змешваюць з тлушчавымі клеткамі і ўпырскваюць пацыентцы ў вобласць малочнай залозы. А на месца выдаленых грудзей усталёўваецца пластыкавы каркас. Менавіта на яго на працягу 6—12 месяцаў нарастае новая тканка, якая ўтвараецца з сумесі клетак, прасцей кажучы, накшталт таго, як вінаградныя лозы аплятаюць садовую альтанку. І калі тканкі «новавырашчаных» грудзей сфарміруюцца, каркас прымаецца. Такія грудзі, як запэўніваюць навукоўцы, выглядаюць цалкам натуральна, а навобмацак мяккія і зручнейшыя за сіліконавыя імпланты. Хірург лонданскага шпіталя Святога Георга прафесар Кефа Мокбель ужо праверыў клеткавую тэхналогію на некалькіх пацыентах. Варта прыняць да ўвагі выгаду тэхналогіі, бо яна дазваляе аднавіць як усе грудзі цалкам, так і асобную іх частку. Галоўнай задачай спецыялісты ставілі дапамогу жанчынам, якім выдалілі грудзі з-за ракавай пухліны. Зрэшты, метад вырошчвання грудзей будзе мець поспех і ў пластычнай хірургіі і, магчыма, у хуткім часе прыйдзе на змену недаўгавечным салевым або сіліконавым імплантам. Цяпер навукоўцы збіраюцца яшчэ праверыць тэхналогію на бяспеку і будучыні наступствы для здароўя жанчын, бо пытанне аб уплыве ствалавых клетак на рызыку развіцця рака застаецца па-ранейшаму адкрытым.

АДСЫПЦЕ ЛЕКАЎ... ЖМЕНЬКУ

Незвычайныя ўласцівасці звычайных семак былі выяўленыя падчас клінічных выпрабаванняў, якія правялі амерыканскія спецыялісты з універсітэта Ілінойса.

Вынікі эксперыменту сведчаць, што семкі стрымліваюць рост пухлін малочных залозаў, яечнікаў, кішэчніку, скуры і лёгкіх. Праўда, усё гэта — у курак, на якіх навукоўцы праводзілі гэты дослед: праз год, на працягу якога птушкам у рацыён дадавалі семкі, колькасць пухлін у птушак нават на апошняй стадыі і агульны ўзровень распаўсюджвання рака яечнікаў істотна скараціліся. Акрамя гэтага, пасля прыёму семак яны істотна набралі ў вазе, дасягаючы здаровых паказчыкаў. У найбліжэйшай будучыні, калі вынікі даследавання будуць пацверджаныя ў выпрабаваннях на людзях, семкі змогуць ужываць у якасці дапаможнага сродку лячэння раку.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, пыласос, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 красавіка 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20 красавіка 2011 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 чэрвеня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 31 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.03.11 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 01.03.11 па 30.06.11.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1859 ад 25.02.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 1-е паўг. 2011 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ _____
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месяца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання) _____

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў _____

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ _____
(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Цырк запрашае

«ПА 10-БАЛЬНАЙ ШКАЛЕ МІНСКАМУ ЦЫРКУ МЫ ДАЁМ 11 БАЛАЎ...»

Новы сезон (сакавік-красавік) стартаваў у Беларускім дзяржаўным цырку. Праграма атрымала назву «Зоркі міжнародных цыркаў» і сабрала разам артыстаў самых разнастайных жанраў. На арэне выступаюць дрэсіроўшчыкі жывёл і птушак, а таксама канатаходцы і акрабаты, якія працуюць у жанры «паветраныя рамяні».

Фота Прэс-службы цырка.

Канатаходцы з Францыі Аўра і Вернер Гуэра са сваім знакамітым нумарам. На здымку Аўра стаіць на плячах мужа, але праз хвіліну яны памяняюцца месцамі. Самы напружаны момант наступае тады, калі на канаце стаіць Аўра, а ёй на плечы становіцца 75-кілаграмовы Вернер... У гэты момант жанчына пачынае спяваць.

— Усе артысты, якія выступяць у новым сезоне — вельмі папулярныя ў свеце цырку, — адзначае **дырэктар-мастацкі кіраўнік «Белдзяржцырка» Таццяна БАНДАРЧУК.** — Амаль усе з іх упершыню ў Беларусі, прычым практычна ніхто з іх раней не працаваў з краінамі СНД. Калі кіраўніцтва маскоўскіх цыркаў даведалася, што такія зоркі прыехалі да нас у Беларусь, нават не адразу паверылі. Многія з нашых гледачоў прыходзяць на новую праграму па два разы — праграма вельмі моцная, шмат жанраў, шмат рызыкі, шмат эмоцый.

— Ваш цырк створаны для артыстаў, — прызнаецца **дрэсіроўшчык папугаяў з Украіны Уладзімір ГАРАДЗЕЦКІ.** — Я шмат дзе працаваў, але такога не бачыў. Мы сюды ехалі, а ў нас пыталі, якім павінен быць тэмпературны рэжым і вільготнасць паветра. Мяне нідзе пра гэта яшчэ не пыталі! Тут для птушак створаныя такія ўмовы! Толькі працуй.

— Я не чакаў убачыць у Беларусі такі вялікі стацыянарны цырк — і такі прыгожы, — дадае **румынскі дрэсіроўшчык жывёл Штэфан ПЛЕШАЯНУ.** — Тут вельмі чулы калектыў — і гэта адзначаю не толькі я, але ўсе артысты, якія тут выступалі.

А Валерый Сычоў, які пад купалам мінскага цырка выступае са сваёй жонкай Мальвінай Абакаравай у жанры «паветраныя рамяні», і ўвогуле прызнаўся, што не супраць пераехаць у Мінск.

— Горад мне вельмі імпануе, нягледзячы на тое, што ў Беларусі я ўпершыню. Таму думка пра пераезд сур'ёзная.

Валерый Сычоў і Мальвіна Абакарава зусім нядаўна выйгралі золата на сусветным цыркавым фестывалі ў Іжэўску, дзе яны атрымалі кантракт і запрашэнне на славуты цыркавы фестываль у Монтэ-Карла. Таму выступленне гэтай пары ў мінскім цырку, паводле слоў Таццяны Бандарчук, — вялікая ўдача.

Аўра Гуэра — жанчына-легенда

Але галоўнай разынкай новай праграмы стаў нумар французскіх канатаходцаў. Тое, што робяць француженка Аўра і яе муж Вернер Гуэра, не ўдалося паўтарыць яшчэ нікому ў свеце. Аўра і Вернер, працуючы без страхоўкі на вышыні 11 метраў, па чарзе трымаюць на плячах адзін аднаго. Самы напружаны момант наступае тады, калі Аўра стаіць на канаце, а ёй на плечы становіцца 75-кілаграмовы Вернер... У гэты момант жанчына пачынае спяваць.

— Такі прыём не выконвае больш ніхто з жанчын, — расказвае «Звяздзе» Аўра. — Спачатку з ім выступала старэйшая сястра майго мужа, пасля другая сястра, а пасля і я. У майго мужа быў шыкоўны нумар і мы вельмі доўга рэпетыравалі, пакуль я не навучылася трымаць яго на сваіх плячах. Мой тата вучыў: калі ты штосьці робіш у цырку, то ты павінен быць лепшым. І я рабіла ўсё, каб стаць лепшай. Так і нарадзіўся гэты трук. Тое ж і са спевамі: ніхто ў свеце больш не ходзіць па канаце ў 11 метрах над зямлёй і адначасова спявае...

Прызнацца, гледзячы на Аўру, прывабную жанчыну сярэдніх гадоў, ніколі не скажаш, што яна здольная на такое.

— Я ніколі не падпусціла б сваю дачку да каната, — працягвае жанчына. — У мяне і майго мужа ўся сям'я — у цырку. Таму я ведаю, што гэта такое. У свой час да каната мне забараніла падыходзіць мая мама, якая таксама была канатаходцам, але аднойчы сарвалася і трапіла ў бальніцу ў коме. Я выйшла замуж і змяніла рашэнне. Але мама і сёння кажа мне тое самае: калі ты ўжо спынішся? Нашай дачцэ 21 год, і яна з цыркам, дзякаваць Богу, не звязаная. Яна — оперная спявачка, працуе ў ЗША. І на канат я яе ніколі не пушчу.

Сямейны дуэт Аўры і Вернера заваяваў ужо тры залатыя медалі на фестывалі ў Монтэ-Карла (гэты фестываль, як сцвярджаюць знаўцы, у свеце цырка параўнальны з Алімпійскімі гульнямі).

— Нам вельмі падабаецца тут, у Мінску, — дадаюць Аўра і Вернер. — Людзі, прырода, сам будынак цырка, мы рады, што прыехалі. У нас было шмат прапаноў прыехаць у Расію, але мы адказвалі, што, магчыма, пазней. Працавалі ў шматлікіх цырках — Сінгапур, Ганконг, Філіпіны... Калі прыехалі ў Беларусь, зразумелі, наш прыезд сюды — самае правільнае рашэнне, якое мы прымалі за апошнія некалькі гадоў. Па 10-бальнай шкале беларускаму цырку мы даём 11 балаў!

Ілья ЛАПАТО.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Пунтус. Рубінчык. Амплуа. Крэда. Зебра. Фут. Зерне. Алея. Гурэнка. Рэй. Нанка. Марш. Замак. Ура. Бухта. Абёс. Тук. Кан. Козыр. Чумак. Кок. Такт. Сабака. Цукар. Баба. Арам. Фрэнч. Баруўскі. **Па вертыкалі:** Штангра. Гаюндэнка. Зорка. Мускат. Бенгал. Кус. Рчо. Таўм. Аркыка. Вепр. Сурок. Кар. Экран. Баабаб. Балай. Рама. Афера. Ака. Стаж. Кайн. Казан. Трубач. Ручар. Шлак. Карунні.

27 сакавіка юбілей у ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, нязменнага дырэктара сярэдняй школы ў в. Сярагі, цяпер пенсіянера **Аляксея Андрэевіча Новіка,** дарэчы, падпісчыка «Звязды» з 1944 г. Яму споўнялася 90 гадоў. Усе цяжкасці і нягоды гераічнай партызанскай вайны, пасляваеннага ліхалецця, напружанай настаўніцкай дзейнасці не адбіліся на характары гэтага дастойнага, усімі паважанага чалавека. Ён па-ранейшаму добры, справядлівы і мудры. Выхаваў траіх цудоўных дзяцей, а цяпер ужо чатырох унукаў і чатырох праўнукаў. Аляксей Андрэевіч з'яўляецца прыкладам не толькі для нас, любячых яго шматлікіх сваякоў, але і для аднавяскоўцаў, сярод якіх амаль кожны трэці быў калісьці выпускніком яго школы. Віншуем Вас, Аляксей Андрэевіч, і жадаем здароўя, не здавацца гадам і радаваць нас сваім добрасардэчным стаўленнем і прыродным розумам і гумарам. Мы ганарымся Вамі заўсёды.

Брат Міхась.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.58	18.33	12.35
Віцебск —	5.48	18.23	12.35
Магілёў —	5.49	18.23	12.34
Гомель —	5.46	18.19	12.33
Гродна —	6.14	18.48	12.34
Брэст —	6.15	18.48	12.33

Месяц

Апошняя квадра ў 14.08.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Хрысціны, Аляксандра, Нікіфара.*

К. *Ларысы, Маргарыты, Тодара, Фелікса, Цімафея, Эмануіла.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

26 сакавіка

1801 год — нарадзіўся Канут Іванавіч Русецкі, беларускі мастак, педагог. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, у Акадэміі мастацтваў у Парыжы і Рыме. Прадстаўнік класіцызму. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. Пісаў партрэты, пейзажы. Сярод вядомых карцін «Італьянец, які ўсміхаецца», «Жняя», «Вербная нядзеля», «Клятва карбанарыяў», «Уцёкі ў Егіпет» і інш., аўтар серыі пейзажаў Белавежскай пушчы, ваколіц Навагрудка. Памёр у 1860 годзе.

1989 год — у СССР прайшлі першыя альтэрнатыўныя выбары народных дэпутатаў.

Цытата дня:

«Даруй тым, хто гаворыць пра цябе дрэнна, але не тым, хто паведамляе табе аб гэтым.»

Яніна Іпахорская (1914—1981), польская мастачка і пісьменніца.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

Нядзеля, 27 сакавіка

Эфектыўнасць сённяшніх намаганняў шмат у чым будзе вызначацца тым, наколькі атрымаецца разлічыць свае сілы і магчымасці і ўдала знайсці ім месца прыкладання, каб, з аднаго боку, выкарыстаць увесь зарад, а з другога — не перагнуць палку і не ўвязнуць у эмацыйных праблемах і канфліктах. Шукаць кантакт і прадуктыўна ўзаемадзейнічаць з навакольнымі будзе больш складана, чым звычайна.

Панядзелак, 28 сакавіка

Разлічваць на свята мэтанакіраванасці, відавочна, не прыйдзецца. Прынамсі, пры спробе знайсці пункт апоры і перавярнуць мір чэрпаць сілы і баявы настрой давядзецца з нейкіх унутраных крыніц, прычым чарпак патрэбен даволі вялікі.

Аўторак, 29 сакавіка

Сёння лепш адсунуць пытанні, якія патрабуюць ўмення знаходзіць агульную мову з навакольнымі, а таксама не ўзвальваць на сябе больш, чым зможаце панесці. Гнуткасць з выкрутлівасцю лішнімі сёння не будуць — горы лепш абыходзіць. Настойліва рэкамендуецца не захапляцца няходжанымі сцежкамі і падбадзёрлівымі напоямі.

Серада, 30 сакавіка

Дзень прынясе павышанае напружанне і схільнасць да сутыкненняў з навакольнымі. Мабыць, не лепшы час для таго, каб бліснуць энергічнасцю. Прынамсі, выбіраючы актыўную лінію паводзін, лепш запасціся цярпеннем, а таксама не класці свае настойлівасць з мэтанакіраванасцю на алтар прывівання каму-небудзь уласнага меркавання — усё гэта можа даць адмоўны маральны і матэрыяльны вынік.

Чацвер, 31 сакавіка

Дзень дазволіць засяродзіцца на планамерным руху да вызначаных мэтаў. Сёння не той выпадак, калі можна бліснуць фантазіяй або вынаходлівасцю, з іншага боку, парывам і кропкаваму настрою на вялікія справы часта не хапае арганізаванасці і ўмення давесці пачатае да лагічнага завяршэння.

Пятніца, 1 красавіка

Адчувальных здзяйсненняў наўрад ці трэба чакаць. Не лепшы час як для пошуку падтрымкі старэйшых (па ўзросце, становішчы, фінансавых магчымасцях і г.д.) таварышаў, так і проста плённага ўзаемадзеяння з навакольнымі. Мабыць, ёсць сэнс засяродзіцца на сваіх асабістых планах, як працоўных, так і ўсіх астатніх, не спрабуючы «выканаць пяцігодку за два гады».

Субота, 2 красавіка

Ніякіх бачных перашкод і поўнае паразуменне. Пры гэтым добрыя перадумовы для грашовых здзяйсненняў і выгодных дамоўленасцяў толькі дапамогуць атрымліваць задавальненне ад стасункаў з навакольнымі па-за рамкамі нейкіх дзелавых праектаў і тэмаў.

ЛЫЖКА

Паводле ўсходнеславянскіх традыцый, лыжка была не проста прадметам хатняга ўжытку, яна ўвасабляла сабой пэўнага члена сям'і, бо кожны з іх меў сваю лыжку. У народзе існавала строгае правіла, якое патрабавалася выконваць няўхільна: карыстацца чужой лыжкай катэгарычна забаранялася. Для гэтага лыжкі пазначалі спецыяльнымі знакамі, а таксама адрознівалі па памерах: у гаспадара хаты была самая вялікая, вельмі маленькія лыжкі лічылі амулетамі, якія з'яўляліся знакам сытасці, дабрабыту і дастатку.

Нярэдка лыжкі выкарыстоўвалі ў каляндарных і сямейна-родавых абрадах, у варожбах і народнай медыцыне. Так, лічылася, што пасля смерці гаспадара хаты яго лыжка набывала цудадзейную сілу. Яе выкарыстоўвалі, каб вывесці бародаўкі, яна дапамагала пры нарывах.

- забаранялася змешваць ці накладваць ежу лыжкай кагосьці з дамачадцаў, асабліва мужа ці гаспадара; лічылася, што ў адваротным выпадку мужчыны будуць «лезці» ў жаночыя справы, і гэта абавязкова прывядзе да сварак;
- імкнуліся, каб на стале не было лішніх лыжак, інакш гэта лыжка неўзабаве «застанецца» без свайго гаспадара; «некранутай» была лыжка толькі за памінальным сталом — тая, якой еў памерлы;
- забаранялася біць лыжкай па стале — суседзі пачнуць абгаворваць; а на Украіне лічылі: стукаць лыжкай па талерцы — прыцягваць у хату «злыдняў»;
- лыжкі, як і іншы посуд, пасля ежы мылі і раскладвалі па сваіх месцах; і толькі ў адным выпадку посуд пакідалі на стале на ўсю ноч — пасля памінак, каб душы памерлых сваякоў — «дзядоў» — прыляцелі і таксама прынялі ўдзел у памінальным застоллі;
- лічылася, што можна наклікаць на сям'ю беды і хваробы, калі пазычаць лыжкі ў суседзяў, таму, калі падчас вяселля або памінак пазычалі посуд, лыжкі вярталі з асаблівай увагай.
- каб муж і жонка былі дружнымі, на вяселлі перад маладымі клалі толькі адну лыжку і прасілі маладых есці толькі ёю;
- для гэтай мэты маглі выкарыстоўваць і дзве новыя лыжкі, якія пасля вяселля звязвалі чырвоным поясам і прыгаворвалі: «Як гэтыя лыжкі злучаны дужа-моцна, так бы і маладыя адно з адным злучаны былі».
- прыкмячалі: калі са стала падчас ежы звалілася лыжка, чакай у госці жанчыну, нож — мужчыну.

Парада з «куфра» знахароў: калі жонка ці муж шукаюць сувязі «на баку», трэба распаліць на агні дачырвана лыжку, потым кінуць яе ў халодную ваду са словамі: «Як лыжцы ў хаце месца, так і табе, рабыні (рабу) (імя) у хаце месца. Амін». Лыжку даць для ежы таму, каго «выпраўлялі».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАДКАЗКІ ДАСВЕДЧАНЫХ

Натуральны камень

(Працяг тэмы. Пачатак у нумары за 19 сакавіка.)

Натуральны, ці яго яшчэ называюць прыродны, камень — безумоўна, самы старажытны будаўнічы матэрыял. Ён быў не толькі самым даступным, але валодаў унікальнымі спажывецкімі ўласцівасцямі. Выкарыстоўваецца камень і сёння. Як у будаўніцтве, так і ў аблiцоўцы прымяняюць розныя пароды натуральнага каменю. Гэта і шунгіт, і пясчанік, і вапняк з яго разнавіднасцямі, і даламіт, і галька, і нават каменная крошка, якая ўтвараецца пры апрацоўцы каменю.

Да асноўных уласцівасцяў і пераваг прыроднага каменю і вырабаў з яго (плітка, брусчатка, блокі і інш.) адносяцца трываласць, даўгавечнасць, натуральны колер і іншыя якасці, праверэныя тысячагоддзямі.

Калі раней прыродны камень выкарыстоўвалі выключна як будаўнічы матэрыял, то ў нашы часы ён усё больш прымяняецца як дэкаратыўны. Пясчанік, вапняк, даламіт шырока выкарыстоўваюцца ў ландшафтным дызайне, для абсталявання падпорных сценак, клумбаў, бардзюраў, спускаў, прыступак і г.д.

Штучны камень

Адзін з нешматлікіх матэрыялаў, які не ставіць перад дызайнерамі і будучымі гаспадарамі ніякіх абмежаванняў у яго выкарыстанні. З яго дапамогай можна стварыць практычна бясшвовыя паверхні, што дае магчымасць рабіць вялікія па памерах вырабы.

Штучны камень мае шырокую колеравую гаму. Гэта істотна пашырае магчымасці арыгінальных колеравых рашэнняў, а адрозніць штучны камень ад сапраўднага вельмі складана, затое даўгавечнасць і трываласць натуральнага і штучнага каменю цалкам супастаўныя.

Аблiцовачная плітка са штучнага каменю на працягу дзесяцігоддзяў з поспехам выкарыстоўваецца ва ўсім свеце для аблiцоўвання фасадаў, лесвічных клетак, цокальных паверхаў, унутраных памяшканняў і камінаў.

Штучны камень, па сутнасці, — аналаг натуральнага, але са значна большым асартыментным радам. Вылучаецца некалькі асноўных пераваг штучнага каменю як матэрыялу, прыдатнага для вонкавага аздаблення і дызайну інтэр'еру:

- невялікая вага (у параўнанні з натуральным);
- разнастайнасць колераў і фактур (абмяжоўваецца толькі фантазіяй архітэктараў, вытворцаў);
- магчымасць вырабу элементаў рознай формы (вуглавыя, паўкруглыя, бардзюры);
- магчымасць надаваць каменю форму ліста, панэлі;
- паверхня штучнага каменю нярэдка бывае цёплай, у адрозненне ад прыроднага (гэта ўласцівасць важная пры выкарыстанні яго ў інтэр'ерах);
- адсутнічае павялічаны радыёактыўны фон (уласцівы натуральнаму граніту і чырвонай кераміцы);
- канкурэнтная цана;
- працяглы тэрмін эксплуатацыі;
- экалагічная і гігіенічная бяспека:
- пажарабяспека.

-2736-

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Дадайце экзотыкі

Папоўніць вітамінны запас, умацаваць імунітэт, павысіць агульны жыццёвы тонус дапамогуць «іншаземцы». Многія экзатычныя плады, карысныя і даступныя па цане (дзякуючы чаму яны сталі для нас амаль роднымі), не толькі аказваюць станоўчы ўплыў на здароўе, але яшчэ дадаюць разнастайнасці ў штодзённы рацыён.

АНАНАС. Фермент брамелайн, які змяшчаецца ў ананасе, садзейнічае актыўнаму расшчапленню тлушчаў і стымулюе страваванне, таму ананас асабліва рэкамендуецца ў якасці дэсерту пасля шчодрай бяседы. І ўсё гэта ў спалучэнні з цудоўным смакам і каларыйнасцю ўсяго ў 48 ккал!

АВАКАДА. Вялікая колькасць вітамінаў групы В робіць гэты плод выдатнай дапамогай у барацьбе за прыгажосць скуры, валасоў і пазногцяў. Авакада змяшчае і алеінавую кіслату, якая садзейнічае паніжэнню халестэрыну. Варта таксама адзначыць, што гэты плод лічыцца моцным афрадызіякам.

БАНАНЫ. У першую чаргу — гэта выдатны фаст-фуд у натуральнай абалонцы: бананы добра засвойваюцца і хутка суцішаюць голад. Таксама ў бананах змяшчаецца рэчыва, блізкае да так званага гармону шчасця — сератаніну, таму яны выклікаюць прыліў сіл і дапамагаюць папярэдзіць дэпрэсію.

КІВІ. Усяго адзін плод забяспечыць вам сутачную патрэбнасць у вітаміне С, абароніць тым самым ад вірусаў у перыяд сезонных захворванняў. Ківі багатыя на магній, неабходны для работы сэрца, а вялікая колькасць клятчаткі садзейнічае ачышчэнню арганізма ад шкодных рэчываў.

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

Ці трэба перасаджваць кветкі

Даведацца, ці трэба перасаджваць пакаёвыя расліны вясной, лёгка.

- Агледзьце дно вазона. Калі з дрэнажных адтулін тырчаць карані, кветцы цесна.
- Прынюхайцеся да глебы. Калі яна мае нават слабы непрыемны пах, перасадка неабходная.
- Успомніце, калі вы апошні раз перасаджвалі гэтую расліну. Калі даўно — глеба спустошылася і мае патрэбу ў замене.
- Калі ў мінулым сезоне кветка моцна разраслася, лепш яе перасадзіць.
- Маладая расліна адчувае патрэбу ў перасадцы, але не кожны год: калі ваша кветка ў поўным парадку, перасаджвайце яе раз у 2-3 гады.
- Здараецца, што да пачатку вясны на глебе ўтвараецца шчыльны белы налёт. Гэта кальцый. Верхні пласт субстрату трэба замяніць і паліць зямлю руковым растворам марганцоўкі.

Асаблівасці перасадкі

- Калі з каранёў абтрэсці старую зямлю цалкам не ўдаецца, апусціце расліну ў ваду, каб зямля распусцілася.
- Не рабіце рэзкіх рухаў — у многіх раслін настолькі далікатныя карані, што ламаюцца нават ад лёгкага дотыку.
- Ні ў якім разе не трымайце расліну, якую перасаджваеце, доўга на паветры — падсохнуць маленькія каранёвыя валаскі.
- Адразу пасля перасадкі кветку трэба шчодра паліць, паставіць у цёмнае, абароненае ад скразнякоў месца і праз гадзіну зноў паліць.
- Памятайце, што любая расліна пасля перасадкі так ці інакш доўга ці непрацяглы час хварэе. Гэта не павінна выклікаць трывогу і неабдуманых дзеянняў.

-2737-

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ АБО 1 ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Беларусь. Чарнобылю

Местное самоуправление | Своя справа | Жыр+андоля | Чырвоная змена | Купі лепшае! Тавары Паслугі Цэны | Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	12 400 рублёў на месяц 74 400 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	11 600 рублёў на месяц 69 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	19 900 рублёў на месяц 119 400 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	18 000 рублёў на месяц 108 000 рублёў на паўгоддзе

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	9 700—11 180 рублёў на месяц 58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8 940—10 430 рублёў на месяц 53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13 134—14 080 рублёў на месяц 78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12 230—13 170 рублёў на месяц 73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе

* Залежыць ад рэгіёна

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвона змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1428. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12